# Алесь Наварыч – Памалюся Перуну, пакланюся Вялесу...

*Аповесць*

**1**

Настаўнік гісторыі Савіцкі зачытаў гадавыя адзнакі, павіншаваў дзяцей з заканчэннем восьмага класа і паглядзеў на гадзіннік ─ да канца ўрока заставалася колькі часу. Ён глянуў на клас і з хітраватай усмешкай прамовіў:

– Ну, а цяпер расказаць сапраўдную гісторыю?!

– Раскажыце, раскажыце! – наперабой сталі прасіць дзеці і вочы ў іх загарэліся жывой цікаўнасцю.

Настаўнік уздыхнуў, падняўся з-за стала, нахмурыўся, абхапіў рукамі галаву і прайшоўся раз-другі паўз класную дошку. Дзеці сцішыліся.

Настаўніка Савіцкага ў школе любілі ўсе класы. Ён мог бясконца распавядаць не толькі пра гістарычныя падзеі, але і ўвогуле цікава расказваць пра жыццё. Акрамя таго быў добры выдумшчык, гэта значыць упрыгожваў, як мог аздабляў свае расповеды. Як і ўсе гісторыкі меў багатую фантазію. Амаль на кожным уроку пасля выкладання праграмнага матэрыялу, звычайна пад канец заняткаў, частаваў навучэнцаў чарговай порцыяй сваёй прыдумкі. Бальшыня вучняў любілі гэтыя настаўніцкія шчыраванні, але былі і такія дзеці, што іранічна ставіліся да баек дарослага чалавека і называлі настаўніка Савіцкага няйначай, як Троцкі.

Цяпер, на апошнім у навучальным годзе ўроку Савіцкі павінен быў прыдумаць нешта асабліва цікавае, таму вучні і сцішыліся, каб даць выкладчыку гісторыі сабрацца з думкамі, з фантазіяй.

– Слухайце, – пачаў урэшце Савіцкі, пацёршы вузкія тонкія рукі, што таксама выдавала ў ім вялікага гаваруна, – мо пяцьсот год назад, мо тысячу, уявіце сабе – нават ажно можа тысячу! – па дарозе са стольнага горада Кіева ў наш край, дзе цякуць рэкі Гарынь і Ясельда, Ствіга і Льва, з сакрэтным пасланнем ад настаяцеля аднаго з кіеўскіх манастыроў быў выпраўлены манах. Ішоў ён сюды, недзе ў тутэйшы манастыр, які размяшчаўся тут, на нашай зямлі. Мо нават гэта быў не манастыр, але гэткі скіт, гэта значыць – паселішча, выселкі, дзе жылі адсельнікі, ну, на той час – місіянеры, бо насельніцтва толькі часткова было хрысціянскім. Важнае паведамленне, якое мусіў той манах перадаць, было напісана на пергаміне, скручана ў трубачку і схавана ў посаху – устаўлена ў пустое дзяржальна і заліта смалой. Гэта каб па дарозе манаха не абрабавалі і ніяк не даведаліся аб сакрэтным пасланні аднаго настаяцеля другому...

Па калідоры ўжо хадзілі адпушчаныя з ўрока вучні, але гісторыя, было відаць па натхнёным твары настаўніка, абяцала быць проста неверагоднай, таму вучні слухалі ўважліва, а некаторыя сядзелі, як зачараваныя.

– І вось гэты манах ішоў markрознымі дарогамі, ішоў адзін, каб ніхто больш не ведаў пра пасланне, пра тое, што ён увогуле некуды ідзе. Яму належала выканаць загад свайго кіраўніка, і ён адважна перабіраўся праз рэкі, прадзіраўся праз няходжаныя пушчы і балоты, начаваў адзін у лесе, адпуджваў агнём дзікіх звяроў, словам, змагаўся з прыродай. А ведаеце, якая тады яна была, наша прырода?

– Якая? – перапыталі дзеці.

– У час нерасту па галовах чарнаморскіх асятроў можна было рэчку перайсці.

Нейкая дзяўчынка хмыкнула. Настаўнік не павёў і вухам.

– Словам, лес – не прабіцца. Ну, няважна... І вось аднойчы з захаду з'явілася чорная хмара. Чорная і вялікая. Абяцалася навальніца. Яна неўзабаве і накацілі. Манах бачыў, што наперадзе, там, куды яму трэба было ісці, бушуе сапраўдная бура, цурбоніць моцны дождж, б'юць маланкі і грыміць так, што яму зрабілася страшна. Гэта мы цяпер разумеем, што чаго палохацца навальніцы?.. А тады, на тыя часы, людзі моцна баяліся бога грому – Перуна.

– А ён жа быў манахам, хрысціянінам, – перабіла настаўніка адная дзяўчына, беленькая, крыху вушатая, з плямамі румянцу на шчоках. – Чаго яму баяцца паганскага бога?

Настаўнік знакам рукі даў зразумець дзяўчыне, што ён звярнуў на яе словы ўвагу, толькі, маўляў, выслухай да канца, у рэшце рэшт гэтая няўвязка ўсё роўна састыкуецца.

Што вам сказаць? Спужаўся манах. Кінуўся на коленцы маліцца, стаў біць галавой аб зямлю, уздымаць вочы ўгару, адрасуючы свае просьбы аб ратаванні Усявышняму. І вось так, паглядваючы ўгару, убачыў, што вялікае дрэва, якое было недалёка ад таго месца, дзе ён стаяў на беразе ракі, мае пасярэдзіне чорную дзірку.

«Дупло! – скеміў манах. – Ды вялікае. А ці не паспрабаваць мне туды схавацца?!» – Падумаў так, ды так і зрабіў. Добра, што галіны дуба, а гэта быў менавіта дуб, раслі нізка і да дупла можна было дабрацца без асаблівых цяжкасцей. Залез манах у дупло, сядзіць у тым дупле, суха там, цёпла, а дождж наляцеў, бура разыгралася, паліло як з цэбра, маланкі зашугалі ад аднаго краю неба да другога...

Настаўнік зрабіў паўзу, перавёў дыханне, агледзеў вучняў і з неадменнай хітрынкай у вачах спытаўся:

– І што, вы думаеце, было далей?

– Не ведаем! – хорам адказалі вучні, быццам загіпнатызаваныя расповедам настаўніка.

– А далей было вось што: нечакана ў той дуб са страшэнным грукатам ударыла маланка. Такая моцная,

што раскалола магутнае дрэва ад вершаліны да нізу, да самага камля...
Рэзка і пранізліва празвінеў званок, вучні ўздрыгнулі ад нечаканасці, але не кінуліся з класа, наадварот, ураджаныя расказаным, чакалі, што будзе далей.
– Можа, ідзіце? – з усмешкай прапанаваў настаўнік, упэўнены, што ніхто і з месца не кранецца.
– Не, што, што далей было?! – закрычалі ад нецярпення вучні.
– А тое і было, што гэты велізарны абломак дуба, лічы, увесь дуб разам з дуплом і разам з манахам, які сядзеў у тым дупле, абрынуліся з абрыва ў раку. І зніклі пад каламутнай вадой.
Настаўнік на момант замоўк.
– І што, утапіўся манах? – спыталася беленькая дзяўчына, якая і гмыкала, і перабівала настаўніка пытаннем пра хрысціянства манаха. Яна спакавала рэчы ў партфель і сабралася ісці – урок жа скончыўся.
– Не, дзеці, не ўтапіўся. Здарылася так, што манаха ўдарыла маланка, і ён, атрымаўшы ўдар электрычным токам, імгненна заснуў. Упаў у летаргію, не памёр, але мозг ягоны, ды і ўвесь арганізм адключыўся. І праляжаў наш манах у тым дупле цэлую доўгую мо тысячу гадоў...
Дзяўчына, якая хацела ўжо ісці, яе звалі Лена, яна была выдатніца, мела практычны розум, а таму выдумкам настаўніка не надта верыла, падміргнула суседу па парце, Пецю Камару. «Во залівае!» – азначала гэтае падміргванне. Пятрук падміргнуў дзяўчыне ў адказ, шкадуючы, што сэнс пераміргвання іншы, чым бывае. Пятрук быў закаханы і шмат што даў бы, каб Лена падміргвала яму не дзеля развянчання выдумляльшчыцкага таленту настаўніка.
– ...Прайшлі стагоддзі, дрэва на дне ракі як бы скамянела, дуб зрабіўся мораным. Яго то паднімала паводкамі, то прыбівала да берага. За сотні гадоў дуб занесла глінай, глеем, і ён апынуўся як бы ўтрамбаваным у дно ракі пры беразе. А манах там, у дупле, скурчаны, ляжаў у своеасаблівым летаргічным сне. Ён не жыў, бо не дыхаў, але быў нібыта закансерваваны. І вось прайшлі сотні гадоў, амаль тысячу, а можа і болей, чым тысячу, і, як вы цяпер ведаеце, меліяратары перасушылі наша Палессе, узровень вады ў рэках панізіўся, і вада вымыла гэты мораны дуб з жывым, але ў летаргічным сне манахам. І ў адзін цудоўны дзень, калі сонейка прыгрэла дуб, камякі глею адваліліся ад дупла, паветра пайшло ў сярэдзіну і...
– І манах ажыў, – працягнула Лена думку настаўніка. – Ажыў, вылез з дупла і пайшоў гуляць сабе па нашай вуліцы.
– Правільна! – завяршыў Леніну думку крыху збянтэжаны настаўнік. – Я, між іншым, нікога не трымаю, хто не хоча даслухаць гісторыю да канца, можа ісці. З усяго класа выйшлі толькі Лена і ейны ўхажор – Пеця Камар. Настаўнік дачакаўся, калі яны шчыльна прыкрыюць за сабой дзверы, набраў паветра ў грудзі, секунду разважаў, каб расказваць далей, але здарыўся цуд. У момант замінкі, калі настаўнік думаў, адзін з вучняў глянуў у акно. Тое, што ён там убачыў, настолькі здзівіла яго, што ён не ўстрымаўся і ўсклікнуў:
– Гляньце!
Ці трэба гаварыць, што ў такі час, калі настаўнік расказваў пра такія незвычайнай важнасці падзеі, у класе панавала напружанасць, а таму пры воклічу шмат хто ўздрыгнуў і ўсе, літаральна ўсе паглядзелі ў школьнае шырокае акно.
Манаха яны там канечне ўбачыць не ўбачылі, бо па школьным гародчыку бегла ўсяго толькі чародка перапёлак. Не курапатак, але перапёлак – маленькіх, шчупленькіх. Ад замілавання ўсе затрымалі дыханне. Перапёлкі прашыліся праз плот, выбеглі на дарогу, перабеглі яе і зніклі за адхонам.
– Цуд, вось гэта цуд! – першым не вытрымаў цішыні настаўнік. – Гэта, я вам скажу, знак, – з самым сур'ёзным выглядам сказаў ён. – Гэта лепшае пацверджанне майму расповеду. А гэтыя недавяркі, што выйшлі, яшчэ пашкадуюць. Ну, а цяпер я дакажу канец маёй цікавай гісторыі. Слухайце!
Тым часам хлопец і дзяўчына выйшлі на школьны двор. Звінела запозненая вясна, ззяла сонца, дзічкі, як гіганцкія танцоркі ў белапеннай позняй квецені высіліся ўздоўж меліярацыйных каналаў.
– Ну хоць бы пра што іншае сачыняў, – незадаволена сказала Лена, маючы на ўвазе настаўніка. – Мы перайшлі ўжо ў дзевяты клас! Хай бы пяцікласнікам такія рэчы расказваў...
– А ім абы слухаць, – махнуў рукой Пятрук.
– Як я заўважыла, што манах быў хрысціянінам і не мог баяцца паганскага бога Перуна, Савіцкі бачыш як задумаўся.
– Ім што анекдоты слухаць, што астраномію, абы ў іх не пыталіся...
– Гаварыў і думаў, як перакруціць, што манах не да канца хрысціянінам быў. На хаду сачыняе, словам.
– А мне падабаецца, як Троцкі расказвае, – паглядзеў на дзяўчыну Пятрук.
– Калі табе падабаюцца байкі пра кансерваваных манахаў, ты не выйшаў з дзіцячага ўзросту, – з іроніяй прамовіла Лена.
– Я-я не выйшаў? – абурыўся хлопец. – Ды я і не такое магу прыдумаць...
– Паглядзім, – сказала Лена. – Лета наперадзе. І не называй настаўніка Троцкім... Ты ж не... малы! – гарэзліва дадала дзяўчына і злёгку ўдарыла хлопца партфелем у бок.

**2**

Летам у гэтай жа вёсцы, дзе жылі настаўнік-выдумшчык і Пеця з Ленай, адзін вясковец выцягнуў з ракі вялізную чорную дубовую калоду. Падзея адбылася пад канец ліпеня, калі сышла вялікая вада, а дажджоў доўга не было. Сонца тады так моцна праграваe мелкаватую рэчку, што яна за ноч не паспявае астыць. Надыходзіць мілы сэрцу рыбаловаў час, калі можна ў любы дзень хоць з раніцы лезці з таптухай у цёплую, мутнаватую ваду, каб не налавіць, а проста набраць-начэрпаць свежай, прыснулай ад гарачыні і задухі рыбы.

– Неяк вяскоўцы, Колбы ім было прозвішча, – бацька і двое сыноў, лазілі са старой парванай кломляй па меліярацыйных каналах у пошуках уюноў. Відаць, ім не надта пашэнціла, бо яны выйшлі, не баючыся рыбнагляду, на раку. Думалі, падбіць пару разоў пад які лазовы куст, ухапіць шчупака, набраць плотак і лінёў і вылезці-ўцячы з вады, каб інспектары не выпісалі штрафу. І трэба было такому здарыцца, што стары Колб акурат і намуляў на дне ракі нейкую тоўстую, што бочка, бервяніну.

– Хлопцы, – сказаў ён. – Тут вялікая булдавешка. Думаю – мораны дуб.

Маладыя Колбы патапталіся нагамі. Напраўду, ляжыць на дне нейкая акруглая, цвёрдая і доўгая калода. Ды яшчэ з тоўстымі галінамі-адводкамі.

– Гэта мораны дуб. Няма лепшага матэрыялу на падваліны пад хату. Рыба рыбай, а мы гэтага карча мусім выцягнуць. Завядзём трос пад дзеравіну і высмыкнем на бераг.

Так і зрабілі. Да гэтага месца берага Колб падагнаў гусенічны трактар. Ягоныя, хлопцы, узброеныя рыдлёўкамі, раскапалі пад вадой дуб, зацягнулі пад калоду пятлю з тросаў і далі трактарысту каманду цягнуць. Трактар зароў, але ягоных конскіх сілаў не хапіла, каб зрушыць дзеравіну з месца. Намацалі і абсеклі тоўстыя бакавыя галіны. Ні з месца. Давялося клікаць яшчэ адзін трактар. Але і два трактары не змаглі адразу выцягнуць калоду – ад вялікай натугі лопаў трос. Дуб раскопвалі больш, цягалі ўбакі, намацвалі знізу і адпілоўвалі і адсякалі галіны. Урэшце дуб паказаўся з-пад вады. Чорнае дрэва было таўшчынёй у некалькі абхватаў, з вострым, як бы сколатым камлём.

– Недзе вада падмыла, вось ён у раку і заваліўся, – адзначыў стары Колб. – А то чаго б ён упаў? Ну, пацягнем дзеравіну на пляц.

«На пляц» азначала на сядзібу. Так і зрабілі. Калі падцягнулі калоду да Колбавай хаты, ягоная гаспадыня расчыніла вароты, нібыта гасцінна запрашаючы госця – моранага дуба – у двор.

Трактары датралявалі карчэвіну ў канец сотак, дзе ўжо ляжаў лес на хату, і дзе гаспадар меркаваў ставіць зруб.

Некалькі дзён калода абсыхала, Колб абстукваў яе абухам сякеры і ад яе адвальваліся камлыгі насохлай гразі. Аднаго разу гаспадар заўважыў, што пасярэдзіне калоды адкрылася дзірка. Ён расчысціў яе, аказалася, гэта было дупло. Адтуль, з сярэдзіны, разагрэтая сонцам, цякла нейкая духмяная гразь. Гаспадар вычышчаў сякерай яе з дупла, і так яна панадна пахла, што не стрымаўся, панюхаў, а потым і лізнуў. Здзіўленню ягонаму не было мяжы!

– Гэта ж мёд! Трэба ж!

Ён схадзіў да паветкі і, узброены кельмай, стаў чысціць дупло ўглыб. Неўзабаве рабро кельмы стала рэзаць цёмна-жоўты воск сотаў, нібы толькі што налітых мёдам, свежым і духмяным.

І тады Колб пабег у хату за якой пасудзінай. Мёду таго было столькі, што нарэзаў кельмай ледзь не поўную алюмініевую місу. Мёд з таго дупла ў старадаўняй калодзе быў цёмны, густа-духмяны, аддаваў крыху нейкай горыччу, нібыта тванню, але на смак быў і салодкі, і прыемны. Пра Колбаву знаходку праведалі суседзі. Прыйшлі, паглядзелі, падзівіліся, пакаштавалі, узяўшы на цёску, таго мёду. Нічога, напраўду салодкі. Сталі калупаць соты, а хто пайшоў дахаты па збанок ці слоік.

– Дуб мой, – заявіў гаспадар, – я за яго самагонку трактарыстам ставіў. Думаў, падруба будзе пад хату, а ён, халеру на яго, дуплаваты, пусты ў сярэдзіне.

З гэтым словамі Колб пастукаў абухам сякеры па калодзе. Яна, бо і напраўду пустацелая, ажно крыху і загула.

Суседзі пастаялі, папераглядваліся, маўляў, што робіцца: скнарны Колб, вядома, але ўжо ж не да такога – дармавога мёду шкадуе, ды якога яшчэ мёду – гразі нейкай. Да Колба дайшлі суседавы пераглядкі, і ён махнуў рукой, маўляў бярыце, што ўжо тут, не шкада. Сталі людзі вышкрэбваць соты: і рэзалі, і калупалі да самага вечара, пакуль не села за лесам сонца, і каля рэчкі зрабілася цёмна. Ды яшчэ з-за рэчкі, з азярын насунулася цэлая хмара камарэчы, і яны пачалі так зверстваваць, што трэба было ўцякаць па хатах.

Ён ачуўся ад настойлівага стукату. Яшчэ калі не быў пры поўнай свядомасці, яшчэ тады, калі раптам з абсалютнай, нібы вечнай цемры нечакана ўзнік толькі малесенькі кавалачак, мізэрны фрагменцік самаўсведамлення; яшчэ калі яму здавалася, што ён знаходзіцца ў глыбокім сне, проста на дне нейкага вычварна глыбокага, амаль бясконцага калодзежа; ледзь не ўслед за з'яўленнем першых крапялінак свядомасці ён і пачуў роўны, метадычны стук, раўнамернае пастукванне, якое нібы гаварыла яму: «Уставай, падымайся, хопіць табе ляжаць, хопіць табе быць нерухомым».

Ён хацеў быў варухнуцца, але нічога не адбылося. Ён не адчуваў ні рук, ні ног. І твару ён не адчуваў – ні вуснаў, ні вачэй... І ў той жа час чуў выразны стук, сапраўднае пагрукванне, якое напамінала яму нешта да болю знаёмае.

Ён паспрабаваў моцна заплюшчыць вочы, а потым расплюшчыць іх, але зноў нічога не адбылося. Толькі ўзнік тупы боль. І адразу – нібы гарачая хваля абдала яго з ног да галавы – яму захацелася дыхаць. Але ён нібы не ведаў, як гэта рабіць, ён нібы ніколі не ўмеў гэтага рабіць. Ён разумеў, што калі не ўдыхне – загіне ад задухі. Яму трэба было ўдыхнуць паветра, глытнуць свежага духу, але імгненні прабягалі за імгненнямі, а нічога новага ў ім не адбывалася. І ён задыхаўся, пакутліва ўсведамляў, што задыхаецца і на некаторы час свядомасць зноў пакідала яго, ён зноў нібы адключаўся, правальваўся скрозь бясконцае дно, але зноў капяліначка свядомасці, нібы цьмяны ўпарты светлячок, узнікала з небыцця, каб выклікаць новую хвалю пакуты, болю, нясцерпнай жады ўдыхання і немагчымасці варухнуцца, удыхнуць на поўныя грудзі.

Так працягвался, як яму здавалася, бясконца доўга. Ён безліч разоў прачынаўся, прыходзіў да свядомасці і зноў губляў яе, зноў раствараўся ў небыцці, рабіўся нібы бязважкім, бесцялесным, не разумеючы, хто ён, што ён, дзе і чаму тут, у гэтым пункце быцця.

Ён заўважыў, адсачыў, зрэшты, проста адзначыў, што набывае нейкую прасторавую запоўненасць, набывае пэўную канфігурацыю і яму падалося, што ён усё ж проста спіць, і неўзабаве прачнецца, а калі гэта адбудзецца, ён апынецца там, дзе звычайна апынаўся, калі канчаўся ягоны сон і трэба было ўставаць да ранішняй малітвы.

Гэтая апошняя думка пра ранішнюю малітву так усцешыла яго, што ён паспрабаваў закрычаць, заварушыць рукамі і нагамі, але з гэтага нічога не выйшла, бо ён зноў ад перанапружання і так амаль што бясконца мізэрных сіл страціў прытомнасць.

Калі ў чарговы раз свядомасць вярнулася да яго, ён, стараючыся не звяртаць увагі на тупы боль, які стаў пранізваць яго (ён гэтаму хацеў радавацца, але не мог – не было сіл), сканцэнтраваўся на тым апошнім, што да яго прыйшло – думцы пра ранішнюю малітву. Нібы ён быў страшным багацеем, але ў адзін мірг вока некалі бяздарна загубіў сваё багацце, але вось цяпер здабыў зноў, цяпер ён зноў валадар нечуванага багацця...

«Божачка, – падумаў ён, – вярні мне сілы! Вярні мне жыццё!»

На гэтую думку ён зноў выдаткаваў усё, што меў, і цемра зноў апанавала яго, і зноў пацягнуліся бясконца доўгія хвіліны, гадзіны, стагоддзі – ён не ведаў, не адчуваў, бо свядомасці ў яго не было.

Пеця Камар прызначыў спатканне як звычайна, на заходзе сонца, і, як звычайна, на старым месцы, на беразе ракі. Там недалёка ад берага на пляцы Адама Колба яны часта сядзелі на бярвеннях і глядзелі на раку, на зоркі, якія адбіваліся ад рачной паверхні, слухалі да замірання сэрца крэкт жабаў, захапляліся гульбой рыбы, якая гарэзавала пасля дзённай спёкі. Калі было жаданне, яны нават купаліся, або плавалі на лодцы, бо сваю лодку Колбы проста выцягвалі на бераг або прывязвалі ланцугом да вярбіны.

Вось пачуліся пругкія крокі па сцежцы ўздоўж берага і ў прыцемках паказалася светлая сукенка. Нарэшце яна!

Яны пацалаваліся, на нейкі момант абняліся. Потым, узяўшыся за рукі, прайшліся да ракі.

– Сёння мы доўга не пабудзем, – сказала Лена, а гэта была яна, Лена Заранок, тая самая Пецева аднакласніца, да якой гэтак прыкіпеў сэрцам. На словы дзяўчыны хлопец нічога адразу не сказаў, нібы ўзважваў, ацэньваў, нарэшце з выразнай крыўдай у голасе прамовіў:

– Гэта чаму?

– Чаму? – весела, з выклікам перапытала Лена. – Ты што, не бачыш, якія сёння камары? Як ашалелі.

– На спёку, – упэўнена, як стары дзед, прамовіў хлопец. – І рыба, чуеш, як гуляе. Пойдзем пасядзім? На наша месца?

Яны селі на бервяно, і хлопец ахінуў дзявочыя плечы наўмысна дзеля гэтага ўзятым пінжаком. Селі і гаварылі нешта, пра што звычайна гавораць закаханыя. Здавалася б, усяго два месяцы прайшло пасля школы, а як змянілася Лена, і як змяніўся Пеця. Лена з вуглаватага, худзенькага падлетка пачала брацца на дзеўку, якой ужо не давалі праходу старэйшыя, ужо не школьнікі, хлопцы. Яна ўжо і вушы пракалола – у яе па-падлеткаваму непрыгожых крыху адтапыраных вушах былі ўздзеты завушнічкі, а на пальцы блішчэў дарагі, з сапраўдным рубінам, пярсцёнак. Гэта ўсё падарыла маці на дзень нараджэння – Лене акурат стукнула шаснаццаць.

Пятро памужнеў, раздаўся ў плячах, стаў гаваркі, быстры ў рухах, але пры Лене ён быў чамусьці сарамлівы, губляўся. Пастрыжаны быў па модзе, гэта значыць ніяк не пастрыжаны. Яго ўжо некалькі разоў пераймалі на вуліцы настаўнікі і ўгаворвалі пастрыгчыся. Гэта быў не замах на своеасаблівую хлопцаву вольніцу, але прафілактычная мера – на Пецю глядзелі меншыя вясковыя хлапчукі, – як ён, так і яны. Пятрук у сваю чаргу браў прыклад са свайго старэйшага брата Паўла, сталічнага студэнта, які адгадаваў сабе ледзь не дзявочыя косы. Тады ў горадзе была такая мода – малпаваць заходніх хіпароў. Лена часта

распытвала пра студэнцкае жыццё, пра Паўла, і гэта Пецю страшна не падабалася.

– Што ты ў мяне пытаешся? У яго спытай...

– А калі ён прыедзе?

– Скора і прыедзе.

Над ракой, з-за чарналесся, з'явілася белаватая поўня. Лёгкія летнія аблачынкі праплывалі паўз яе, але здавалася, што гэта аблачынкі і вада стаяць на месцы, а поўня, бледная тварам, велічна плыве над ракой і ўзіраецца на ўсё, што робіцца ўнізе – на зямлі, на рацэ.

– Мо адвяжам човен і паплаваем, – не зусім упэўнена прапанаваў Пеця.

– Як хочаш, – адказала Лена, але ў голасе яе прагучала неахвота. Яна, як разумнейшая, прадбачыла, што Пятрук палезе цалавацца, каб у чарговы раз даказаць, што ён выйшаў з дзіцячага ўзросту, а ў няўстойлівым чоўне гэта рабіць рызыкоўна – можна і перакуліцца. І надта прыемна тады коўтацца ў вадзе, ды яшчэ ў цемнаце.

Нехта зусім недалёка кашлянуў. Пятрук падняў галаву, а дзяўчынка наўмысна прыціснулася да яго.

– Тут нехта ёсць... – прашаптала яна.

– Ды хто тут будзе? – ціха прамовіў Пеця, распрастаў плечы і выгукнуў знарочытым басам:

– Хто тут?

Ніхто не адказаў. Плыла над ракой поўня, правагалася ў крышку затуманенай вышыні начная чапля, плёхнула пад вербамі рыбіна. Хлопец прыціснуў дзяўчыну да сябе.

– Слухай, Пеця, а чым сёння ад цябе так прыемна пахне?

– Гэта мёд...

– Які мёд?

– Бачыш, вунь дуб, які Колбы з ракі выцягнулі, – паказаў Пеця.

– Ну і што?

– З гэтай карчэжыны людзі сёння мёд дзерлі... І я тут быў.

– Як гэта? Напраўду? Не, сачыняеш. Пастой, пастой. А я думаю, што гэта казалі пра нейкі мёд...

– Бачыш, а ты не верыш мне. Вер мне, бяда не міне. Я і сам от такі кавалак сотаў выразаў...

– Сотаў? Мёду? З гэта дуба? Ты ўжо сачыняеш, як той Савіцкі. Памятаеш, на апошнім уроку Мікалай Лявонавіч пра манаха заліваў, што ў дзеравіне на дне ракі тысячу гадоў праляжаў... Так і ты: з рачнога карча мёду набраў.

– Ідзём да дрэва, – хлопец рашуча падняўся з бервяна. – Сама пераканаешся, што мёд у дупле самы звычайны...

У гэты момант зноў пачуўся кашаль – натужлівы, рваны. Некага аж да стогну раздзіраў кашаль. Гэта нават нельга было назваць кашлем: то было нейкае пэрханне, усхліпы. І дзіўна – здавалася, што гэтыя гукі далятаюць нібы аднекуль здалёк, і ў той жа час яны чуліся выразна, нібы нехта блізка сядзеў пад лодкай ці ў якой бочцы.

– Глядзі, – раптам сказала Лена, калі яны падышлі да калоды, – што гэта калываецца...

– Дзе? – стаў узірацца хлопец.

– А вунь варушыцца... Пецечка, я баюся.

Прыгледзеўшыся, яны ўбачылі, як з дупла дубовай калоды нешта вывалілася і пляхнулася на зямлю.

– Ай! – піскнула Лена і моцна ўчапілася за хлопца. – Што гэта?

**3**

Але цемра зноў апанавала яго.

І зноў нібы скрозь мяхі з воўнай чуліся яму глухія ўдары, і свядомасць на кароткі час прыходзіла да яго, каб працінаць нясцерпным болем, страшнае ўдушша прыводзіла да адчаю, зноў адкідвала ў чорную яму небыцця.

Усё ж ён разумеў, што паветра нейкім чынам больш і ўсё лепш трапляе да яго ў грудзі, бо з кожнай хвілінай глыбіня і шырыня ягонай свядомасці павялічвалася, ён яшчэ вельмі слаба, але ўжо адчуваў сваё цела, ягоныя памеры, уласна, адчуваў сваю істоту.

Ён пачаў сціскаць зубы. Ён разумеў, што і сківіцы не слухаюцца яго, але засяродзіўся менавіта на зубах, уяўляў, што сціскае іх усё мацней і мацней. Яму здавалася, што ён спіць, і ніяк не можа прачнуцца, а для гэтага яму трэба ўшчыкнуць сябе, прыкусіць язык, закусіць губу, укалоць сябе чым-небудзь.

Неверагодным намаганнем волі яму ўдалося на нейкі момант варухнуць языком.

Ён ім варухнуў, ці так яму толькі падалося? Ён зноў засяродзіўся на языку, і цяпер выразна адчуў, што гэтая «калода сярод балота», як загадвалі загадкі ў бясконца далёкім дзяцінстве, зрабілася адчувальнай. Няўжо ён адчуў рот? І язык у ім?

Гэтыя адчуванні былі настолькі нечаканымі, новымі, свежымі, што ён адчуў прыліў сіл, зноў папрасіў у Госпада сілы і змог варухнуць языком настолькі яўна, што адчуў яго ў роце цалкам, нібыта то быў сухі,

выпетраны шкурат.
Рэзкі, усё адно як укол восвы проста ў гартань, прыступ кашлю скруціў ягоныя грудзі. Ён задыхаўся, ніяк не мог пракашляцца, і калі сутарга кашлю скончылася, ён пачуў сіпенне і зразумеў, што то і праз рот, і праз нос ідзе ў грудзі паветра, што ён гэтак удыхае. А значыць, будзе жыць, проста – будзе.
Цяпер ён чуў не толькі той грукат, які адносіўся аднекуль звонку; не толькі, нават нібы нейкія і галасы, якія ўтвараліся па-за ім, нібы знадвору, нібы ён ляжаў у труне недзе глыбока пад зямлёй, а ўсе гукі даносіліся, ішлі да яго; цяпер ён выразна чуў новы гук, біццё, роўнае, працяглае, яшчэ не моцнае, але няспыннае, як неадменнае чаргаванне дня і ночы, зімы і лета, удыхання і выдыхання.
«Гэта сэрца! Гэта маё сэрца! – абрадаваўся ён. – Вунь колькі ўсяго ў мяне ёсць: сякая-такая мая свядомасць, мой боль, стук знадворку, дыханне, біццё сэрца... »
Яму захацелася дыхаць мацней, хоць гэта было вельмі балюча. Ён ўжо адчуваў пальцы рук і ног, спрабаваў варушыць імі, але яны не слухаліся яго. Варушыцца тулавам ён не мог, быццам быў заліты нейкай смалой.
Па меры таго, як свядомасць вярталася, ён не здзіўляўся, што знаходзіцца, апынаецца не там, дзе ён прывык апынацца кожны раз, калі прачынаўся, гэта значыць на сваім мулкім тапчане ў келлі ў далёкім, за лясамі, за даламі манастыры, а недзе ў іншым, чужым, далёкім і нават варожым яму месцы. Ён адчуваў сябе аблепленым нечым густым і клейкім, нібы абквэцаны самім жывёльным страхам. І першае, што прыходзіла яму ў галаву, што ён закладзены цэглай у страшных пячорах Кіеўскай лаўры, у якіх старцы ці па любові да Бога, ці па ўсведамленні велічыні і беспрасвецці ўласных грахоў замуроўваюцца жыўцом. А ён ці заснуў тым незвычайным непрачынальным сном, як бывала, а яго ўзялі і замуравалі; ці самахоць згадзіўся на такі непатужны на ягоныя сілы подзвіг, учынак, які пераўзыходзіў ягоныя магчымасці, меру ўсведамлення ўласных грахоў, а гэта значыць – меру пыхі і ганарлівасці, каб вылучыцца сярод брацііі. І вось цяпер ён прачынаецца ў той пячоры, у той чорнай і змрочнай келлі, зусім не гатовы ў ёй прачнуцца.
Быў блізкі да роспачы, але ў галаве нібы слабой свечкай раптам асвятлялася тое апошняе, што ў ёй трымалася – бляск маланкі і амаль адразу страшны ўдар і трэск дрэва, якое ламалася. Ён яшчэ не разумеў, што гэта было, што ён яшчэ і да гэтага моманту жыў, у яго было мінулае, але яно здавалася цяпер настолькі невыразным, быццам з адным ударам маланкі неверагодна хутка аддалілася прэч у бясконцую чараду гадоў, знікла ў цемры стагоддзяў і зрабілася абсалютна чужым.
Ён памятаў толькі гэты ўдар маланкі, быццам пацалунак самога язычніцкага бога Перуна, трэск дрэва і ўсе нядаўнія пакуты і трымценні, пакуль ён прыходзіў да памяці. Ён адчуваў сябе новым, нібы толькі што народжаным. Новае было ў галаве, новае было ў целе і новае тварылася-рабілася вакол яго. Фізічна, ледзь не да болю ён меў чутво паветра, якое ўлівалася ў грудзі невыносна-свежымі, востра-ядранымі струменямі і з кожным удыхам нараджала новы прыступ жыцця – гэта значыць, новы прыступ болю, але і новыя адчуванні. Праз паветра ў яго ўліваўся новы свет. Пакуль ён яшчэ не мог варушыцца, нават не адчуваў добра ні рук, ні ног, але разумеў, што, паколькі свядомасць вярнулася, жыццё вярталася ў яго. І за кароткі час, за некалькі секунд, паспеў зразумець, што з ім адбылося і дзе ён знаходзіцца.
Спакваля да яго вярталася памяць, але толькі крок за крокам, жэст за кожным жэстам. Ён усведамляў, дзе ён, паколькі ўспомніў, што лез на дрэва. Для чаго ён лез на дрэва, ён пакуль не ведаў. Відаць, каб пераначаваць, або схавацца ад непагадзі. А можа, уцякаў ад ворагаў, і дупло дрэва паслужыла для яго надзейным спратам? Нагэтулькі надзейным, што захавала яго на многія дні.
Ён яшчэ не разумеў, што прайшло шмат часу, вельмі шмат. Яму здавалася, што варта яму прачнуцца, і акажацца, што ягоны сон цягнуўся ўсяго толькі адну ноч. Аднак нешта падказвала яму, што гэта не зусім так, што ягоны сон чамусьці неверагодна зацягнуўся. Гэта ўжо і не сон, а нейкі няўцямны стан, што доўжыцца не гадзінамі, а днямі, дні чаргуюцца з начамі, суткі мільгаюць і зліваюцца ў нешта бясконцае. Ён фізічна адчуваў бег часу, хоць не мог даць у гэтым якой-небудзь канкрэтнай справаздачы, выразнага чаргавання святла і цёмначы ён не адсочваў.
Ён не разумеў, што дрэва, у якім так доўга працягваўся ягоны сон, апынулася на беразе, на сушы. Яму здавалася, што тое, што з ім адбываецца цяпер, робіцца не з ім, а з некім іншым, а ён проста збоку назірае за гэтай незразумелай істотай, якая з'явілася з чорнай дзіркі дупла, у якім праляжала немаведама колькі гадоў. Чалавек толькі і памятаў, што трэск дрэва і бляск маланкі. Ён яшчэ не разумеў, што ўжо выпаў з таго дупла, у якім правёў столькі часу, і бачыць ноч, і варушыць рукамі і нагамі.
Калі Лена піскнула і моцна ўчапілася за Пятра, ён сам спужаўся, хоць выгляду не падаў.
– Што гэта? Што гэта такое? – выглядвала дзяўчына з-за хлопцавага пляча, узіраючыся на нешта цёмнае і валасатае, што ляжала пад калодай і сілілася ўстаць на карачкі.
– Гэта не «што», гэта – хто! – адказаў Пятро, уважліва разглядаючы нешта падобнае хутчэй на малпу, чым на чалавека. Святла поўні не хапала, каб можна было добра разгледзець істоту, таму хлопец адважыўся і падышоў бліжэй.
– Не падыходзь, Пецечка, яшчэ кінецца...

– Не кінецца, ён ледзь варушыцца... Слухай, хадзі сюды... Не бойся. Гэта яно і ёсць! Тое самае...
– Што? – баязліва падступалася дзяўчына.
– А той самы манах, пра якога Савіцкі расказваў.
– Што-о?
– Падыходзь, не бойся. Ён ледзь жывы. Уга... Увесь слізкі ад мёду.
Некалькі хвілін Лена ніяк не магла адважыцца падступіцца бліжэй. Пятро тым часам дзейнічаў: адсунуў знойдзеную істоту ад дрэва, распрастаў яе, ацёр ад мёду рот і нос, і нават паспрабаваў зрабіць штучнае дыханне.
– Ён што, дыхае? – стала ўзірацца Лена ў стварэнне, якое, – хто б мог паверыць? – на яе вачах выпала з дубовага дупла.
– Здаецца, дыхае, – адказаў Пятро. – І сэрца стукае.
– І сэрца стукае?
– Калі жывы, чаму ж не будзе стукаць. Трэба людзей паклікаць. На, пакратай яго – не рукі, а адныя косткі. Усох. Рэбры як у школьнага шкілета. Слухай, Лена, ушчыкні мяне. Я не веру сваім вачам!
– А я сваім веру?
– Кгдзе аз есм? – пачуўся невыразны шэпт, які, сумненняў не магло быць, сыходзіў менавіта ад чорнага, усохлага, як вэнджаны лешч, але ўсё-ткі чалавека, і чалавека жывога.
– Гэта ён, ён шэпча! Гісторык меў рацыю! Ён прадбачыў падзеі пра гэтага манаха, наш Савіцкі – вяшчун, празарлівец, а ты не верыла, – разгарачана прашаптаў Пятро. – А я верыў!
– Трэба бегчы па людзей, выклікаць «хуткую», – замітусілася Лена. – Яму трэба... кропельніцу.
– Кгдзе мой кій? – раптам даволі выразна прамармытаў манах. – Мой посах...
– Посах? Недзе ў дупле, а дзе ж яму быць. Ты ж з дупла? – гучна, схіліўшыся над манахам, прамовіў Пятро.
– Вочы, ай, мае ж вочачкі... Як ў мяне баляць вочы! Я не магу бачыць. Я нічога не бачу... Вады, дайце мне вады! – прастагнаў манах і паднёс аслабелую руку да вуснаў. – Кгэта што, крывя?
– Мёд!
– Дайце папіць, вады дайце... У мяне язык у роце сухі, як трэска...
Лена ў адзін міг збегала на падворак да Колбаў, было чуваць, як яна выкруціла, калаўротам вядро вады, неўзабаве прынесла цэлы трохлітровы слоік.
Манаху далі напіцца, крыху абмылі. Ён пажвавеў, заварушыўся, павярнуўся ў бок ракі, з цяжкасцю стаў на калені і стаў нешта шаптаць, час ад часу кланяючыся і дакранаючыся лобам да зямлі.
– Моліцца, – ціха сказала Лена. – А ледзь не голы, адзенне на ім распаўзаецца. Сатлела.
– Угу, – мыркнуў Пятрук. – Дзе ж не сатлее. Гэтулькі гадоў праляжаць. Бачыш, які я кій ягоны знайшоў... Ён з дупла тырчэў. Пэўна, гэты во згубіў. З рук выпусціў...
Але Лена не паспела глянуць на хлопцаву знаходку, бо манах раптам заплакаў. З яго вачэй не цяклі слёзы, бо ён сам быў яшчэ сухі, усё адно як егіпецкая мумія. Адзіная вільгаць, якая была ў ім – гэта вільгаць вачэй, бо яны блішчэлі ў святле поўні месяца.
– Хвала... Хвала Табе, – гучна вымавіў праз сухія, даўкія рыданні манах, – Кгоспадзе Ісусе Хрысце, Сыне Божы, Ратавацель мой, упаванне маё, надзея мая, Кгасподзь мой, што паказаў мне кгэтае святло, хвала Табе!
І манах працягнуў да серабрыстай поўні худыя, як два кіі, рукі.
Лена з крыкам кінулася ў бок сяла.
– Людзі, людзі! – крычала дзяўчына. – Манах з дуба выпаў!
Яна бегла, крычала і не азіралася. Яна баялася азірнуцца – да яе нарэшце дайшло, што здарылася.
На крык Лены ёй насустрач ад вясковага клуба прыйшлі хлопцы. Гэта былі і Леніны аднагодкі, і хлопцы з меншых, і зусім малыя, якіх не пускалі ў клуб на танцы, або яны яшчэ самі не адважваліся туды заходзіць.
Юнакі і хлапчукі не беглі, а проста ішлі, нават уразвалачку. Палкія і блытаныя тлумачэнні ўсхваляванай дзяўчыны прывялі да нечаканага для яе выніку. Замест таго, каб кінуцца следам за ёю, як яна прасіла, амаль усе схапіліся за жываты і сталі рагатаць. І так рагатаць, што аж поўзаць.
– Манах?! У чырвоных штанах? – перапытвалі хлопцы і зноў заходзіліся ад рогату.
– Я на свае вочы бачыла, – пераконвала Лена недавяркаў, – ён там ляжыць: чорны і страшны.
– Увесь у валасах, – перапытвалі малыя, – манах у мадняцкіх штанах. Гэта дзіва? Гэта тое дзіва, што гісторык вам расказваў?
– Ідзёмце, ідзёмце за мной, прашу вас... – ледзь не ўкленчвала дзяўчына.
Ёй ніхто не верыў. Сама атмасфера таго вечара не дазваляла і старэйшым хлопцам, і падшыванцам паверыць у цуд: ужо колькі яны адзін аднаго падманвалі рознай лухтой, кляліся і бажыліся страшнымі клятвамі, прыдумляючы розную лухту, што ўжо зняверыліся да бясконцасці. І тут ім прапануюць чарговы

падман, як казалі – падколку. Была ў той час такая мода, калі хто-небудзь выдумляў якое несусвецце, і так мондра і ўмела пераказваў-пераконваў сяброў, што тыя верылі. А як выкрываўся падман – падымалі на смех. Падняць на смех было адной з любімых забаў. Адзін з малых ці не ўчора павёў старэйшых есці вінаград, які выспеў на гародзе ў адной цёткі. Паверылі, схадзілі, але знайшлі толькі зялёную завязь. І гэта толькі адзін прыклад, самы прыстойны.

– Ды ну цябе, з тваім манахам, – не вытрымаў урэшце смеху Ленін аднакласнік Міхась Сінчук. – Ідзём лепш танцаваць. А то вы ўсё са сваім Пятром па завуголлях аціраецеся.

– Тады я пайду дзяўчат паклічу, – рашуча сказала Лена і накіравалася ў клуб. Нікога са сваіх сябровак, якія маглі б паслухацца, яна там не знайшла. Дзяўчына ў роспачы выскачыла з будынка клуба. Няўжо будзіць каго з дарослых?

– Ну пайшлі, сходзім, – урэшце злітасціўся Міхась. – А то, бачу, аж счарнела, бедачына.

За імі ўвязаліся яшчэ пару малых.

Ён адчуваў сябе жывым, і гэта было галоўным. Дзе ён быў, у якім месцы знаходзіўся, сярод якіх людзей ён апынуўся, ён яшчэ не азадачваўся, гэта яму яшчэ не прыходзіла ў галаву. Тое, што былі яшчэ, аказваецца, людзі акрамя яго, моцна яго ўразіла. Яго здзівіў сам факт існавання іншых чалавекаў. У сваім бяспамяцтве, бясконцым летаргічным сне ён забыў пра саму магчымасць іх існавання! Ён нават не дапускаў у думках, што іншыя людзі маглі быць. І думка, што могуць на свеце існаваць яшчэ такія істоты, як ён сам, што яны могуць адчуваць тое самае, што і ён, была радаснай і салодкай.

Чалавек, надзвычай высокі, спакойны хадзіў наўкола яго, вохкаў і ўсё прапаноўваў яму ваду. І яшчэ адзін чалавек хадзіў побач і таксама вохкаў. І гэтыя два чалавекі, аказваецца, былі розныя. І толькі тады ён успомніў, што на свеце ёсць мужчыны, і ёсць жанчыны. І гэтае маленькае, але такое важнае адкрыццё спачатку абрадавала, але потым адразу ж і засмуціла. Вельмі хутка, ці не ў адно імгненне перад ім прайшоў той доўгі і пакутлівы працэс, калі таму, хто выракаецца свету і пастрыгаецца ў манахі варта помніць толькі тое, што жанчына для яго можа з'яўляецца толькі сястрой, а мужчына братам.

І яшчэ ён раптам успомніў, што яму надзвычай важна некуды ісці. Ісці і несці той кій, які ён не адчуваў у руках. Ён турбаваўся пра свой кій, і турбаваўся моцна, і ўрэшце высокі малады чалавек, які таптаўся побач, уклаў той кій яму ў рукі. Адкуль ён яго ўзяў? Але наяўнасць кія заспакоіла яго. І ён падняўся на ногі, зрабіў крок- другі, а потым пайшоў, яшчэ не ведаючы, куды ён ідзе, куды накіраваўся, але пайшоў, выправіўся ў дарогу, у шлях, які яму абавязкова трэба было завяршыць.

Калі ён адчуў пад нагамі ваду, пачуўся голас:

– Ты куды? Там жа рака?!

Рака? Вада? Трэба ўлезці ў ваду, каб змыць гэтую ліпкую, нібы дзёгаць, нейкую смалу... І што гэта за людзі, чаго яны крычаць?

**4**

Міхась і Лена ў атачэнні чародкі дзяцей перайшлі гароды і берагам рэчкі накіраваліся да канца Колбавага гарода. Дзяўчына не пераставала расказваць пра ўбачанае.

– Ён забраў той посах. Кажа – дзе ён, мой посах.

– А што, у тым посаху змяшчалася сакрэтнае данясенне? – іранізаваў Міхась.

– Ён посах забраў, і адразу заспакоіўся. Нібы той кій для яго ёсць неацэнная каштоўнасць. Посах ён забраў і давай маліцца...

Неўзабаве паказаўся цёмны сілуэт бярвенняў, на якіх Лена нядаўна сядзела з Пецем. Вакол іх і каля дубовай калоды, якая нібы тулава нейкай дагістарычнай жывёлы ляжала на схіле да ракі, нікога не было.

– Ну дзе твой кавалер? Пеця! Пятрук, – гукнуў Міхась. – Во справы: ні жанішка, ні манашка...

З-за бярвенняў з'явіўся спакойны Пятро.

– Што тут здарылася? – спытаўся ён.

– Як што тут здарылася? Ну і флегма! Гэты я ў цябе павінен спытаць – што тут здарылася. Чаму вы ўвесь канец вёскі паднялі на ногі сваім крыкам?

– Я не крычаў...

– Глядзіце, глядзіце! – ледзь не заверашчала Лена. Усе глянулі туды, куды яна паказвала. На сярэдзіне ракі ў слабым свеце поўні, якая час ад часу затуманьвалася рэдкімі хмаркамі, рухалася постаць чалавека. Здавалася, нехта ідзе проста па вадзе, праз раку, амаль пасярэдзіне яе.

– Гэта ён? – ашаломлены, прамармытаў Міхась. – Вачам не веру!

– Ён, – махнуў рукой Пётра. – Я ўжо даўно гляджу.

Нейкі час усе: і Міхась, і дзяўчына, і падшыванцы як аслупянелыя глядзелі на загадкавую постаць.

– Гэта ж па вадзе, як па сухім... – мармытаў Міхась.

– А хто гэта? Хто? – здзіўлена перапытвалі дзеці.

– Як хто? Манах...

– А як гэта ён па вадзе ходзіць?
– А што тут такога, – выскірыўся адзін з малых. – Там вярбіна, на якой мы купаемся. Ён і стаіць на ёй, што тут дзіўнага.
– Вярбіна? – перапытаў Міхась. – Так, так. Напраўду тая вярбіна, якая і не тоне, але і не ўсплывае. Яе ад пляжа, ад першай купалкі, прынесла сюды, так, Пеця?
– Не ведаю, – перасмыкнуў плячамі Пётра. – Можа і вярбіна.
– Тады што гэта за прынц такі на ёй стаіць. Глядзі, чуць не ўпаў, рукамі ўзмахнуў. Точна вярбіна. Гэ-й! Шалапут!
Дабраватае воблака насунулася на месяц, і зрабілася цёмна. Ад ракі быў толькі чуваць плёскат рыбы, якая як нічога і не было, працягвала гуляць.
– Вось тут мы яго і ўбачылі. Праўда, Лена?! – сказаў Пятрук, паказваючы рукой на дубовую калоду.
– Праўда, – як заварожаная, адказала Лена. – А як ён можа проста так па вадзе ісці.
– Бярыцеся за лодку, мы зараз яго дагонім, – прапанаваў Міхась, пыдходзячы да берага.
– Цябе Колб як устане, ды як дагоніць, – адказаў адзін з малых. – Глядзі ўжо – акно ў хаце свеціцца. Точна ўстаў. Ён не паглядзіць, што вы вялікія.
Сапраўды, звязвацца з Колбам было справай рызыкоўнай. Як гаспадар, уласнік, ён надта раўніва адносіўся да сваіх сотак, да свайго агарода, нават да свайго ўчастка берага ракі. Нікому з хлопцаў не хацелася лішніх клопатаў, як бы яны не былі ўражаны ўбачаным. Пеця, дык той увогуле стараўся трымаць месца сваіх спатканняў з Ленай у сакрэце, а таму хацеў як мага хутчэй сысці адсюль.
– Мы заўтра яго знойдзем, – упэўнена сказаў ён, але ў голасе ягоным прагучаў фальш. – Куды ж ён дзенецца.
– Я ўпэўнена – манаху патрэбна медыцынская дапамога! – хвалявалася Лена.
– А ты ўпэўнена, што гэта манах? – з насмешкай сказаў Пеця.
– А хто ж гэта тады? – задалася пытаннем дзяўчына.
– Нейкае боўдзіла з суседняй вёскі, вось хто гэта! – заявіў Пеця.
– Дык чаго вы мяне сюды звалі? – абурыўся Міхась. – Ты што, не мог з ім разабрацца? На дапамогу паклікаў?
– Ён не клікаў, – расчаравана сказала Лена.
– Ну, ты клікала. А чаго?
Рыпнулі дзверы ў хаце, на ганку з'явіўся стары Колб. Малыя сцішыліся і адзін за адным, як цені, падаліся прэч. Так ім было цікава сустрэцца са звяглівым і ўпартым, як баран, Колбам. Ён праганяў ад свайго ўчастка берага ўсіх. Затое і бераг рэчкі ў яго быў чысцейшы – ніякіх табе сметнікаў.
Колб пастаяў на ганку, відаць, убачыў на беразе людзей і накіраваўся да рэчкі.
– Ідзём, – Пятрук узяў Лену за руку. – А то будзе крыку.
У клубе ўжо ведалі пра здарэнне, і як толькі Пеця з Ленай і Міхась з'явіліся ў святле вулічнага ліхтара, які свяціўся над будынкам клуба, пачуліся крыкі, свіст і паддражніванні. Міхась кінуўся за малымі біцца.
– Міхась, не звяртай увагі, – супакоіў яго Пятрук. – Ідзі сюды, вось што я табе пакажу.
Пятрук падышоў да большага святла і працягнуў Міхасю невялічкі скрутачак.
– Гэта што, скурка нейкая?
– Скура. У тым то і рэч.
– А дзе ты ўзяў? Ці не манах табе падарыў?
– Не ведаю, ці манах гэта, але я дастаў гэтую рэч з таго кія, які я потым яму аддаў.
– Што ты зноў вярзеш? – абурыўся Міхась, але прапанаваны яму скрутачак разглядваў уважліва. – Скура нейкая далікатная і не па-нашаму напісана.
– Як не па-нашаму? – здзівілася Лена, таксама ўважліва разглядваючы скуру. – Тут па-царкоўнаму напісана...
– Гэта пергамент, на якім калісь пісалі кнігі. Бачыце, і па форме рыхтык табе кніжная старонка.
– Ну, дык дзе ж ты ўзяў?
– Там і ўзяў, дзе ўзяў. Што мне па два разы паўтараць.
– Дык яна можа мець гістарычную каштоўнасць, – выказаў меркаванне Міхась.
– Можа. Думаю, ці не схадзіць нам да гісторыка. Калі ён не спіць.
– О, Мікалай Лявонавіч не спіць. Я з танцаў позна іду, так у яго рэдка калі лямпа не гарыць, – знізіўшы голас на паўтона, сказаў Міхась. – Толькі ціха. Каб малыя не ўвязаліся. Ідзём па аднаму. Спачатку ты, Лена...
Урачыста панеслі трафей да Мікалая Лявонавіча, настаўніка гісторыі. Жыў ён недалёка ад школы, а гэта быў другі канец вёскі.
Настаўнікава хата была звычайным цагляным дамком, праўда, новым, бо нядаўна настаўнік пабудаваўся. Раней ён жыў у самой школе, у прыбудоўцы, разам з сям'ёй – жонкай, таксама настаўніцай, і

двума яшчэ малымі дзецьмі.
– Ён не спіць, я ж казаў, – задаволена прамовіў Міхась, калі яшчэ здалёк яны ўбачылі жоўтае ад каляровых фіранак святло. – Ён рэдка калі спіць, усё нешта чытае, а то нават у мікраскоп глядзіць.
– А ты ўсё ўбачыш... – не адобрыла дасведчанасць Міхася Лена. – Цікаўнік гэткі...
Было душнавата, таму акно, якое выходзіла ў гародчык, зарослы буйнымі вяргінямі і касачамі, было праадчынена. Фіранкі звісалі ў гародчык, лёгкі ветрык час ад часу развейваў іх, і тады можна было ўбачыць твар чымсьці заклапочанага гісторыка, схіленага над кнігамі.
– Мікалай Лявонавіч! – асцярожна, каб не пабудзіць дзяцей, якія спалі недзе ў глыбіні дома, у іншых пакоях, паклікаў Міхась. Настаўнік адарваўся ад кнігі, нават крыху трывожна глянуў у акно.
– А, гэты вы? – абрадаваўся настаўнік, пазнаўшы сваіх вучняў. – А чаму вы не спіцё? Позна ўжо... Што здарылася?
– Мікалай Лявонавіч, паглядзіце сюды. Што мы вось здабылі.
Дзяўчына і хлопцы зайшлі ў гародчык і падышлі да акна. Больш рашучы Міхась узяў з Пецевых рук кавалак скуры і падаў настаўніку.
У гэты момант у гародчык нашылася падлеткаў. І адкуль яны толькі ўзяліся! Відаць, яны адчулі, зразумелі, куды падзеліся хлопцы і Лена, і пайшлі за імі, сталі сачыць. Тут, пры настаўнікавай хаце, асмялелі, бо ведалі, што настаўнік надзвычай добры, і не стане іх праганяць. Мала таго, старэйшыя не адважацца ў прысутнасці настаўніка чыніць над імі свой самасуд.
Гісторык патрымаў у руках скуру, абмацаў яе, паднёс да лямпы.
– Дык што гэта? – крышку абыякава прамовіў ён. Але тут ягоныя вочы загарэліся цікаўнасцю: – О, тут нешта напісана...
– А мы самі хацелі ў вас спытацца.
– Гэта манах з дупла вылез, – заявіў адзін з малых.
Мікалай Лявонавіч зморшчыўся. Ён, вядома, памятаў усе свае расповеды, выдуманыя і нявыдуманыя. Часам яму было нават і сорамна за тую ці іншую выдумку. Але бывала гэта рэдка – дарослыя часцей маўчалі – усё ж настаўнік! – а дзеці хіба адважацца крытыкаваць ці папракаць.
– Мы не ведаем, ці манах, але нешта вылезла... – падала нясмелы голас Лена. Відаць, яна верыла, што напраўду бачыла, як з дупла вылез манах. Самы сапраўдны. Ды яшчэ той, тысячагадовы, пра якога так заўзята расказваў Мікалай Лявонавіч. А яна не паверыла тады, на тым уроку.
– Не нешта вылезла, а нехта! – цвёрда прамовіў Пеця. – І не проста чалавек, а нейкі дзіўны. Лена, скажы...
Лена, усё адно як пацверджваючы Пецевы словы, кіўнула галавой і развяла рукамі.
– Дык што здарылася? – няўцямна паглядзеў настаўнік на вучняў. – Што вы мне галаву марочыце?
– Во, Лена Заранок бачыла і Пятро Камар бачыў, – сказаў адзін малы, нават асмеліўся ўзлезці на падаконне, учапіўшыся за яго рукамі, а нагамі стаўшы на падмуроўку фундамента.
– Не Камар, а Комар. Я хачу быць Ко-ма-рам, а ніякім не Ка-ма-ром, – агрызнуўся Пеця і злёгку шлэпнуў малога ў патыліцу. – Колькі казаць?!
– Дык што вы бачылі, хлопцы? – усё ніяк не мог даўмецца настаўнік. Ён скеміў, што гутарка ідзе пра нейкага чалавека, які паводзіў сябе так, нібы манах. Акурат такі манах, пра якога ён расказваў у маі месяцы. Няёмка цяпер пра гэта чуць.
– Кажы ты, Пятрук, – падштурхнуў Міхась сябрука.
– Ну, бачыў, – пачаў расказваць Пятрук. – Ну, нехта вылез. А ці манах, не ведаю.
– Я ведаю! Гэта той самы манах, Мікалай Лявонавіч, пра якога вы расказвалі, далібог, – зноў улез у гутарку малы.
– Я расказваў? Пра манаха?
– Расказвалі, расказвалі.
– Ах, так-так. Расказваў. М-мда, харошы сюжэт. Ну, расказваў, і што?
– Так яно і аказалася ў рэальнасці! – сказала Лена. Вочы ў дзяўчыны свяціліся натхнёнасцю.
– Дак дзе гэтаму, мае мілыя, доказы? Хто мне дасць гарантыю, што гэта не які-небудзь розыгрыш, не блеф.
– Вось доказ! – урачыста прамовіла Лена, паказваючы на скураны скрутачак у руках настаўніка.
Настаўнік гісторыі Мікалай Лявонавіч як бы нехаця зірнуў на скрутак, у каторы раз памацаў яго ў пальцах, злёгку пацёр, нават чамусьці панюхаў, потым дзелавіта засунуў хлопцавы здабытак у нагрудную кішэню дамашняй кашулі ў зялёную клетку.
– У вас усё? – сухавата запытаў ён.
– А мы бачылі, як манах ідзе па вадзе, – заявіў няўрымслівы малы.
– Ну, разыходзьцеся, разыходзьцеся, – ужо зусім суха прамовіў Мікалай Лявонавіч. – Я пагляджу, што гэта, прыходзьце заўтра, добра?

У гэты час з таго боку вёскі пачуліся аддаленыя крыкі, гамана і неўзабаве з'явілася гурма дзяцей.
– Бачылі, бачылі! – пераконвалі яны адзін аднаго. Падбеглі да настаўніка і хлопцаў.
– Мы манаха бачылі!
– Ды якога манаха? Ціха вы, у мяне малыя спяць. Каго вы бачылі?
– Ён каля клуба стаяў, такі чорны, што малпа! Высокі... Валасаты... – наперабой загаварылі малыя, задаволеныя, што настаўнік не гоніць іх дахаты спаць, а вось так распытвае. – Васька Акулінін першы ўбачыў...
– Не, я першы... – перабіў нехта расказчыка. – Валасы – як у каня грыва!
Тут у пакоі з'явілася з ручнікам, намотаным на галаву, жонка Мікалая Лявонавіча.
Яна выкладала ў школе геаграфію і лічылася жанчынай строгай і ўладнай.
– Што такое? – абурана зашаптала яна. І гэты яе шэпт гучэў званчэй за галасы дзяцей. – Малыя спяць, а яны сабраліся пад акном. Марш па хатах! Хто тут, чые гэта? У школу скора.
І хоць да школы быў яшчэ добры месяц, настаўнічыхіныя словы паўздзейнічалі так, нібы ў тую школу трэба было ісці заўтра. Падшыванцы неяк незаўважна растварыліся ў змроку. Вельмі ім не хацелася трапіць такой строгай настаўніцы на вочы. Адышлі ў змроку хлопцы і Лена.
Жонка настаўніка ўцягнула фіранкі ў пакой, па-гаспадыньску сцепанула іх ад вільгаці і знадворнага пылу і шчыльна і гучна зачыніла акно.
Святло ў пакоі настаўніка пагасла.
Мікалай Лявонавіч адразу, як разышліся дзеці, лёг спаць. Але паведамленне дзяцей і незвычайная скурачка, якую яму перадаў Пятрук, выбілі яго са сну.
Настаўнік Савіцкі, якога дражнілі Троцкім, быў ужо чалавекам немаладым, але яшчэ далёкі да сталых гадоў – ён толькі ўвайшоў у самую сярэдзіну гадоў, быў энергічны і нястомны гаварун. Як усе фантазёры меў вузкія і тонкія, нават прыгожыя рукі. І, як і ўласціва для такога тыпу людзей, рабіць што-небудзь гэтымі даволі далікатнымі рукамі, майстраваць там, рамантаваць не любіў, ды ў яго гэта і не асабліва атрымлівалася. Што, зразумела, выклікала пэўныя завёрткі з жонкай, але веданне, а галоўнае ўменне гаварыць кампліменты і бялява-чупрыністая галава гэтыя завёрткі раскручвалі. У студэнцкія гады Мікалай Лявонавіч любіў і часта бываў на археалагічных раскопках – на палявых даследаваннях. Нават да гэтага часу ў яго меліся сувязі ў сур'ёзных гістарычных навуковых колах. Тлумачылася гэта яшчэ і тым, што шмат хто з ягоных аднакурснікаў выбіўся ў вялікія людзі, зрабіўся вучоным. Савіцкі чамусьці не выбіўся, ці не захацеў, ці ўся энергія пайшла ў фантазмы.
Сон не ішоў. Асабліва не даваў спакою скураны ліст. Ён і напраўду быў падобны на стары пергамент. Такія лісты з вырабленай скуры яму даводзілася трымаць у руках, калі ён быў яшчэ студэнтам.
Настаўнік доўга варочаўся на сваёй канапе, потым не вытрымаў, падняўся, уключыў настольную лямпу і стаў уважліва разглядваць матэрыял знаходкі. Сумненняў не было – гэта і напраўду быў старажытны пергамент. Праўда, гэта магла быць і ўмелая падробка. На пергаменце быў напісаны стараславянскай вяззю не зусім роўнымі літарамі нейкі тэкст, злітны, без значных прамежкаў паміж словамі. Яго было цяжка з першага разу разабраць, расчытаць сэнс, але па ўсім відаць, гэта быў нейкі рэлігійны твор. Пры больш уважлівым вывучэнні пергаменту настаўнік пераканаўся, што гэта быў так званы палімпсест, гэта значыць, што пергамент ужываўся некалькі разоў, а папярэднія тэксты выскабліваліся.
«Калі вось гэты палімпсест ды невядомы ў навуцы? – пранеслася думка. – Можна і публікацыю ў якім часопісе зрабіць. А там, глядзіш, раптам на адкрыццё пацягне? Так, куды раней званіць – у Мінск, ці ў Гомель?»
Настаўнік расхваляваўся, асцярожна, каб не разбудзіць жонку, якая спала і не падазравала аб магчымым навуковым прарыве, выйшаў на вуліцу.
Па вуліцы, блізка каля платоў, нехта ішоў. Ішоў і гучна сам сабе нешта мармытаў. Настаўнік наструніўся – самі па сабе ўспомніліся словы дзяцей пра манаха.
Настаўнік насцярожана падышоў бліжэй да плоту. Але па вуліцы, добра-ткі пахітваючыся, ішоў знаёмы ўсім вяскоўцам чалавек – брыгадны конюх Макар. Гэта быў старых гадоў чалавек. Нават вельмі старых. Яшчэ за даваенным часам служыў у польскай кавалерыі, пехатой прыйшоў з акупіраванай фашыстамі Польшчы. Любімай прыгаворкай Макара былі словы «кручэ варкочэ». Гэта былі радкі з нейкай польскай вайсковай песні. Ніхто, а хутчэй за ўсё і сам Макар, не ведаў, што яны абазначаюць.
Цяпер конюх, відаць, затрымаўшыся каля сваіх коней, якіх вельмі любіў, вяртаўся так позна дахаты. Убачыўшы настаўніка, Макар спыніўся, злёгку хітнуўся і ціха прамовіў:
– Пане настаўніку, Лявонавіч! Нейкі ж дурань малодому жарэбчыку абрэзаў грыву.
– Эйш ты! – выказаў здзіўленне і неадабрэнне настаўнік.
– Ды добра вычыкаў. Ах ты ж «кручэ варкочэ»! Спаскудзіў каняку, – жаліўся Макар.
– Нягоднік! – згадзіўся настаўнік.
– І такую каняку! А вы іх, гэтых гіцляў, у школе вучыце ды вучыце... Сказаўшы так, маючы на ўвазе

дзяцей, а не «каняк», Макар не зусім цвёрда ступіў і пайшоў далей, мармычучы пра сваю нечаканую бяду:
– І ў Польшчы быў, і пры Саветах служыў, але ніколі не бачыў, каб коням адрэзвалі грывы. Абы-што робіцца на свеце, «кручэ варкочэ».
Мікалай Лявонавіч ахапіў рукой запаленыя, стомленыя ад бяссоннай ночы вочы, пацёр іх.
– Я яму і авёс, я яму і грабеньчыкам расчэсваў. Аж блішчала грыва. І на табе! Рукі пакласці на калодку і паабсякаць! А тут бачыш, настаўнік стаіць сабе... Важны, як польскі памежнік!
«Манах, пергамент, «кручэ варкочэ»... – круцілася ў галаве. – Не, трэба паглядзець у польскім слоўніку, што азначаюць гэтыя словы. Гэтулькі гадоў чуць, і не паспрабаваць даведацца... Не, не цікаўны мы народ, славяне...»

**5**

На другі дзень пасля тых нібыта неверагодных, а насамрэч – проста незразумелых падзей, Пятро Камар з'явіўся на вясковай пошце, як толькі яна адкрылася, узяў бланк тэлеграмы і напісаў наступнае: «Тэрмінова прыязжай Творацца цуды».
Унізе ён паставіў адрас свайго брата Паўла, які працаваў у будатрадзе, недзе ў Мінскай вобласці. Загадчыца пошты цётка Тэкля механічна прачытала тэлеграму, пералічыла словы, назвала суму, якую трэба было заплаціць, і тут да яе дайшоў сэнс напісанага. Яна з падазронасцю паглядзела на Пецю паверх акуляраў. Вочы ў яе былі колеру алоўкавага графіту.
– Што ты напісаў? Пеця паціснуў плячамі, маўляў, што?
– Якія цуды? Якія цуды творацца? – крыху раздражнёна вымавіла загадчыца пошты.
Пеця хацеў гэтак жа раздражнёна адказаць, што ніякія, бо ён ні пра які там цуд нічога не паведамляе.
– Вы не пашляце гэтакую тэлеграму?
– Не. Забірай яе, – адказала загадчыца і дзелавіта паклала запоўнены бланк пад шкляны экран, за якім сядзела.
– Я ж не пішу, што месяц з неба зваліўся, – спакойна сказаў Пеця. – І што ён ляжыць на гародзе сярод гарбузоў... Я нічога такога не пішу!
– Не прыдурвайся, Пеця, ты дарослы хлопец.
– Вось таму, што я дарослы, як вы кажаце, магу я паслаць тэлеграму?
– Дарослыя не пасылаюць такіх тэлеграм.
– Якіх? Хвёкла Іванаўна, што вы разумееце пад словам «цуд»?
– Пеця, ты вялікі хлопец, – ужо асуджальна сказала загадчыца, якая не любіла, калі яе называлі Хвёклай. Яна любіла, каб яе называлі або проста Іванаўна, або яшчэ прасцей – цётка Тэкля. Таму яна адпомсціла:
– Ідзі, Пяцюньчык, чым карысным займіся. Кніжку якую пачытай, ці рыбы налавіце... Я занятая, ідзі-ідзі.
Пеця адчуў, як ад гэтай дзіцячай яшчэ мянушкі-назову ў яго ажно пабурачкавелі вушы. Ён узяў ручку і закрэсліў у тэлеграме два словы. У тэксце засталося «Тэрмінова прыязджай».
Загадчыца нервова смыкнула тэлеграму да сябе, стрэльнула вачамі па закрэсленым, буркнула:
– Няма чаго рабіць... – і налічыла грошы. Потым падсунула да сябе тэлефон, каб перадаць усечаную тэлеграму на тэлеграф, і, змушаная рабіць тое, што супраць яе волі, а галоўнае, як яна лічыла, супраць здаровага, цвярозага сэнсу, зусім ужо раззлавалася.
– Ён табе так і прыедзе. Ён жа ж на рабоце, Павел твой. Ён у будатрадзе. Гэта табе не хіханькі. Што, я не ведаю, што пра цябе з раніцы кажуць? Манаха бачыў? Усохлага? З дупла выпаў... Кія на вас няма, біць вас няма каму.
Але Пеця ўжо выходзіў з пошты. «Пяцюньчык» быў адпомшчаны.
Дома Пецю ўжо чакаў усхваляваны Мікалай Лявонавіч.
– Дзе вы гэта ўзялі? – былі ягоныя першыя словы. І настаўнік паказаў Пецю скурачку.
Пятрук падрабязна, не прапускаючы нават самай нязначнай дэталі, расказаў пра ўчарашняе. Ён нават не прапусціў, у які момант заходзіў за хмаркі месяц і ў які выходзіў, як заўзята плёхкала рыба і як таўклі мак камары.
– Ідзём да дуба. Гэта ўжо сур’ёзна, – раззлавана сказаў настаўнік, выслухаўшы Пецю.
Каля дубовай калоды іх ужо чакалі. Па-першае, сам гаспадар сотак, Колб, па-другое, там была Лена, якая ўважліва разглядвала сляды на беразе рэчкі. Цікаўныя суседзі і не меней цікаўныя дзеці, якія вось так рана папрыходзілі паглядзець на месца нечуванага здарэння, дапаўнялі зборню.
Мікалай Лявонавіч абышоў дуб, зазірнуў у дупло, пакалупаў там пазногцем, паўзіраўся ў зямлю пад дуплом.
Абследаванне нічога новага не дало. Загадка заставалася.
Пасля здарэння прайшло каля двух тыдняў. Чуткі і плёткі па вёсцы хадзілі самыя неверагодныя. Ужо

нехта кляўся і бажыўся, што бачыў іншапланетнікаў, іншыя сцвярджалі, што пад вёскай атабарыліся сектанты. Зразумела, расказвалі і гісторыю, блізкую да той, якой калісь частаваў вучняў настаўнік гісторыі – пра манаха, які праспаў тысячу гадоў у дубовай калодзе, заліты мёдам. Казалі яшчэ, што да старога Камара, Пецевага бацькі, з Аўстраліі ці Канады прыехаў родны старэйшы брат. І што гэты ягоны брат быў пастрыжаны на чужыне ў манахі, так пасціўся, што высах у трэску, і вось зараз прыехаў ледзь жывы на радзіму дажываць. Але Камар запатрабаваў з яго грошы, а ў таго манаха не аказалася ні капейкі.

Бо, маўляў, маскоўскія ўлады ўсю ягоную пенсію ў тых канадскіх ці аўстралійскіх далярах так пералічылі на савецкія рублі, што выйшла смешная сума, ад якой той манах адмовіўся. І цяпер бедны манах, як не было дзе жыць, падаўся некуды на Волхаўскія балоты. А ўночы ходзіць па гародах і дзе ў каго морквіну выцягне, у каго слоік з малаком увалачэ.

Было ў разгары жніво. Часу слухаць і верыць розным показкам не знаходзілася, на палях гулі камбайны. Пятрук кожны дзень чакаў свайго брата-студэнта, якога лічыў самым разумным чалавекам на свеце, і які, урэшце, дасць элементарнае тлумачэнне незразумелай з’яве. Чакалі Паўла і Лена з Міхасём. Праўда, Павел прыслаў ліст, што не можа вырвацца з будатрада нават на адзін дзень, але ўсяляк шукае такой магчымасці.

Дні ішлі за днямі, Павел усё не ехаў, Мікалай Лявонавіч слова за словам расшыфроўваў скурачку, хлопцы і дзяўчына хадзілі працаваць на калгасны зерняток, і гісторыя, якая так бурна пачалася і так уразіла вяскоўцаў, стала памалу забывацца.

Неяк вечарам каля вясковага клуба моладзь сабралася на танцы. Але для танцаў пакуль было ранавата, ды і загадчык клуба яшчэ не прыйшоў з дому і не прынёс пласцінкі з папулярнымі мелодыямі. Паміж юнакамі і дзяўчатамі ішла размова – нехта ўспомніў пра нядаўняе такое дзівоснае здарэнне.

– А я вам кажу, што гэта было! – даказваў адзін хлопец. – Вы ж тады фільм глядзелі, а мы на вуліцы стаялі. Чуем – крычыць нехта, дзяўчына нейкая. Крычыць, аж заходзіцца. Мы насцярожыліся і туды…

– Во залівае! – крыва пасміхаючыся, казаў хлопец з тых, якія нічому не вераць. Але распавядальнік не звяртаў на яго ўвагі і працягваў:

– Пабеглі туды, глядзім – Ленка Заранок бяжыць. Мы да яе: што здарылася.

Яна так і так, гаворыць, манах з дупла выпаў.

Той хлопец, што перабіваў распавядальніка, тоненька захіхікаў. Іншыя слухачы тарганулі смехуна за кашулю, маўляў, не перабівай.

– Так і так, кажа Лена, манах з дупла выпаў, трэба ратаваць, а то памрэ, худы надта. Кажам, які манах, што ты вярзеш? А яна – не, бяжыце да настаўніка, у яго тэлефон, выклікайце «хуткую». А мы ж не верым! – распавядальнік падняў руку ўгору. – Вядзі, кажам, паказвай, дзе ён? Яна і заводзіць нас на рэчку. Гляджу, Пеця Камароў нібы ўчаўрэлы...

– Ты там быў? – перабіў растабары Міхась Сінчук. Як Пецеў таварыш, ён не хацеў, каб чапалі імя сябра.

– Не быў, але хлопцы былі, малыя, за агародам Колбавым. Прыбеглі туды, а там адзін Пятро збянтэжаны стаіць, – крыху паправіўся распавядальнік. – Зніякавелы, ашаломлены. Пытаем: дзе твой манах? Ён і паказвае – во, па вадзе пайшоў.

– Па вадзе, ці па суху! – Зноў не вытрымаў весялун. – Як па сухім! Ну ты і майстар байкі плесці. Шкада, Камара Пеці няма, даў бы ён табе выспятка... Такія кулі ліць...

– Ды змоўч ты, хай чалавек раскажа, – стрымлівалі весялуна дзяўчаты з суседняй вёскі, якія сёння прыйшлі на танцы і якія нічога не ведалі пра здарэнне.

– І што ж вы думаеце, глянулі мы туды, куды Пецька паказвае, а ён, той манах, і ідзе па рэчцы, як па сухому, шпарыць, во, як па дарозе, рыхтык там брукаванка.

– Дык мо там які прывід... – з сумневам у голасе перабіла адна дзяўчына.

– Вось бачыце! – абурыўся расказвальнік. – Як прывід – то гэта і нармальна, гэта можна вытлумачыць, а як манах з мінулых стагоддзяў, дык гэта вам не верыцца.

Кажу вам, паверце, на ўласныя вочы бачыў, як чалавек ішоў пасярод ракі па вадзе.

– Вечарам, уночы, лічы, ты гэта бачыў? – зноў не вытрымаў Міхась. –

Пытаюся – ці быў ты там?

– Ну і што што ўночы? Тады месяц свяціў, хоць іголкі збірай. Гэта па-першае, а па-другое, Міхась, вы пабеглі з той скурачкай да настаўніка, а мы выйшлі з клуба і пайшлі на рэчку...

– Ну і што далей было? Залівай далей... – рагаталі дзяўчаты з суседняй вёскі.

– Што далей? Адзін з нас, Віцька Петрушэня, зняў адзежу і кінуўся ў ваду, але, бедалага, далёка не праплыў, бо забаяўся адзін. Што б ён з тым манахам рабіў?

– Пагаварыў бы з той муміяй...

– Дык вось, нам так тады страшна зрабілася. А галоўнае – сабакі не брэшуць.

Каб нехта чужы быў на сяле, тутэйшыя блахачы ўзнялі б такі вэрхал...

– А як ён усё-ткі выглядаў? – дзяўчат раз’ядала цікаўнасць.
– Як выглядаў? Страшны, чорны, усё адно мумія егіпецкая...
Тут на дарозе з боку далёкай чыгуначнай станцыі з’явіўся малады чалавек у светлай кашулі, з тоўста напакаванай спартыўнай сумкай праз плячо. Час быў такі, што акурат цяпер, калі хто прыязджаў на вечаровым цягніку, і прыходзілі ў вёску.
– Павел! – закрычаў Міхась. – Як мы цябе чакаем.
Хлопец, якога Міхась назваў Паўлам, падышоў да клуба, павітаўся за руку нават з дзяўчатамі, кожны раз жартам спрабуючы тыя ручкі пацалаваць, але дзяўчаты рукі вырывалі.
– Як жыццё? Што тут у вас за рада паўстанцаў у Мілавідах?
Гісторыя пра манаха была паўторана з новымі дэталямі і падрабязнасцямі.
– Уга! Цікавая навіна. Дык, кажаце, мумія ўваскрэсла? – спытаўся Павел, паціраючы бровы. – А ведаеце, што я вам скажу?
Усе моўчкі глядзелі на студэнта. З твару і ростам ён быў як Пятро, у плячах нават вузейшы, худы і загарэлы.
– Я ведаю, дзе гэты манах цяпер.
– Дзе?
– Так я вам і скажу. Вось занясу свае ванзэлкі, і мы туды сходзім.
– Ноччу? Куды?
– Пачакайце хвілін пятнаццаць. Перакушу дома, вазьму Петрыка і мы выведзем святога інака на чыстую ваду, далібог. Я ведаю, дзе ён. Нюхам чую. І пакліч, Міхаська, Лену сюды. Ёй будзе цікава.
Павел узваліў сумку на плячо і падаўся дахаты. Усе прысутныя абрадавана ўздыхнулі.
– Вось што значыць вучоны чалавек, сталічны студэнт. Прыйшоў, і за пяць хвілін развёў бяду рукамі, – сказаў Міхась, калі Павел адышоўся.
– Гэта Пецькаў брат? – спытала дзяўчына з суседняй вёскі.
– Пецькаў... У Мінску вучыцца. На гісторыка.
– Так, ён нічога, высокі.
– О! Ён у нас – што ні гавары – светлая галава.
– А мне казалі, што ў Пецевага брата доўгія валасы... А гэты як зэк пастрыжаны.
Міхась сумеўся. Сапраўды, ён і не звярнуў увагі на Паўлаву прычоску.
Студэнтавы даўжэзныя светлыя валасы шмат у каго былі прадметам зайздрасці, бо ў школе не дазвалялася насіць доўгія прычоскі. І вось – лысы, і ўжо даўно, бо паспела адскочыць кароткая шчотка новых валасоў.
– Будатрад вам не семінарыя, – патлумачыў Міхась. – Там не параскашуеш.
У бетонамешалку як зацягне валасы. Таму загад усім стрыгчыся пад нуль! Вы стойце тут, а я схаджу па Лену Заранчыху.

Не, не варта было звязвацца з ім, з манахам. Для гэтага трэба мець вопыт, сілу.
Уяўляць манаха, жыццё ягонае, якое так і не прагледзеў скрозь бясконцыя гады, цяжка, складана. Паспадзяваўся на лёгкі поспех...
З чаго ўсё пачалося? З гульні, з уяўленняў, з успамінаў. З таго малога чорціка – самага сапраўднага, – які дапамог сёе-тое зразумець.
Гульня пачалася з вяртання ва ўласнае папярэдняе жыццё. Цікавая рэч – што ў маладых гадах можна ўспомніць пра дзяцінства? Стоп! Сваё, ці манахава? Вечны холад. Курная хаціна. Замест коміна – дымны мех. Калі ў печы выпальвалася, заткалам затыкалі печ, а мех, які быў падвешаны пад столь, і праз які дым і цяпло выходзілі у неба, закручвалі і завязвалі. У хаце адразу рабілася чадна і цёпла. Ад чаду выскоквалі на вуліцу, на снег. Адзежы не было, лапці вечна мокрыя. Летам хораша, летам выдатна. Усё наўкола ў зараслях галешніку, стажкі вакол хлявоў і хат.
Увесь свет у алешынах – нізкіх, карчаватых.
Бацька быў майстра, увесь час стругаў, пілаваў. За капейкі, бо не асмельваўся простым людзям заломваць цану. Ці былі тады капейкі? Эх ты, гісторык. Грашы, шэлягі. Аднойчы бацька насыпаў у мех стружак і загадаў вынесці за поплаў, праз гаць прайсці і высыпаць. Выкінуць у карчы, як казалі. І тады пабег. А ўжо не так светла было. Яшчэ не вечар, але ў тым галешніку за гаццю змрачнавата. Пабег, асільваючы незразумелы страх, і стаў высыпаць пад куст альхі, якая каранямі была ў вадзе, бо лета было толькі напачатку, і яшчэ стаяла вада ў равах, у карчах. Тады і здарылася тое, што памятаў усё жыццё, што ніколі ні пры якіх абставінах не выходзіла з галавы, сядзела і будзе сядзець вечнай стрэмкай.
Ён раптам убачыў проста перад сабой на вузлаватых, белых у прыцемках альховых карэнішчах... чарцяня. Самае сапраўднае чарцяня. Яго было цяжкавата разгледзець, бо святла не хапала тут, пад галінамі альхі. Спачатку ён падумаў, што гэта нейкі звярок. Велічынёй з ката. Або такі кудлаты смешны маленькі

сабачка. Але істота сядзела так, як можа сядзець толькі чалавек. Тое, што можна было назваць тварам, было невыразным – нешта і кацінае, і сабачае... Ці то вушкі на галоўцы, ці то рожкі. Толькі вочы сумныя і праніклівыя. Яны не свяціліся, як можна было меркаваць, што вочы ў падобных істот свецяцца злавесным святлом. Яны адбівалі святло неба, проста цьмяна блішчэлі. І выклікалі адчуванне журботы, бяды, нават нейкага мілажалю.

Ён тады крыкнуў, кінуў мех, і пабег прэч. Дома яго трэсла, мову адняло. На роспыты бацькі, калі яго крыху адпусціла, заявіў, што бачыў чорта.

– Ты ў карчах бачыў чорта? – сур'ёзна і разам з тым весела перапытаў бацька і крыва ўсміхнуўся. – Ідзём, пакажаш, дзе ты яго бачыў.

Ісці ён наадрэз адмовіўся. Бацька ўзяў малодшага сына, яны ўзброіліся кіямі і разам схадзілі на поплаў па кінуты мех. Ніякага чорта яны там не ўбачылі.

Потым яго вадзілі да шаптухі выліваць страх. Вылілі – ён перастаў баяцца поплава, альховых кустоў. Гісторыя пакрысе забылася. Яму проста не напаміналі пра недарэчны страх. Але ён памятаў. Стрэмка сядзела. І чорцік не раз з'яўляўся яму ў снах: моўчкі сядзеў на белаватых альховых карэнішчах і з цьмянай жальбай глядзеў на яго.

Калі ён вырас і вывучыўся, візія гэтага чорціка з жаласлівым позіркам нікуды не знікла. Яна зрабілася дэталлю, элементам ягонай свядомасці. Вобраз чорціка не мог выцесніцца з галавы нічым. Праўда, ён і не перашкаджаў яму – быў бяскрыўдным.

Ніякай ні карысці, ні шкоды гэты вобраз не прыносіў.

Ён многа і не думаў пра яго – ёсць у галаве, у свядомасці ў людзей розныя вобразы – дык і што з гэтага? Вобраз гэтага чорціка нават смяшыў яго, забаўляў.

Але ён не расказваў пра яго. Нікому і ні пры якіх абставінах. Паспрабуй раскажы каму?! Што падумаюць? З часам і ўзростам вобраз чорціка знікаў, амаль забываўся, амаль выветрываўся з галавы.

Значна пазней, калі вырас і стаў чуць і разумець выразы пра так званыя «белага каня», «белую гарачку», ён зноў успамінаў пра свайго бяскрыўднага сябручка. І ўжо тады, калі стаў разважаць пра гэта, пачытаў сякую-такую адмысловую літаратуру, і не навамодную, а старажытную, якой тысяча ці паўтары гадоў, раптам усвядоміў, што гэта быў не чорцік, але... ягоны ўласны анёл. Гэта значыць вобраз той душэўнай сілы, энергіі, якая была ў ім, як чалавеку, і якой надзяляецца кожная жывая істота.

Вось што тое было – вобраз сілы! Мала таго, гэта быў не анёл тагачаснага дзіцячага ўзросту. Гэта быў анёл цяперашніх ягоных гадоў, яго, дарослага чалавека, калі душа заморана мярзоццем так званага дарослага жыцця. Ён тысячы разоў вяртаўся ў сваёй памяці ў дзяцінства, калі адчуваў сябе бязвінным, чыстым, светлым. Уласна, істотай, якая не мела ніводнай заганы. І гэтае вяртанне нейкім чынам праходзіла праз таўшчыню пражытых гадоў, матэрыялізавалася, і ён глядзеў вачамі дарослага, сталага чалавека на самога сябе – маленькага, бязвіннага, абсалютна чысценькага.

А што бачыў той, на якога ён глядзеў? А тое і бачыў, што ўяўляла сабой ягоная душа цяпер – чарцяня!

Вось, аказваецца, чаму ён тады не пазнаў свайго ўласнага анёла, які прыйшоў да яго праз пражытыя гады паглядзець на свой уласны пачатак! Нібы магутная рака вяртаецца да маленькай крынічкі, струменьчыка паглядзець, з чаго, уласна, пачынаецца.

І наколькі чысцюткая вада ў гэтым пачатковым струменьчыку, настолькі і брудная, з'індустрыялізаваная вада на вытоку ракі. Раса, дыяменты, празрысты бальзам у вытоку – бруд і смурод у яе эстуарыіі, вусці, дзе яна вылівае свае струмені, уласна, і не вады, а амаль мёртвага хімічнага раствору ў мора.

Выходзіць, так робіцца і з чалавечай душой: ён у дзяцінстве ўбачыў свайго дарослага анёла і прыняў яго за чорта?! Дзіцятка, хлопчык – чысты душою – і чорт, хай сабе малы, у немаладыя гады.

Выходзіць, так. І што тады рабіць? У чым загадка гэтай неадпаведнасці? Дзе выйсце? І навошта ён, гэты інструментарый думання, яму дадзены?

Павел не прыйшоў да клуба ні праз пятнаццаць мінут, ні праз паўгадзіны.

Міхась выклікаў Лену, і яны спыніліся насупраць Паўлавай хаты, сталі чакаць, калі выйдуць хлопцы. Неўзабаве выйшаў Павел, адзін. У руках трымаў невялікі электрычны ліхтарык.

– Пятра няма дома, усё на рыбе боўтаецца, таму я і затрымаўся, чакаў яго, – сказаў ён і звярнуўся да Лены замест прывітання. – Ты не ведаеш, у якім месцы ён ловіць?

Звяртаўся з падтэкстам, бо ведаў, што Пятрук у гэты час мае з Ленай спатканне – шмат што чуў пра іх. Дзяўчына ўспыхнула, але авалодала сабой, прамовіла:.

– Ён, гэта... чарвякі ў абед капаў, але нічога не гаварыў, куды пойдзе...

– Ды на азярынах, па той бок ракі недзе прападае, – выручыў Лену Міхась.

– І гэтак позна? Добра, пойдзем без яго. Вы не здагадваецеся куды?

Лена і Міхась не здагадваліся.

– У царкву! – Павел рассмяяўся. – Людцы! Што тут такога? Царква – гэта не дом смерці, як вам

унушылі з дзяцінства. Гэта дом жыцця!

Што ж, царква дык царква. Ісці было недалёка. Невялічкая царква знаходзілася крыху ўбаку ад вёскі на цесных могілках, густа і без ладу зарослых бэзам, тоўстымі дубамі і бярозамі. Каб не сабіраць цікаўных малых, пайшлі агародамі.

**6**

Пакуль ішлі, Павел няспынна гаварыў:

– Мае вы дарагія, ведаеце, што такое царква? Ну, Лена, адкажы?

– Культавая пабудова... нашых продкаў.

– Дакладна, нават вычарпальна. А што яны ў царкве рабілі, нашы продкі?

– Як што? Маліліся, мерцвякоў адпявалі, – уступіў у размову Міхась.

– Не мерцвякоў, а нябожчыкаў, – ціха папправіла Лена.

– Правільна, але... – Павел пераклаў ліхтарык у левую руку. – Аказваецца, мы з вамі знаходзімся ў сапраўдным энергетычным моры, – Павел падняў палец правай рукі. Гэта быў ягоны любімы жэст. Праўда, можна было падазраваць, што гэты жэст ён пераняў у іхняга настаўніка гісторыі – Мікалая Лявонавіча.

– Царква ёсць цэнтр гэтага энергетычнага мора. Вось так! – Павел з трыумфам паглядзеў на хлопца і дзяўчыну. – Далей, вы чулі пра вампіраў і донараў?

– Пра якіх? Тых, што кроў смокчуць? Кажаноў? – здзівіўся Міхась.

– О-о-о! Цемра. Слухайце: мы проста плаваем у акіяне энергіі. Людзі здольны абменьвацца энергіяй, сілкавацца чужой, падмацоўвацца энергіяй космасу, усяго сусвету. З блізкімі па духу людзьмі нам лёгка і наадварот.

– Праўду кажаш, – згадзіўся Міхась. – Мне...

– Старажытныя славяне, нашы продкі, – перабіў хлопца сталічны студэнт, – не былі класічна адукаванымі, як па цяперашніх мерках. Але яны мелі тонкую згарманізаванасць з прыродай і напоўніцу чэрпалі энергію, яны называлі яе жывіяй, з лесу, з дрэў, з лугоў, з рэк, словам, з роднай зямлі. Таму яны і абагаўлялі родную зямлю, любілі яе...

– Абагаўленне сіл прыроды – прымітыўная рэлігія дрыгавічоў, крывічоў, палачан, – падала нясмелы голас Лена.

Павел спыніўся. Што за вінаваты галасок? Ці гэтае дзяўчо саромеецца яго?

Ён зноў падняў палец і прадоўжыў ужо тонам прафесійнага лектара:

– Э-э! Прымітыўная рэлігія? Заўважце, якая падмена паняццяў! За бога лічыць нейкую сілу прыроды гэта адно, а вось сілы прыроды лічыць божымі – гэта іншае!

Ёсць монатэізм, а ёсць політэізм. Ат, лепш слухайце пра вампіраў...

– Ты не закручвай, – пакрыўдзіўся Міхась. – Мы толькі ў дзевяты клас перайшлі, а ты поліэтылен, монапалімер... Цьфу...

– Добра-добра, – засмяяўся Павел. – Слухайце: вампірам робіцца той, хто канчаткова заблытаўся ў жыцці, засмяціў свае энергетычныя канальчыкі. Вось такі чалавек і крадзе энергію ад іншых. Крадзе падсвядома, не ведаючы, што ён злодзей.

– А як ён гэта робіць? – здзівіўся Міхась.

– Робіць іншага чалавека вінаватым. Маўляў, я люблю цябе, а ты... Або паслужыць чым чалавеку, а потым вымотвае душу, – бадзёра працягваў Павел. –Начальнік, калі дае падначаленаму прачуханца, зараджае свой падселы акумулятар.

І так паўсюдна: уладарная жонка смокча жывію з «прыціснутага» мужа, цешча на пару з паслухмянай дачкой высмоктваюць энергію з зяця-мужа, – Павел перайшоў на шэпт, бо яны зайшлі ў брамку могілак. – Дзіцяці, скажам, дадуць цукерачку і як засюсюкаюць... А гэта ж вампір так забірае энергію! – Павел спыніўся. – Ну, вось мы і прыйшлі.

– Ты гаварыў проста як... наш Троцкі, – з захапленнем і ў той жа час з расчараваннем, прашаптаў Міхась. – Няўжо ты сур’ёзна гэта расказваў?

– А то не! Вампір за сваё смактанне энергіі расплачваецца разгарманізацыяй з прыродай і парушэннямі ў арганізме. Донар жа, ад якога забралі энергію, невытлумачальна смуткуе, баіцца адзіноты, губляе цікавасць да жыцця. Або спрабуе кампенсаваць знікненне энергіі праз штучныя крыніцы: алкаголь там, нарката.

Працягваць? Пацярпіце, да канца лекцыі засталося мала.

– Працягвай, – махнуў рукой Міхась.

– А вось медытацыя, аўтатрэнінг, – шаптаў Павел, узіраючыся ў цьмяны сілуэт царквы. – Вяртанне да прыроды, да музыкі... – Павел некалькі секунд стаяў, нібы не адважваючыся рушыць да царквы, потым ступіў крок і пайшоў, упэўнена прабіраючыся сярод старых пахіленых крыжоў.

Дрэвы і кусты бэзу нібы заснулі, не варушыліся, толькі ў вершалінах слаба шумеў ветрык.

– Увогуле, – усё шаптаў студэнт, нібы не звяртаючыся да Міхася і Лены, якія з перасцярогай прабіраліся за ім, – розныя віды мастацтва – невычэрпныя паклады біяэнергіі...
– Ой, – ціха войкнула Лена. – Там нешта свеціцца.
– Дзе? – напалохана спыніўся Міхась.
Лена паказала на гушчу бэзавых хмызнякоў, за якімі і павінна была быць царква. Павел і Міхась уважліва паглядзелі туды, куды паказвала Лена.
– Гэта шкло блішчыць у царкве. Адбівае святло, – упэўнена патлумачыў Павел і вярнуўся да тэмы. Ён, відаць, не мог ад яе адчапіцца: – І вось для чаго я гэта ўсё расказваю. А для таго, што храмы, старажытныя культавыя збудаванні, абразы – крыніцы самай што ні ёсць канцэнтраванай энергіі. І наша царква – сапраўдны рэактар па яе вытворчасці... Ну, гэта і праўда шыбка блішчыць...
– А нам у школе пра рэлігію іншае расказвалі... – вінавата прамовіла Лена, уражаная тым, пра што гэтак натхнёна расказваў Павел.
– О-о-о! Нам у школе многа чаго расказвалі... Асабліва Мікалай Лявонавіч. Вы, можа, яшчэ ў камунізм верыце?
– А што? Яго не будзе? – неяк жаласліва прамовіла Лена.
– А спытай у сваіх бацькоў, яны табе адкажуць, – засмяяўся Міхась.
– Ціха ты... – асадзіў яго Павел. – Царква блізка, і калі там манах-мумія сядзіць – пачуць можа. Сцішымся... Я прывёў вас сюды, бо ўпэўнены, што калі вы гаворыце праўду, манах павінен быць у першую чаргу тут, у царкве, дзе многа ўласцівай яму энергіі.
– Дык Усявышні ж паўсюль... – неяк няўпэўнена прамовіў Міхась.
– Сінчук! – прашыпеў Павел. – Манаху дах над галавой мець трэба?
Міхась прамаўчаў. Царква ўяўляла сабой будыніну на невысокім падмурку са стромымі схіламі даху. Будавалі яе яшчэ на пачатку XX стагоддзя, відаць, з невялікіх сродкаў, бо была яна надзвычай малой. Усё у царкве было невялічкае: і купал царквы маленечкі, проста архітэктурна намечаны, і крыжы на ім, і званіца мініяцюрная, і акенцы ў сценах, абшаляваных крохкімі ад часу дошкамі. Затое дрэвы каля царквы проста раскашавалі – дубы спаборнічалі з клёнамі і бярозамі ў таўшчыні. Дрэвы раслі густа, адно пры адным і проста не верылася, што яны могуць вось такія магутныя адно пры адным падняцца над зямлёй.
Маладыя людзі падышлі да царкоўных сцен, прыслухаліся. І толькі тут заўважылі, што блішчыць не шыбка ў акне, а цьмяны, кволы водблеск святла тачыўся з высока паднятага закратаванага акенца.
– Я ж казала... – прашаптала Лена.
– Ці-ха! – пачуўся ў адказ Паўлаў шэпт. – Мы яго зачынім у царкве, потым паклічам людзей – сведкаў. Не выключана, што гэты манах валодае паранармальнымі здольнасцямі – моцным гіпнозам там, ці яшчэ чым іншым. Ты ж, Сінчук, казаў, што ён па вадзе хадзіў...
– Ат! – узмахнуў рукой Міхась. – Мала што я казаў... Ідзёмце да дзвярэй.
Яны падышлі да дзвярэй, шчыльна зачыненых і зашчэпленых з сярэдзіны. Але Міхась націснуў на іх, і намацаў зашчапку.
– Каб рука танчэйшая... Лена, ты паспрабуй...
Лена працягнула руку і ціхенька адшчапіла дзверы. Яны прайшлі ў прытвор – невялічкі калідорчык перад яшчэ аднымі дзвярамі, якія таксама былі зачынены, але праз шчыліны праходзіла цьмянае святло.
Пасярод памяшкання царквы, перад амбонам, у шкляначцы гарэла, гучна патрэскваючы, свечка. Вакол свечкі, сашчапіўшы рукі на грудзях і прыціснуўшы локці да бакоў, расхаджваў нейкі кудлаты чалавек і нешта мармытаў. Хлопцы і дзяўчына прыніклі да шчылін у дзвярах і стаілі дыханне.
Тое, што яны ўбачылі, прывяло іх у страшэннае ўзрушэнне і здзіўленне, і нават багавейлівае трымценне, бо чалавек меў доўгае адзенне, нібы гэта быў святар, а кудлатая галава ягоная была пакрыта нейкай тканінай. Ніхто з назіральнікаў не сумняваўся, што ў царкве вакол свечкі хадзіў сапраўдны манах!
Манах спыніўся, сеў на ўзвышэнне амбона, спінай да іканастаса, узяў у рукі цяжкую кнігу і, падстаўляючы яе старонкі да святла свечкі, стаў чытаць глухім гугнявым голасам:
– Памалюся Перуну, пакланюся Вялесу... – З гэтымі словамі манах перахрысціўся і нават крыху пакланіўся. – Як казаў наш айцец Ян Шчодравуснік сваёй залатой кгартанню, Бацька наш Нябесны не толькі дзеі прымае, але і намеры цалуе!
І не паводле дастойнасцяў тых, хто атрымлівае, і не самі па сабе, але па дабрыні таго, хто дае, прыяхам міласць...
Манах змоўк, шумна ўздыхнуў, стаў гартаць старонкі, шукаў у кнізе нейкае вядомае яму месца. Міхась пашукаў вачамі большую шчыліну. Яна была нізка, таму хлопец асцярожна апусціўся на калені, каб было зручней глядзець. Гэтак жа зрабіў Павел. Лена, каб быць смялейшай, апусціла свае рукі хлопцам на плечы і нахіліла галаву набок, каб можна было глядзець адразу двума вокамі.
Манах тым часам наслініў палец, перагарнуў некалькі старонак і зноў пачаў гугнявіць. Гаварыў ён нягучна, але словы разабраць было можна. Часу ад часу ён пераходзіў на шэпт, мармытаў зусім неразборліва.

– Забараняючы вады і парокі ідалапаклонства, другі запавет са святой скрыжалі ўнушае нам дабрадзейства некарыслівасці супраць жабы сквапнасці, – прачытаў манах, – прапануе ўстрыманне супраць дагоды чэраву, прадпісвае замірэнне духу супраць гардыні і пыхі...

Павел крануў дзяўчыну за руку, прываблiваючы яе вуха бліжэй да сябе, шапнуў:

– Гэта той?

– Хто яго ведае?! – паціснула дзяўчына плячамі.

Манах пачухаў бараду, потым зблытаныя валасы на галаве, космы якіх тырчалі з-пад накідкі. Вось ён зноў перагарнуў старонку, прыгледзеўся да наступнай...

Загугнявіў:

– Ганарлівец мае несуразмерна высокае меркаванне пра свае ўласцівасці – розум, прыгажосць і здароўе. Пыхлівец задаецца сваёй памяццю і талентам. Нават дабрыню лічыць сваёй, уласцівай толькі яму, якасцю... О-хо-хо! Ісціна, якая ісціна...

Здранцвелы ад жаху і ўражання, Міхась нахіліўся да Паўлавага вуха, ледзь чутна прашаптаў:

– Што рабіць будзем?

– Лена, перастань сціскаць мне плячо! – адказаў Павел. – Учапілася, як каза за ліпку...

– Ціха вы, я паслухаць хачу... – выдыхнула дзяўчына.

Манах з падазронасцю зірнуў на дзверы, некалькі хвілін сядзеў нерухома.

Хлопцы і дзяўчына не варушыліся, нібы скамянелі. Манах супакоіўся, пачаў гартаць сваю кнігу, знайшоў нейкае месца, стаў чытаць:

– Вось пыхлівец і шануе толькі самога сябе. Свае паняцці і жаданні ён лічыць вышэйшымі за вярхоўную волю Таго, Хто Ёсць на Небе. Задавака з пагардай і шкірамі адносіцца да думак і зычлівай рады іншых. Кгардун не адмовіцца ад сваіх меркаванняў, якія б яны не былі крывыя і аблудныя... Ягонае «я» – вышэй за ўсё...

Манах змоўк і зноў глянуў на дзверы.

– Гэта не манах, – раптам даволі гучна шапнуў Міхась.

– Тс-с, – ледзь чутна прасіпела Лена, – Сінчук, ты што?

– А то! Яна яшчэ сіпець будзе... – не баючыся, што яго пачуюць, прашаптаў Міхась. – Калі ён праляжаў у дубе тысячу гадоў, ён будзе глухі, як пень.

Напраўду, манах нібы і не чуў даволі гучнага хлопцавага шэпту, адвярнуўся, стаў шалахцець старонкамі кнігі.

– Кажу вам: гэта не манах! – паўтарыў Міхась.

– Тады хто гэта? – прашаптала Лена.

– А чаму не манах? Якія рэзоны? – шэптам пацікавіўся і Павел.

– А таму што на пальцы плюе і старонкі Святога пісання гартае. Так рабіць нельга. Гэта мне яшчэ некалі дзядуля-нябожчык казаў... Да ўсяго – постаць ягоная нешта мне знаёмая. І галасок нечы напамінае.

Мітуслівы агеньчык свечкі надаваў унутранаму выгляду царквы змрочны і патаемны выгляд. Плямы святла бегалі па ліках апосталаў і свяціцеляў, выяўленых на дошках іканастаса, неяк зусім пагрозліва блішчэла пазалота на просценькім багеце рам і на драўляных выразаных узорах царскай брамы. Цень панікадзіла – падстаўкі для свечак, трывожна мітусіўся па падлозе. Манах зноў загугнявіў, цяпер гучнай скорагаворкай:

– Ніхто цяпер не моліцца даўбешкам-ідалам, не пакланяецца будынкам, не дагаджае рэчам ці прадметам, не лічыць бажаством крыніцу ці бор, але мноства жывых душаў служаць жарсці карыслівасці і зломілуюць гордасць і пыху...

Манах на секунду змоўк, потым з трыумфам, узнёсшы руку з паднятым пальцам, прамовіў. – Ага! Вось што ёсць сучаснае, тонкае ідалапаклонства!

– Усё ясна, – шапнуў Міхась Сінчук і, больш ні слова не кажучы, ускочыў з кален, пацягнуў на сябе дзверы, пераступіў парожак і ірвануў да манаха, расстаўляючы рукі, каб ухапіць яго. Па дарозе ён збіў шклянку са свечкай, і святло згасла. У цемнаце пачуліся здушаныя крыкі і шум барацьбы.

– Трымай, не пускай! – як шалёны роў Міхась. – Куды-ы ломіш! Баліць!

– Свяці ліхтаром! – запішчала Лена. – Паўлік! Памагай.

– Я не ўтрымаю яго! Павел! – прасіў дапамогі Міхась. Але як толькі Павел уключыў ліхтарык, у той жа момант нехта ўдарыў па ягоных руках, уключаны ліхтарык грукнуў на падлогу. Лена адчула, як моцнае плячо адхіліла яе, амаль адштурхнула, бразнулі ад удару вонкавыя дзверы царквы...

Павел падхапіў ліхтарык, выскачыў з царквы, але на выхадзе за нешта зачапіўся і так гэпнуўся, што ліхтарык зноў выпаў з ягоных рук. Устаўшы, Павел кінуўся бегчы следам за ўцекачом, але неўзабаве вярнуўся.

– Што? Уцёк? – крыкнуў збянтэжаны Міхась, які стаяў у промні ліхтарыка пасярод царквы з чорнай апранахай у руках.

– Уцёк... – жаласліва паўтарыў ён, зразумеўшы, што нічога не выйшла. – Чаму не затрымалі?

– Куды ты яго ўтрымаеш. Ён як ламануў, што той лось па кукурузе... – махнуўшы рукой сказаў Павел. – Ды і зачапіўся я...

– А чаго адразу не кінуўся на дапамогу? – падступіўся да яго Міхась, шкуматаючы манахава адзенне ў руках. – Ты ведаеш, які гэта бамбіза? Ён мне проста ў дых, пад самыя мікіткі як урэзаў... Адкуль толькі ён такі ўзяўся?

Павел вінавата паціснуў плячамі.

– Што маўчыш?! – ледзь не раззлавана крыкнуў Міхась.

– Ну, я не такі, скажам, як ты адчаюга, каб адразу кідацца ў атаку, – знайшоў як выкруціцца Павел. – Хопіць высвятляць адносіны... Што гэта ў цябе ў руках?

– Эх ты, а яшчэ студэнт, – не мог супакоіцца Міхась. – Слухайце, тут нешта нячыста. Не-е, мы яго выведзем на чыстую ваду. Я падазраю, хто гэта. Імчым да цябе, Павел, да вас дахаты! Там і гэтую хламіду разгледзім.

Калі яны прымчалі да хаты Камароў, то ўбачылі, што Пятрук сядзіць сабе недалёка ад калодзежа і ў святле электрычнай лямпачкі... чысціць рыбу. І займаўся гэтай справай даўнавата, бо перад ім у місе высіцца гара пачышчаных плотак і акунёў.

Пятрук прывітаўся з братам. Зніякавелы, але ўсё яшчэ насцярожаны, Міхась падышоў да Пятра і ўважліва паглядзеў на яго з аднаго боку, паглядзеў з другога.

Потым памацаў ягоны біцэпс і нават панюхаў валасы.

Пятрук не пярэчыў, цярпеў, толькі здзіўлена паглядваў то на брата, то на Лену.

– Пецька, ты даўно тут? – пацікавілася Лена.

– А што? – насцярожыўся хлопец. – Нешта здарылася?

– Ты нікуды не адлучаўся? – з хітраватай усмешкай у сваю чаргу задаў пытанне Павел.

– Во, бачыце, – паказаў Пятро нажом на рыбу. – Яшчэ смажыць буду. У лядоўню не ўлезе.

– А дзе бацькі? Спяць? – спытаў Міхась.

– Даўно. Стаў бы я чысціць... У нас такой работай займаецца або Павел, або маці. З абеду ў мяне хоць бы раз клюнула, нічога не злавіў, плотачкі падзёўбвалі, а вечарам як сталі акуні чапляцца...

– Не, – крутнуў галавой Міхась Сінчук. – Ці я дурань, ці вы вельмі хітрыя.

Павел няўцямна паглядзеў на Міхася.

– Няхай я ў грамаце недапечаны, – прамовіў хлопец, – але адчуваю махлярства. Вы паддурваеце нас...

З гэтымі словамі хлопец павярнуўся і пайшоў прэч. За ім пайшла і Лена.

Павел пабыў дома нядоўга – ужо ў абед наступнага дня яму належала ехаць.

Міхась і брат Пятро ўгаворвалі Паўла застацца яшчэ хоць да вечара і ехаць начным цягнікам. Асабліва прасіў Пятро, якому, зразумела, Ленка расказала пра ўчарашнія падзеі, і цяпер яму карцела разгадаць тайну невядомца з царквы.

– Гэта той самы манах, – гаварыў хлопец. – Як я не дапетрыў, што ён у царкве схаваецца. А вы? Героі... У руках трымалі і выпусцілі.

З раніцы хлопцы паспелі схадзіць на могілкі, зайшлі ў цэрквачку і пільна там усё даследавалі. У манаскай, як думалі, хламідзе, Камарова суседка прызнала старую святарскую рызу, якая здавён ляжала, па яе словах, у скрыначцы ў алтарнай частцы царквы разам з рознымі святарскімі рэчамі. Акурат гэтай рызы ў скрыначцы хлопцы і не далічыліся. Ніякага іншага следу сваёй прысутнасці ў царкве манах не пакінуў. У кутку знайшлі некалькі газет, але яны старыя, са здымкамі спраўнага яшчэ Брэжнева.

Заставалася загадкай, што манах піў, што еў. У сметніцы, якая стаяла ў прытворы, знайшлі некалькі адносна свежых каменьчыкаў ад слівак і яблычныя агрызкі.

– Нягуста, – прамовіў Павел. – Будзеце ведаць, што манах не бесцялесны дух, а харчуецца слівамі і малінаўкамі.

Перад тым, як пайсці з царквы, спыніліся перад алейнай карцінай, на якой невядомы багамаз выяўвіў Тайную вячэру.

– Што глядзіцё? – прамовіў Павел. – Прадзедаў пазналі?

– Якія ж яны прадзеды, калі яны ў Палесціне жылі, – скрывіўся Міхась.

– У Палесціне? – падняў бровы Павел. – А хто маляваў? Наш мастак, тутэйшы. Бачыце, якія твары ў апосталаў? Сапраўдныя славянскія блінцы. Ды яшчэ з балцкімі доўгімі насамі? Адкуль тутэйшы мастак мог бачыць старажытных іудзеяў часоў Ёсіфа Флавія?

Міхась утаропіўся ў Паўла.

– Універсальнасць чалавечай прыроды – гэта адно, а лакальнасць людскога хранатопа – другое... – патлумачыў Павел.

– Студэнт! Перакладзі па-нашаму... – замахаў рукамі Міхась.

– Вось-вось, – адгукнуўся на гэта Пятрук. – Паўлік часам так заверне, што адчуваеш сябе абсалютным дурнем.
– Што ж тут незразумелага? Вунь, да прыкладу, у Лацінскай Амерыцы нядаўна даследавалі карціну з аднаго горнага касцёла. З гэткім во сюжэтам, – Павел паказаў на «Тайную вячэру». – Што, вы думаеце, знайшлі эксперты на стале ў апосталаў?
Хлопцы пераглянуліся і паціснулі плячамі.
– Смажаную марскую свінку, – з трыумфам прамовіў Павел. – Неадменны атрыбут шматвекавога сталавання індзейцаў. Ну, мне час збірацца на цягнік.
Па дарозе дахаты дамовіліся пра ўчарашняе нікому не расказваць. Каб не было плётак і гульні ў сапсаваны тэлефон.
– Чаго вы насы павесілі, я неўзабаве прыеду, – суцешыў хлопцаў Павел. – Ёсць, ёсць тут нейкая містыфікацыя. Вы на ўсялякі выпадак паназірайце за нашым гісторыкам.

**7**

Праводзіць Паўла пайшла адна Лена, бо Петрука і Міхася забрала на нейкую работу Міхасёва маці. Дзяўчына не ведала, што хлопцаў не будзе, разгубілася ад таго, што ёй ісці адной з Паўлам, і яны йшлі моўчкі, або зрэдку перакідваліся нязначнымі фразамі.
«Чаго яна пацягнулася?» – думаў Павел, а Лена ўсё азіралася і ўздыхала.
Жніўеньскае неба блішчэла, як свежаразрэзанае волава, дзьмуў тугі цёплы вецер. Пяшчотна-сляпучы шар сонца прасякаў смугу ласкавымі промнямі.
«Саромеецца яна мяне, ці што? – круцілася ў галаве ў хлопца. – Вочы нейкія...бездапаможныя».
– Ты, Лена, куды збіраешся паступаць? – спытаўся ўрэшце хлопец.
– Мне яшчэ рана пра гэта думаць, – зіркнула на Паўла дзяўчына і адвяла вочы. – Яшчэ дзевяты, потым дзесяты клас...
– Самы час засяродзіцца на пэўных прадметах, – з ментарскай інтанацыяй вымавіў Павел. – Трэба ж, урэшце, мець мэту ў жыцці. Каб дасягаць яе.
Лена прамаўчала і толькі ў каторы раз уздыхнула. Ішлі і зноў маўчалі. Маўчалі датуль, пакуль не паказаліся будынкі станцыі.
– А ты... калі прыедзеш? – спыталася Лена.
– Прыеду. Пасля будатрада на бульбу не забіраюць... – адказаў хлопец і зацікаўлена зірнуў на дзяўчыну.
Пакінуўшы Лену каля рэчаў у прыстанцыйным кветніку, Павел схадзіў па білет.
Вярнуўшыся, ён з фальшывай весялосцю сказаў:
– У нас цэлыя паўгадзіны. Чаго ты кіслая? Зайздросціш, што я еду? Гэта я вам зайздрошчу – вам застаецца загадка манаха.
– Пры чым тут манах? – Лена вомільгам зірнула на Паўла, зноў апусціла, нібы пакрыўджаная, вочы.
– Прысядзем на дарожку, – прапанаваў Павел.
Жываплот акружаў лавачкі ў гародчыку, пасярод якога расла плакучая вярба.
Яна ўжо даўно расла, зрабілася тоўстая ў камлі, угусцела ў вершаліне так, што глушыла кветкі. Доўгія гнуткія галіны навісалі над дарожкай, пасыпанай жвірам, і цёплы жнівеньскі вецер звіваў і развіваў іх.
– Нібы косы ў русалкі... – заўважыла Лена.
– Ты сама як русалка. Толькі малая яшчэ...
– Вы ўсе так кажаце: малая. Нават Пятрук. Але я вырасту... Вось пабачыце.
У голасе дзяўчыны чулася крыўда.
– Я чытаў этнаграфію, навука такая, пра звычаі і культуру нашых продкаў, – важна сказаў Павел. – Нашы дзяды ўяўлялі, што русалкі зімуюць ведаеш дзе? У вербах! Летам яны жывуць у рэчках, а на зіму перабіраюцца ў вербы. А што гэта ў цябе на руцэ?
– Драпіна, учора за нейкі дрот зачапілася...
Павел узяў дзяўчыну за руку, правёў па чырвоным пісягу. Адчуў, нібы нейкі ток прайшоў ад яе рукі па ўсім ягоным целе.
Дзяўчына адняла руку, ажывілася:
– А я аднойчы прыдумала... – Яна непрыгожа прымружыла вочы. Гэтае яе прымружванне не падабалася Паўлу. Лена тады выглядала зусім як дзіця.
– Я прыдумала, але гэта фантазія, што дрэвы маюць свае гадавыя кольцы, так?
І ў іхных кольцах хаваюцца душы памерлых людзей... А калі дрэва зразаюць, то душы разлятаюцца...
– І што?
Дзяўчына аж уздрыгнула ад рэзкасці пытання.
– Ты, Ленка, не зусім арыгінальная, – пачаў рэзанёрстваваць Павел. – Я пра гэта таксама чытаў.
Аб’явілі прыход цягніка. На пероне забегалі людзі, Павел і Лена падняліся з лаўкі.

– Цалавацца на развітанне будзем? – пажартаваў Павел. На ягонае здзіўленне дзяўчынка прыхілілася да яго і цмокнула ў шчаку. І адразу схавала вочы. У Лены непрыгожа тырчэлі вушы з-пад валасоў, але ад яе невялікай постаці сыходзіла такая адданасць, такое замілаванне, што хацелася прыціснуць яе да сябе і расцалаваць.

«Потым скажуць, што цалаваўся з братавай дзяўчынай. Не!» – падумаў ён, паціснуў Ленцы руку, узваліў сумку на плячо, і яны выйшлі з-за агароджы станцыйнага кветніка.

Потым у Паўла з галавы не выходзілі паводзіны Лены. Аж да самых Ляхавіч пацалунак грэў шчаку. Адчуваў прыемнасць і адначасова сорам, што пра гэта даведаецца Пятро.

«Такая дзяўчынка Пецьку дасталася... – круцілася думка. – А што вось яна мае да мяне? Ат, знайшоў праблему. Вунь колькі дзяўчат села ў Баранавічах. Выбірай на любы густ».

Студэнт стаў глядзець у акно цягніка, але ў каторы раз думкі яго вярталіся да сарамлівай вясковай дзяўчынкі.

Кожны год за тыдзень да пачатку заняткаў настаўнікі праводзілі так званы куставы жнівеньскі семінар. Выкладчыкі літаратуры з’язджаліся ў адну школу падзяліцца метадычным і педагагічным вопытам, сустрэць старых знаёмых, папіць чаю, нагаварыцца з аднадумцамі на цэлы год наперад.

Настаўніца Фаіна Барвінкова больш чым хто любіла такія семінары, бо мела тады магчымасць пачытаць перад настаўнікамі свае лірычныя вершы. Яна не прэтэндавала на найменне паэткі, бо паэткі атабарваліся ў сталіцы, выпускалі зборнікі патрыятычнай і публіцыстычнай лірыкі, раз’язджалі па правінцыях з агітбрыгадамі, а яна змушана цягнуць настаўніцкую лямку: правяраць сшыткі, ставіць двойкі, выклікаць бацькоў, пясочыць неслухаў. Якая з яе паэтка?

Калі былі прачытаны і абмеркаваны даклады і рэфераты, выкладчыкаў запрасілі ў настаўніцкую. Закіпеў электрычны чайнік, пацяклі шчырыя размовы, але неяк усе яны збіваліся на адну тэму – што здарылася ў тутэйшай вёсцы? Раён перапоўнены неверагоднымі чуткамі пра нейкага манаха.

– Раскажыце, Фаіна Аўдзееўна, – прасілі настаўнікі Барвінкову, – вы ж тутэйшая. Кажуць, што з тарфяніка выкапалі калоду, а ў ёй знайшлі мумію?

Барвінкова аднеквалася, гаварыла, што нічога сама не бачыла, толькі чула ад дзяцей, а ў дзяцей вунь якая фантазія. Пра здарэнне трэба пытаць у Мікалая Лявонавіча, выкладчыка гісторыі, у яго на руках ёсць дакумент, які сведчыць, што падзеі мелі грунт.

– Ёсць-ёсць! – пацвердзіў Савіцкі, які сядзеў у настаўніцкай за сваім сталом. – Я акурат сёння і прыйшоў у школу, каб зрабіць важнае паведамленне. Але, прабачаю, неафіцыйна, у межах, гэтак бы мовіць, факультатыву. А то разумееце, ёсць начальства ў раёне, ёсць і большае начальства.

Гісторык дастаў з папкі ліст паперы, але Фаіна Аўдзееўна перабіла яго:

– Хвіліначку. Ведаеце, як толькі я пачула пра манаха-мумію, я сасніла цэлую легенду!

– Раскажыце, зрабіце ласку, – пачулася з усіх бакоў.

Барвінкова расказала, што бачыла ў сне манаха, які вядзе пошук храма. Манах выйшаў у дарогу мо пяцьсот гадоў назад, але мусіў праляжаць гэтыя вякі запакаваным у мёд у летаргічным сне. А калі ачуціўся, вярнулася прытомнасць, пайшоў шукаць храм. І дзе б ён ні хадзіў – паўсюль бачыў забітыя крыж-накрыж цэрквы, пабураныя касцёлы, пераўтвораныя ў свіраны і кароўнікі замкі і палацы. І таму манаху ў сне паэткі з’явіўся анёл, які сказаў: «Змірыся, інак, усё разбурана, ты не знойдзеш ніякага храма. Бо і маскавіты тут пабывалі – храм разбурылі, і французы прайшлі – канюшню ў храме зрабілі. Былі тут і немцы, яшчэ ў Першую сусветную вайну, і ў Другую таксама...»

– Што за... недакладнасць, Фаіна Аўдзееўна? Чаго маскавіты будуць бурыць праваслаўны храм? – адазваўся гісторык.

– Ну я так, да прыкладу, – чароўна пасміхаючыся, стала апраўдвацца настаўніца. – Тады, скажам, татары.

– Трэба ўдакладніць, якія, – зноў зрабіў заўвагу гісторык. – Бо гэта важна. Таму Беларусь Белай і назвалася, што не мела ханскага ўціску. Хіба што крымчакі...

– Не перашкаджайце! – пасуровела Фаіна Аўдзееўна. Калі трэба было, мяккая і добразычлівая жанчына з чароўнай знешнасцю магла праявіць характар. – Гэта мой сон, і ў сне можа здарыцца ўсё, што заўгодна. Нават рэчы, якія супярэчаць навуковай дакладнасці.

– Згодзен, згодзен, – сказаў гісторык, сярдуючы, што ў яго забіраюць увагу.

– З’явіўся манаху анёл, – прадоўжыла Барвінкова, – і кажа яму: «Ты змірыся, жыві з людзьмі, зжывіся з імі, жыві, як яны, прынось людзям карысць, не рабі ім клопату, забудзь пра мінулае. Галоўны храм – народ, ён застаўся».

– Як гэта: забудзь пра мінулае? – зноў запярэчыў гісторык.

– Не шукай храм, змірыся! – кажа анёл, – Барвінкова ўпарта працягвала расказваць свой сон. – Запомні: храм – гэта твой народ, храм – мова твайго народа, храм – дух твайго народа. І гэта лепшае, што можна

зрабіць у дадзенай сітуацыі.

– Цяжкавата ўявіць анёла, які так і кажа: «можна зрабіць у дадзенай сітуацыі», – з’едліва прамовіў гісторык, але ў настаўніцкай ужо гучалі апладысменты ў адрас Фаіны Аўдзееўны.

– А я чуў вось што, – сказаў адзін з выкладчыкаў, весялун па характары, сваёй суседцы, але так, каб чулі ўсе. – Кажуць, што той манах-законнік захоўваўся, як цукат, у мёдзе, а значыць, быў салодкі, – настаўнік аж блішчэў ад смеху, які распіраў яго. – І ўсе тутэйшыя жанчыны пазбягаліся наскрэбсці з таго манаха мёду.

– Ніхто не збягаўся... – неадабральна паглядзеў на веселуна Мікалай Лявонавіч.

– Хто мёду, а хто і самога манаха, – са смехам выціснуў з сябе жартаўлівец, хоць ніхто не смяяўся. Бываюць такія мужчыны, якія ў кампаніі прыгожых жанчын, а ўсе настаўніцы беларускай мовы і літаратуры несумненна такія, пачынаюць вярзці лухту, нібыта сам чорт цягне іх за язык. Яны хочуць прыцягнуць да сябе ўвагу, але атрымліваецца з дакладнасцю наадварот. Словам, весялун зразумеў, што распусціў язык. І тады ён паспрабаваў выправіцца:

– Мясцовыя і даяркі, і паляводкі кінуліся да таго манаха. Усе ўмомант апанталіся каханнем. І адна толькі жанчына не гарэла да яго пачуццямі. І была гэта жонка... тутэйшага пасечніка. Бо ад мёду яе аж нудзіла.

– Ну, гэта несур’ёзна, – замахала рукамі на гаваруна Барвінкова. – Мая легенда з анёлам выклікае цікавасць да айчыннай гісторыі, абуджае патрыятычныя пачуцці, прывівае любоў да роднага слова. Акрамя таго, яна проста прыгажэйшая.

– Прыгажэйшая, – згадзіўся весялун. Пад позіркамі гэтулькіх прывабных жанчын ён вымушаны быў прызнаць сваё паражэнне.

Слова ўрэшце ўзяў Мікалай Лявонавіч.

– Дарагія сябры, перад вамі, – ён памахаў паперынай, – выдатны твор, узор сярэднявечнай грамадзянскай лірыкі, каштоўнейшая навуковая знаходка. Гэта пераварот і ў айчыннай гісторыі, і ў айчыннай літаратуры. У палімпсесце, які здабылі школьнікі, мае, скажу без ілжывай сарамлівасці, самыя таленавітыя вучні, адзін ужо нават студэнт універсітэта, ёсць невядомыя сучаснай навуцы факты. А мова, скажу вам, якая мова! Амаль сучасная! Тады, пяцьсот ці болей гадоў назад, жыў амаль што наш сучаснік, які думаў як мы, мысліў амаль сучаснымі катэгорыямі. Не верыце?

Я вам дакажу!

– Ого! Не можа быць!– пачуліся воклічы настаўнікаў роднай літаратуры і роднай мовы. – Вы што? Няўжо сенсацыя?!

– Слухайце, – урачыста аб’явіў настаўнік. – Увага, калегі, прашу цішыні...

**8**

Гісторык расправіў плечы, схіліў галаву набок і з выглядам вучонага докі сказаў:

– Уласна, мы маем два тэксты... Першы тэкст, які напісаны паверх ранейшага, вычышчанага, – не ўяўляе для навукі нічога асабліва цікавага, зачытаю фрагмент:

«...Много людей об том завешчали, што людзе и грошы побрали. Лепей было, пане Филипе, седзець табе ў Липе. Увалявся есь в великую славу, як свиння ў гразь, горш сталася, коли хто ўпадзе ў новым кожусе ў густое болото, у злому разуменю, у обмовах людзских и ў срамоти седзиць, як дзяцел у дупли...»

– Бачыце? Усё вядомае. Вось яшчэ кавалачак: «По многих книгах заблудився теперычны розум, яко коза па лесе. А на праўду святую ни од кога ока здорового нет. Одна баламутня...»

– Дык гэта ж вядомы хрэстаматыйны тэкст! – усклікнула адна маладая настаўніца, якая яшчэ не забылася таго, чаму яе вучылі ў інстытуце.

– Я ж і кажу, – развёў рукамі гісторык.

– Тады можна датаваць рукапіс! – заявіла дасведчаная настаўніца.

– Можна, – згадзіўся Мікалай Лявонавіч. – Але гэта верхні тэкст. А вось той тэкст, які ўдалося расчытаць пад тэкстам. Слухайце! – гісторык набраў у грудзі паветра, зрабіў на твары важную міну і прачытаў: «О, виват Табе, Адзинаму, Пяруне і Вялесе, Таму, хто пасылае нам вясну! Ты Той, хто праганяе снег и абуджае рэки, хто гониць сок па бярозавых жылах и пасылае сонечныя промни, каб зелянела рунь.

Ты Той, каму радуюцца и птушки ў небе, и цьвяты ў поли, и рыбы ў рэках, и жабы ў лужынах. Ты, Пярун, яки мног есть, Ты заснаваў кросны свету...».

Гісторык змоўк і з выглядам рымскага трыумфатара паглядзеў на даволі збянтэжаныя твары настаўнікаў.

– Вы што? Не разумееце? Гэта ж падобна на творы Кірылы Тураўца! Твор сведчыць, што быў мосцік ад нашага славянскага політэізму да ідэі нашага ж славянскага монатэізму! «Пярун мног есть!» – хіба гэта не доказ гэтаму?

Настаўнікі паныла маўчалі. Мікалай Лявонавіч стаў чытаць яшчэ адзін фрагмент:

– «Дараги брат, я зразумеў радасную навину – Пярун ёсць наш Бог, – настаўнік падняў палец, – бо Пярун нам дадзены, и Пярун мног есть. Зельле ўсялякае сьмяецца! Бабры и андатры радуюцца цяплу, и буслы над дубамі клёкатам витаюць Бога, яки есць и Сотвар, и Дух, и Намашчэнец...»

– Ну, – зморшчыўся настаўнік-весялун. – Гэта хто такі – намашчэнец?

– Гэта, прабачце, Ісус Хрыстос, – патлумачыў Мікалай Лявонавіч. – Калегі, прашу хвіліначку цярпення. «Намашчэнец Укрыжаваны, и не Той, не бізантыцки, – настаўнік у каторы раз падняў палец, – бачыце, не візантыйскі! Гэта момант сінтэтычнасці ў рэлігіі, бо нашы продкі спалучалі свае вераванні з візантыйскім праваслаўем. Момант цярпення, калегі, апошні расчытаны фрагмент: «Намашчэнец Укрыжаваны Бог, и не тольки бизантыцки, але и наш Бог, Бог нашага люду, яки яго вярбою ганаруем, бо пальмы, як ты ведаеш, мой пински дружа, у нас не растуць...»

У гэты момант у вышыні неба бабахнуў самалёт, які пераходзіў гукавы бар'ер.

Ды так гучна, што фрамуга акна аж падскочыла, а настаўніцы ўздрыгнулі ад нечаканасці.

– О! – адгукнуўся настаўнік-жартаўнік на гэта. – Знак зверху.

Усе засмяяліся і, палічыўшы, што «лекцыя» гісторыка скончана, падняліся, каб рызысціся.

– Ну як? – ужо ўслед ім спытаўся гісторык. Але ніхто не адважыўся на каментарыі. І толькі калі ўсе выйшлі, настаўніца біялогіі, якая не ўмешвалася ў гутарку філолагаў, а нешта пісала за сваім сталом, сказала:

– Дзе вы, Мікалай Лявонавіч, узялі гэтае крэмзанне? Сыны Андрэя Камара прынеслі?

– Крэмзанне? – перапытаў гісторык і гнеўна задыхаў.

– Там спамінаюцца бабры і андатры, так? – жанчына зняла акуляры і запакавала іх у футарал.

– Так, – хрыпла прамовіў гісторык.

– Дык вось, бабры на Беларусі жылі спаконвечна...

– Ага, – голас гісторыка паправіўся.

– А вось андатры, – настаўніца дастала акуляры з футарала і зноў начапіла іх, нібы гэта дадавала яе словам большай вагі. – А вось андатры, мой вы даражэнькі, з'явіліся на Беларусі ў дваццатым стагоддзі. Да гэтага часу яны спакойна грызлі траву ў канадскіх балотах. Вы, дарагі мой калега, дапускаеце, што тагачасны аўтар мог ведаць фауну Паўночнай Амерыкі?

Мікалай Лявонавіч скамянеў.

– Марыя Мікалаеўна, вы шмат ведаеце ў біялогіі, – нарэшце прамовіў настаўнік, – але нічога не разумееце ў пергаментах.

Вось так бясслаўна закончылася расчытка манускрыпта, прынесенага самымі «таленавітымі вучнямі». Пергамент аказаўся звычайнай падробкай. Але каму і навошта спатрэбілася насмяяцца з яго, настаўніка, Мікалай Лявонавіч мог толькі здагадвацца. Не Камаровы хлопцы, Павел і Пятро, былі завадатары. Быў, быў у Мікалая Лявонавіча Савіцкага даўні сябар па студэнцтве, які мог падлажыць яму такую вось свінню. І падлажыў. Звалі даўняга знаёмага Іван Іванавіч Закрэўскі. Ён якраз выкладаў ва універсітэце, дзе вучыўся Павел.

Дахаты Паўла Камара не адпусцілі – на верасень мусіў ехаць на практыку, якую студэнты, што не былі ў будатрадзе, праходзілі летам. З практыкі напісаў Пятру ліст, што, маўляў, хопіць, гульня зацягнулася, раскрывай карты, і так немаведама што нарабілі.

Адказ брата ўразіў Паўла. Той пісаў, што паколькі ён, Павел, заварыў гэтую кашу, яму яе і есці. Паведаміў таксама невясёлую навіну: яго, Пятра, пакінула Лена.

Цяпер яна «ходзіць» з Міхасём. Апошні дзьмецца, не падае рукі. І была яшчэ адна вестка – пергамент прапаў. Мікалай Лявонавіч страшэнна заклапочаны. Ці робіць такі выгляд. З ягоных слоў, ён забыўся зачыніць акно, а пергамент ляжаў на стале, адкуль ён і знік. Пятро пісаў, што хутчэй за ўсё яго выкралі Лена з Міхасём.

Павел пацёр лоб. Што яны будуць рабіць з пергаментам? Хоць ён не вялікая каштоўнасць, але яго трэба вярнуць загадчыку кафедры Івану Іванавічу Закрэўскаму.

І што цяпер рабіць?

Пасля практыкі пачаліся напружаныя заняткі. Павел абмінаў Івана Іванавіча, стараўся не сустракацца з ім. Ён ездзіў дахаты, але ўсяго толькі на адзін дзень і ні з кім не сустракаўся – было сорамна.

Неяк Павел пасля цэлага дня ў бібліятэцы прыйшоў у інтэрнат і зваліўся на ложак – кроў ад стомленасці аж пульсавала ў галаве. Пераседзеў. Трэба расслабіцца... Стаў думаць пра родныя мясціны. Уяўленне любімых лажкоў, знаёмых з дзяцінства сцежак прыносіла задавальненне, уводзіла ў глыбокае расслабленне, поўны, што называецца, рэлакс. Найлепш уявіць сябе ў вадзе рэчкі, пасля абеду, калі вада цёплая. Нібыта ляжыш у гэткай вадзе, цёплай і цёмнай, як гарбата, і плывеш па цячэнні. Цела разнявольваецца, ты ведаеш у рэчцы кожную яміну, кожны паварот, кожны корч, табе нічога не пагражае. Ты гаспадар гэтых пляжыкаў з самым гарачым пяском і наймякчэйшых муражкоў па берагах. Цела

ўпіваецца шчасцем, раскашуе...

Раптам нешта стукнула Паўла, так штурханула, што яго ажно падкінула на інтэрнатаўскім ложку. Нікога! Што такое? Хто штурхануў? І адчуў, што яго ахапіла непрыемнае адчуванне, цела зрабілася нібыта не сваім. Што гэта з ім робіцца?

Ператамленне?

Паводле вечнай сваёй звычкі ўсяму даваць тлумачэнне, Павел стаў думаць пра незразумелыя адчуванні. Прыйшла на памяць візія дзіцячага чорціка-анёла. Няўжо нядобрая сіла перашкаджае яму адпачываць метадам рэлаксацыі, поўнага расслаблення?

А ці не ён сам і ёсць – гэтая нядобрая сіла? Ужо не той маленькі чорцік, не чарцяня, але вялікі, дарослы чорт! Той, хто пужае!

Вось яно што! Гэта вобраз, іміджызацыя душы з іншага часу. І які гэты вобраз, комплекс пачуццяў непрыгожы, крывы, непрыемны на адчуванне. Няўжо ён, Павел Камар, некалі стане такім? Не ён сам, але ягоная душа?

Як гэты чарцяка з’явіўся тут, сярод ягоных уяўленняў роднай рэчкі? Так, як і той маленькі анёл-чорцік. Ты сам, разважаў Павел, у будучым яшчэ не адзін раз будзеш рэлаксаваць, уяўляць сябе ў цёплай рэчцы – гэта ж твой любімы спосаб.

Там, у прасторы ўяўлення, час свой. Фактычна там няма часу, там вечнасць. Гэтую вечнасць цяжка ўявіць, час там не лінейны, нават не спіральны, а нейкі іншы. Мо які шаравы, гэта значыць той, які займае прастору. Вось і бывае, што ўяўленні featнага лінейнага часу накладваюцца адно на адно. І тады вось так непрыемна.

Павел падняўся, дастаў Петрыкаў ліст, яшчэ раз прачытаў яго. Вось табе і маеш!

Нарабіў. Лена кінула брата, «ходзіць» з Міхасём. Часам дзяўчаты так робяць ад помсты. Ну, цяпер да яе не падступішся.

Павел зноў прылёг. Усё ж, як адчысціцца, як адмыцца? Папрасіць прабачэння.

Прыдумалі манаха ў дупле, а той манах жыве сваім жыццём. Некалькі інсцэніровак ажывілі яго.

Позна, распранайся і спі. Не візіянíруй. А то пачнеш думаць, што калі выйсці на вуліцу, за вуглом дома сустрэнеш Скарыну. Не, Скарына ці быў у Мінску?

Ну, тады ў нелінейным часе можна сустрэць Купалу, Багдановіча, Чарвякова. А як якога Панамарэнку? Або і таго горш – Цанаву? Не, прыемней сустракаць тых, хто думаў пра горнюю Беларусь. Сувораў быў на Беларусі, але ці думаў ён пра горнюю Беларусь? Увогуле, пра якую такую Беларусь ён думаў?

Цікава, якое будзе пакаранне? За гэты розыгрыш. Пакаранне фактычна пачалося, хлопец. Распраніся, а то заснеш.

Тым часам жыццё развівалася паводле свайго сцэнара. Перад самай зімой у студэнцкі інтэрнат, у якім жыў Павел Камар, зайшла немаладая жанчына. Зусім бабулька. На яе адразу звярнулі ўвагу, бо пакланілася вахцёрцы са словамі:

– Мір гэтаму дому.

Вахцёрка пільна паглядзела на жоўты, як дыня, твар, з дробнай сетачкай маршчын. Апранута госця была ў старую, але добра захаваную плюшаўку. Мода шасцідзесятых. Хустка павязана на лоб і буркі на нагах паказвалі, што бабулька з вёскі.

Але больш за ўсё вахцёрку ўразіў белы святочны фартух з чырвонымі вышыванымі пеўнікамі і кветкамі. Такіх фартухоў ніхто даўно не насіў. Хіба дзяўчаткі з фальклорных гурткоў. Якія-небудзь «харошкі» ці «скамарошкі». Калі бабуля з вёскі, ёй трэба дапамагчы. Вахцёрка выйшла з-за стала не столькі ад здзіўлення, колькі ад замілавання. Гэтая невядомая бабулька напомніла ёй пасляваенныя гады, калі вахцёрцы даводзілася хадзіць па вёсках у мяшочніках.

– Вы да каго, мілая?

– Тут, даражэнькая, вучыцца з нашых мясцін чысты апостальскі чалавек, – рэкнула старая.

– Што? – Тут ужо ў вахцёркі напраўду вочы на лоб палезлі. Яна ўгледзелася ў незнаёмку. Больш за ўсё ёй не хацелася пераканацца, што тая вар’ятка.

– Назавіце прозвішча, імя... Пашукаем нумар пакоя, і ідзіце сабе да яго.

– Прозвішча ягонае Комар, Камара Андрэя ён сын, а завуць Павалам.

– А-а, Павел, – абрадавалася вахцёрка, бо гэтага студэнта яна добра ведала – да яго часта заходзілі сябры-жартаўнікі з тэатральна-мастацкага інстытута. – А вы, прабачце, кім яму будзеце?

– Да-альняя родственніца... – хітравата адказала бабулька, разгортваючы пашпарт з насоўкі. І насоўка, відаць, была спрадукавана яшчэ за Польшчай. Ад яе тхнула нафталінам і арэхамі – так пахне ў старасвецкіх маляваных куфрах.

Калі ў дзверы пастукалі, хлопцы, Паўлавы сябры па пакоі, пераззірнуліся – ніхто са сваіх, суседзяў ці знаёмых, каб увайсці ў пакой, не стукаў. Няўжо праверка з дэканата? Збольшага навялі парадак і адчынілі

дзверы.
У пакой увайшла ўжо вядомая чытачу бабулька, блiснула вачамi па кутах, вiдаць, шукаючы абраз, абвяла позiркам хлопцаў i ўпэўнена накiравалася да Паўла.
Той сядзеў за нiзенькiм часопiсным столiкам, схiлiўшыся над падручнiкам.
– Бласлаўi, ойча! – нечакана папрасiла бабулька. Яна склала рукi на грудзях i нахiлiла ў знак пакоры перад Паўлам галаву.
– Якi я вам ойча! – ускочыў, як уджалены, Павел.
– Ты Андрэеў сын? – падняла старая галаву. Павел кiўнуў.
– Я й адразу пазнала. Бласлаўi...
Паўлавы хлопцы перазiрнулiся. Яны былi здзiўлены не меней, чым Павел.
Бабулька тым часам бухнулася на каленi.
– Вы што? Хто вы такiя? – спуджаны Павел не ведаў, куды падзецца. Ён стаў падымаць бабульку, але тая ўхапiлася цалаваць рукi. Павел ледзьве вырваўся.
– Паўлiк... Ты ж наш... Бласлаўлення прашу... – На вачах бабулькi з'явiлiся слёзы.
– А-а, вось што яно, – стаў здагадвацца Павел. – Слухайце, жанчына. Я... Я нiякi не... Ну, я не той манах, пра якога вы думаеце...
– Не пайду, пакуль не блаславiш, – заявiла старая.
– Бласлаўi ты яе, яна адчэпiцца, – параiлi хлопцы.
– Сынок, скажы: бласлаўляю, i руку мне на галаву пакладзi, – падказала бабулька i зноў пакорлiва падставiла галаву. Павел хуценька зрабiў, што ад яго патрабавалася. Бабулька ўсцешылася, перахрысцiла па чарзе хлопцаў i накiравалася да дзвярэй.
– Ну ты даеш! Ты што, секту стварыў? – сказаў адзiн з хлопцаў, калi бабулька выйшла.
– Якую секту! – злосна вымавiў Павел. – Гэта абсурд, поўная недарэчнасць.
– Хто вас, палешучкоў, ведае. На Палессi баптыстаў шмат...

**9**

А жыццё iшло далей. Той самай восенню на радзiме Паўла з'явiлiся дзве цiкавыя i надзвычай каларытныя персоны.
Былi гэта двое мужчын даволi маладога веку – адзiн зусiм малады. Старэйшы барадаты, а ў малодшага пад носам вiсеў, нiбы прыклееены, кусцiк вусiкаў.
Апранутыя яны былi ў доўгiя з чорнага краму адзежыны, крыху прыталеныя. На нагах цяжкiя боты. На галовах мелi шапачкi. Такiя шапачкi носяць людзi святарскага чыну i называюцца ў пэўным асяродку скуфейкамi. Вочы прыхаднi мелi светлыя, твары шырокiя, лагодныя, нават ўсмешлiвыя. Гэтыя людзi неслi нешта накшталт фанернага чамадана з ручкай з жалезнага дроту. Валiза была цяжкая, бо час ад часу маладыя перадавалi яе адзiн аднаму. Панясе адзiн метраў трыццаць i перадае другому.
Прыхаднеяў бачылi яшчэ ў суседняй вёсцы. Яны i прыйшлi адтуль па прасёлку.
Вiталiся з кожным, каго сустракалi, нiбыта ведалi кожнага. Пры вiтаннi яны дружна, нiбы па камандзе, кiвалi галовамi i нават нiбы крыху кланялiся. Ад гэтай парачкi сыходзiла сама пяшчота, iхныя твары праменiлi добразычлiвасць i лагоду.
Каля вясковай крамы прыхаднi зайшлi ў двор i папрасiлi вады.
Пакуль гаспадар нёс з хаты кубак, яны паспелi выкруцiць вады з калодзежа i папiць проста з вядра. Гэта паказвала iх простасць. Яны падзякавалi гаспадару i напыталi хату Лiды Варапай. На развiтанне зноў падзякавалi i пайшлi. На вулiцы, каго б нi сустракалi, вiталiся, кланялiся, i перапытвалi хату Варапаiхi. Так што прыхаднi не паспелi прыйсцi да той Варапаiхi, паўвёскi ведала, што да яе iдзе нешта несусветнае – двое мужчын, апранутых як святары, у скуфейках i з драўляным чамаданам у руках.
Гаспадар, якi паiў прыхаднеяў вадой, доўга праваджаў iх вачамi, потым заявiў жонцы, якая ў гэты час выйшла з крамы:
– Арцiсты. Бачыла?
– А няўжо ж не бачыла. Але цi арцiсты? Бацюшкi нейкiя.
– Адзежа ў iх ручное швiво.
– Як ты кажаш?
– Рукамi шытае, шывок няроўны. I боты не з фабрыкi.
Жонка глянула прыхадням наўздагон, вiдаць не паверыла i толькi сказала:
– Прыдумаеш тожа. Якi шавец цяпер возьмецца боты шыць?
– Я табе кажу – арцiсты гэта! Ад iх грымам пахне! I адзёжу з нейкага спектакля ўзялi. Я адразу пазнаў, я стрэляны верабей... Ты мне дай – я табе шпiёна злаўлю: хоць англiйскага, хоць амерыканскага.
Прыхаднi зайшлi да Варапаiхi ў двор. Чамадан асцярожна паставiлi каля дзвярэй i пастукалi ў дзверы.
Лiда Варапай мяла хату, калi пачула, як да яе пастукалi. Гэта было дзiвам – на вёсцы нiхто не стукаў, а

падавалі голас. Ліда ад хвалявання, калі адчыняла дзверы, ударылася галавой аб шалёўку. Ды так рэзнулася, што ажно застагнала. Яе, з венікам у руках, пасадзілі на лаву, нават адзін прыхадзень дастаў насоўку, намачыў вадой з вядра і далікатна прыклаў да лоба жанчыны.

– Дзе, мілая, пісьмо? – спытаў барадаты.

– Якое пісьмо? – спужалася гаспадыня хаты.

– Мы прыйшлі не жарты жартаваць, дзе пісьмо? – цвёрда, але без жалеза ў голасе паўтарыў барадаты.

– Няма ў мяне... – разгублена сказала Ліда. І праз нейкі момант выдала: – У Заранкоў...

Малады дастаў з кішэні некалькі тоненькіх васковых свечак, паклаў на стол.

– Маліся за ратаванне душы, – сказаў ён густым басам, нечаканым для хліпкіх вусікаў.

– Як гэта? Чаго? – зніякавела бедная Варапаіха.

– А ўсё роўна вінаватая, хіба не? – падмігнуў жанчыне барадаты.

– У чым? – пакрыўджана спыталася ўшчэнт перапуджаная Варапаіха. – Я нічога не чытала...

– Не чытала, але ў руках трымала?

Жанчына кіўнула.

– Вось яно што! – падняў палец угару малады. – Ты маліся, а мы паможам. За намі не стане, мілая. А дзе жывуць Заранкі?

Варапаіха кінулася даставаць грошы заплаціць за свечкі, але малады спыніў яе.

– Браточкі, мілыя... Скажыце мне, хто вы? – Рукі ў беднай жанчыны калаціліся.

– Мы ад веку гэтага, не бойся, – пасміхнуўся барадаты.

– Дык вы... – не асмельвалася спытацца Варапаіха, толькі паказвала рукой уверх. Відаць, гэта азначала высокую царкоўную інстанцыю, адкуль былі прыхадні.

– Якая розніца? А вось калі чалавек думае, што ён святы, хай не сумняецца, што гэта ад д’ябла, – патлумачыў малады з ласкавай усмешкай.

– Ліст з посаху ад нячыстага. Мы забіраем яго, – дабавіў да тлумачэння маладзейшага барадаты.

Мужчыны пайшлі. І пакуль яны ішлі, насупраць хаты Заранкоў ужо сабраліся людзі. – Кажуць людзі, тое пісьмо ад д’ябла! Царкоўнікі прыйшлі забіраць яго, – ужо выказваліся пэўныя думкі.

З’явіліся прыхадні. Яны накіраваліся ў хату. Што было ў хаце, ніхто не ведае.

Выйшлі вельмі хутка і, па ўсім было відаць, паспяхова даканаўшы мэты, бо зрабіліся яшчэ больш ветлівымі, а прыязнасць іх перайшла мяжу – яны віталіся нават з тымі, з кім ужо віталіся. Па дарозе назад яны зайшлі ў краму, купілі адну штуку гарэлкі і пайшлі сабе далей. У бок суседняй вёскі. Цікаўныя праводзілі іх датуль, пакуль яны не схаваліся за прыдарожным хмызняком. Потым, праз некалькі дзён, разведчыкі – малыя хлопцы, данеслі, што знайшлі там пустую бутэльку. Закусвалі прыхадні пячэннем «Чайнае». На месцы балю малыя знайшлі кусцік нейкай поўсці на пластыры.

Гаспадар той хаты, які пагражаў выкрыць любога амерыканскага ці англійскага шпіёна, паторгаўшы знаходку за канцы, раптам прыляпіў пластыр сабе пад нос і заліўся шчаслівым смехам:

– Я ж казаў – гэта арцісты!

Далейшы шлях прыхадняў невядомы. З суседняй вёскі можна патрапіць на чыгуначную станцыю, а адтуль паехаць у любы бок.

Прайшоў год. Студэнт чацвёртага курса Павел Камар ехаў пасля чарговага будатрада дахаты. Ехаў ён з невясёлымі думкамі. Па-першае, іх не разлічылі ў будатрадзе, а па-другое, хлопца чакала не зусім прыемная, як ён лічыў, сустрэча з роднай вёскай.

Нават перон станцыі, на якой Павел мусіў рабіць перасадку, сустрэў яго непрыветліва, нібыта пакрыўджаны на тое, што Павел ступаў на яго, выходзячы з вагона, з цяжкім сэрцам. Хлопец і так ніколі асабліва не радаваўся, калі апынаўся тут, у Лунінцы. Што ж тут радавацца, калі родная хата блізка, хоць ты ідзі пехатою, а трэба чакаць ажно чатыры гадзіны.

Стары, але свежапафарбаваны вакзал таксама сустрэў студэнта непрыветна – і холадна было ў залі-пачакальні, і неяк невыразна і цьмяна свяціліся лямпачкі пад высокай столлю.

Пайшоў у буфет, хутчэй па звычцы, бо есці не хацелася. Заклапочаная, стомленая і сонная буфетчыца панура глянула на яго. Павел замовіў шклянку кавы і булачку – грошай было ў абрэз.

У буфеце мелася ўсяго два столікі, каб стаяць – за адным юнакі пілі піва, азіраючыся на міліцыянтаў, якія раз-пораз зазіралі ў буфет, а за другім стаялі два мужчыны вясковага выгляду – абодва ў цёплых кепках; адзін у доўгім плашчы з тканіны, якая даўно выйшла з моды, а другі ў новенькай целагрэйцы. Ад гэтай целагрэйкі прыемна пахла на ўвесь буфет, а на гузіку вісела яшчэ белая неадарваная нітка ад цэтліка. Мужчыны нешта елі з газеты.

Павел паставіў каву на столік да юнакоў і стаў грэць аб шклянку рукі. Юнакі дапілі піва і пайшлі. Міжволі хлопец слухаў, што гавораць мужчыны за суседнім столікам.

– Чуў, – гаварыў чалавек у целагрэйцы, які стаяў да Паўла спіной, – на Мадагаскары ваенны пераварот.

– Голас, асаблівасці прамаўлення падаліся Паўлу знаёмымі, нават нейкімі роднымі. Павел стаў бокам, каб бачыць мужчын.

– І што? – няўцямна ўставіўся на таго, хто гаварыў пра Мадагаскар, другі мужчына. Твар меў шырокі, з валявым падбароддзем, высокі лоб не хавала і велікаватая цёплая кепка ў буйную клетку.

– Вайсковы пераварот, – паўтарыў субяседнік, – і да ўлады прыйшлі гэтыя...сіфакі.

– Што? Якія сіфакі?

– Я так пачуў. Па радыё перадавалі. Тут, у буфеце. Яшчэ да дванаццаці.

– Ты глухі! – заявіў другі мужчына і выцягнуў з торбы, якая вісела пад столікам, адкаркаваную бутэльку віна. Яны выпівалі – бутэлька была схавана ў падвешанай торбе.

– Ты хоць ведаеш, хто такія сіфакі? – спытаўся высакалобы, выпіўшы.

Гаварылі яны па-мясцоваму, на тутэйшым дыялекце, устаўлялі часам рускае, польскае, а то і ўкраінскае слова. Гэтак жа гаварылі ў Паўлавай вёсцы, і гэтая акалічнасць, а таксама тое, што яны несумненна чакалі ранішняга цягніка, пераканалі Паўла ў тым, што яны землякі, нават ці не аднавяскоўцы.

Павел уважліва паглядзеў на мужчыну ў целагрэйцы.

«Дык гэта ж Заранок! Іван Заранок, бацька Лены!» – пазнаў ён чалавека са спіны і абрадаваўся. Чаму абрадаваўся – і сам не ведаў.

– Сіфакі? – перапытаў Іван, зняў кепку і пашкроб залысіну. – Афіцэры такія, не?

– Гэта, братка, абіззяны такія, – патлумачыў другі і дастаў з кішэні плашча чырвоны пачак пакамечанай «Прымы». – Ідзём пакурым. А студэнт папільнуе нашыя торбы, – добразычліва папрасіў ён Паўла. Хлопец кіўнуў у знак згоды. І другога чалавека ён пазнаў. Гэта быў сын старога хутаранца Манюка. Раней, да студэнцтва, Павел дзядзьку Івана бачыў часта, хоць той жыў на другім канцы вёскі, а вось з Манюковым Яшам не сустракаўся даўно. Малады хутаранец недзе ўсё ездзіў па заробках. Часам браў з сабой дзядзьку Івана. Яны, па ўсім было відаць, вярталіся з заробкаў. Паўла ні Іван, ні Яша не прызналі. Зрэшты, потым, у міліцыі, яны яго і прызналі, і пазналі. Як роднага. Але да міліцыі было яшчэ паўгадзіны.

**10**

Калі аднавяскоўцы выйшлі, напала на Паўла пачуццё, якое нельга было стрымаць: нейкая жальба не жальба, смутак, сум, невыказная, непраясненая туга па нечым важным, найважнейшым у жыцці, чаго ён не ведаў. Дзе яго знайсці, дзе ўбачыць і адчуць? Яно часта прыходзіла ў снах, а тут наяве выплывала з сярэдзіны, з самых патайных закуткоў ці то памяці, ці то душы...

Павел цяжка ўздыхнуў. Ён уявіў, што тая ісціна, якая ўсё ж павінна яму некалі адкрыцца, знаходзіцца ў нейкім доме, хаце, і перад усімі хатамі такая хата будзе найважнейшай. Ёй належала стаяць у пракаветных цяньках сярод густога лісцёвага лесу з дамешкам векавечных соснаў. Сонечныя плямы бегаюць ад гульні ветру ў вершалінах па жоўценькіх смалістых сценах; яна, гэтая хата, вабіць да сябе, абяцае не простых уцех і звычайных радасцей побытавага жытла. Тут будзе табе цяпло не падобнае на ўтульную гарачыню напаленай печы, і будзе табе абяцанне не той ежы, пахаванай па каморах у дзежках і кублах. Бо гэтая хата багацейшая за ўсе багатыя хаты, ніякі самы заможны гаспадар не паставіць такую. Бо гэта – хата жыцця, жыцця на лясной паляне, яснай ад сонечнага бляску і гульні святлаценяў сярод дрэў, на дзедаўшчызне, у айчынным лесе, у радзімавым бары, дзе пануюць разлатыя, пазаплывалыя смалой сосны, абстаўленыя спакойнымі дубамі і меланхалічнымі грабамі. А зверху ўсё пакрыта, нібы гонтай, бліскучай сінечай сонцаззянага неба, а ўночы ўпрыгожана пацеркамі невычэрпных зор.

Вакзал жыў сваім начным жыццём. Хадзілі бяздомнікі, нейкія цыганы прасілі ў буфетчыцы цёплай вады...

...Магла гэткая хата-харома бытаваць не толькі ў Чэрнехавым лесе, – так звалі лес каля Паўлавай вёскі, але таксама ў Мядзведжым лесе, тым, ад якога засталося толькі найменне, бо лесу даўно няма. Колішні лес прарастае дубчыкамі і атожылкамі-гучкамі былых дрэў на адхонах каналаў, на лугах і палетках, спеюць паўзпалявыя дарогі чырвоныя суніцы, ды выгорвае часам плуг трактара, нібыта мамантавыя клыкі, тоўстыя смалякі або дубовыя карані, як сведчанне тых дрэў, якія былі сучаснікамі праваслаўных князёў Радзівілаў і Астрожскіх...

Павел уздыхнуў, бо разумеў, што ягоныя адчуванні, якія так уладна запаўнялі ўсю ягоную істоту, нейкім чынам закраналі больш сучасныя пласты свядомасці.

Калі ён усё-ткі нарадзіўся з гатовым адчуваннем хаты, домы, харомы, у якой схавана ісціна жыцця, дык імёны з айчыннай гісторыі ён мог засвоіць пазней, нават не ў школе, але на факультэце. І гэты ўздых, і ўсведамленне месца вучобы падкрэслівала, што візія ягоная сплецена з мінулага і цяперашняга, ёсць прадукт ягонай душы, псіхікі, і яму далёка да таго своеасаблівага трансу, шаманскага, чараўніцкага шаленства, валашэння, старажытналіцвінскай валшбы. Гэта нават цяжка назваць медытацыяй. Якая медытацыя, калі вось-вось прыйдуць аднавяскоўцы?

...У душы цепліцца надзея, гадуецца радасная думка: гэта не людзям спатрэбіўся старажытны бор на

бярвенні, на дошкі, не жыццёвая прастора пад урадлівы палетак, але наадварот, – гэта бору, знішчанаму Мядзведжаму лесу мелася патрэба нарабіць людзям бярвенняў і дошак на хаты, вызваліць галу пад рунь. А сам лес заснуў пад зямлёй да пары да часу, і гэтулькі мае сілы, што цяжарная ад тысячагадовай шлюбнай тупні па ёй зямля пачынае разраджацца дзеткамі-асінкамі і дубкамі.

І як толькі кіне чалавек зямлю, нават проста няўвішней будзе яе абрабляць – дрэўца за дрэўцам вернецца лес на ранейшыя паляны і пагоркі, балацявіны і закоты. І самі па сабе заплодзяцца сярод маладой рослі туркаўкі і дразды, самі знекуль набягуць зайцы і соні, заплодзіцца сама па сабе рысь, вавёркі створацца самі сабой у гарэшнікавых градах, што нібы фарпост стануць сваёй гушчынёй і непралазнасцю аберагаць сярэдзіну лесу ад няпрошанага госця. І як патаўшчэюць ясені і вязы, як загусцее на вырубцы маліннік ці будзе дзівам, калі ў тым лясным краі буры мядзведзь устане на заднія лапы і вышкрабе жоўтымі кіпцюрамі на бярэзіне магічныя знакі сваёй матэрыяльнай прысутнасці на гэтым свеце разам з намі...

Пачуліся галасы аднавяскоўцаў. Яны спрачаліся за нейкія грошы. Буфетчыца падпраўляла прычоску, цыганы ў пачакальні клаліся спаць на цэментавай падлозе...

«Не, не вернецца Мядзведжае на сваё месца, – падумаў Павел. – Яно гэтак заўзята высякалася, вытралёўвалася, выгорвалася, выпальвалася і выкарчоўвалася, што трэба чакаць сто, дзвесце гадоў, каб убачыць яго такім, якім яно было спрадвеку... Так што супакойся. Ты фантазіруеш, нешта прыдумляеш, гэта не лес у табе фантазіруе. Ты на нейкі момант даў лесу дазвол пакарыстацца сваёй галавой, але на момант. Бо ўжо скочваешся да экалагічных ламентацый...»

Ён сёрбнуў кавы. Кава была ледзь жывая.

Аднавяскоўцы зайшлі ў буфет і пры староннім чалавеку перасталі спрачацца пра грошы, а вярнуліся да ранейшай тэмы.

– Ты, Іван, нешта не тое пачуў, – сказаў Яша.

– Не тое, – са згодай уздыхнуў Іван. – Такое радыё, хрыпіць: вайна пачнецца, не будзеш ведаць, у які бок уцякаць.

Яша намацаў пад столікам бутэльку.

– Ведаеш Колба? – сказаў Іван. – Дык вось, я табе цэлае лета не хацеў расказваць, каб ты з мяне не смяяўся. А цяпер раскажу...

Яша на мігах прапанаваў Паўлу пачаставацца. Хлопец адмовіўся.

– Колбавы хлопцы выцягнулі з ракі дубовую калоду, і з той калоды выпаў манах. Не шкілет, не муміё тое, а жывы чалавек.

– Чыхня якая! – паморшчыўся Яша. – З чаго тут смяяцца?

– Ты Яшко, не спяшы, – Іван асцярожна ўзяў перапоўненую шклянку, – упярод бацькі ў пекла. Той манах ляжаў у мёдзе. Як дуба выцягнулі, манах абагрэўся на сонцы, выпаў, стаў хадзіць і гаварыць.

– Іван, прабач мне, – сказаў Яша. – У гэта паверыць аніяк не магу. Хоць ты мяне зарэж... У сіфакаў – калі ласка, у марсіян – на ўсе сто, у камунізм – заўжды гатовы! – Яша нахіліўся да Івана: – А ў манаха – выбачай, Іване...

Павел адвярнуўся ад землякоў. Яму было сорамна. А як даведаюцца, што аўтар гэтага дурнога розыгрышу – ён? Зрэшты, ну і што? Кепска, што Лена паверыла.

І, відаць, бацьку ліст напісала. А старому чаго не верыць? Калі ў яго сіфакі на Мадагаскары вайсковы пераварот зрабілі.

Але і гэта не бяда. Бяда з самой Ленкай. Яна ўжо дзесяцікласніца, ёй летам стукнула семнаццаць. Летась, на станцыі, ён толькі пасмейваўся з яе. А цяпер? Што будзе цяпер, як гляну ў вочы?

І што ўсяго было крыўдней, яго мучыла, прыпякала рэўнасць да Міхася. Цікава, да брата не раўнаваў, а да Міхася раўнуе. Чаму?

Каб не рэўнасць, пачуваўся спакайнейшым. Раней і не глянуў на бледнатварую, з сіняватымі ценямі пад вачыма дзеўчынку, якая хадзіла за ім, а ён, абармот, ні разу не правёў яе, не танцаваў, за руку не ўзяў. Лічыў, адным словам, дзіцем горкім.

Цяпер за ягонай спінай стаяў яе вясёленькі бацька, Іван Заранок, і пераказваў гісторыю, якую Павел ужо не мог і слухаць. Кава зусім астыла, ён дапіў яе і замовіў яшчэ адну шклянку.

– А я не так чуў, – сказаў Яша, выціраючы вялікай насоўкай спацелы высокі і шырокі лоб. – Думаеш, я не чуў? Думаеш, мне не пісалі летась? О-о, я чуў, што гэта не зусім манах, тоісь не мужык, а баба. І баба гэтая – Варапаіха Ліда, ну тая, з баптыстаў, што па пяць разоў на дзень хату мяце. Яны святую з яе хочуць зрабіць.

Яна ж лечыць.

– Глупства, – заўпарціўся Іван. – То быў мужык. Мужчына.

– Ты бачыў? Ты не хочаш прызнавацца, што пакуль ты ездзіш па заробках, твая жонка з дзецьмі стала хадзіць да баптыстаў? То ўсё выдумкі Варапаіхі, быццам у яе ёсць святое пісьмо! Эх, што за жысць у іх...

– Ну, не скажы. Яны, баптысты, харошыя людзі, – не згаджаўся Іван. Павел ведаў, што ён пачынае

заводзіцца. – Яны не п’юць, не кураць, – працягваў Іван. – Але ты да мяне чаго прычапіўся – я не баптыст.

– Ты – не баптыст? Ты мяса цэлае лета не еў – і не баптыст? І да дзяўчат не хадзіў.

– Куды мне дзяўчаты, я стары. Мяса не еў, але ж сала еў...

– Чуў я пра іх, пра гэтых баптыстаў, – ухмыльнуўся Яша. – Мяса не ядуць, а да жанчын такія спраўныя.

– А табе дзела? – абурыўся раптам Заранок. – У морду хочаш?

«Пачынаецца, – падумаў Павел. – Гэты не сцерпіць, а той ужо раскачагарыўся...»

– Спачатку пакурым, адкаркуем апошнюю, а потым пойдзем біць мне морду, –з наканаванасцю сказаў Яша і зноў дастаў чырвоную і пацёртую пачку «Прымы».

Але разззлаваны Іван курыць не пайшоў, а са злосцю пачаў састругваць нажом пластыкавы корак з бутэлькі, ужо не таячыся. Пры гэтым ён чамусьці брыдка і гучна лаяўся. Буфетчыца з тупасцю пазірала на мужчын, ад начной санлівасці яшчэ не знаходзячы ў сабе энергіі разагнаць выпівак. Але калі пачула крык, дастала люстэрка, падмазала губкі і некуды сышла. Неўзабаве ў буфет зазірнулі міліцыянты, два маладыя хлопцы.

Трэба было хаваць бутэльку. Шыракалобы Яша Манюк злосна прашыпеў:

– Стары дурань, хлопцу аддай, хлопцу... Дай сюды, я сам аддам.

**11**

Каб чытач лепш уяўляў адносіны Яшы і Івана Заранка, варта патлумачыць, што стары Манюк, Яшаў бацька, як ужо гаварылася, сядзеў на хутары і яго на вёсцы не любілі. Зайздроснікі сцвярджалі, што ён мільянер – мае на кніжцы сто тысяч паўнавартасных савецкіх рублёў. А ў Заранка, акрамя Лены, было яшчэ трое дзяцей, а багатага бацькі, такога як Манюк, не было. Даводзілася зарабляць.

У той момант, калі Яша перадаў Паўлу пад столік раскаркаваную бутэльку, Іван Заранок стаў узірацца на Паўла і нечакана прызнаў у ім крыўдзіцеля ягонай дачкі.

Не звяртаючы ўвагі на міліцыянераў, гучна выказаўся:

– Яна табе паверыла! А ты што вытварыў?

Самае непрыемнае, што магло здарыцца, здарылася. Гэта як закон. Калі будзеш думаць пра кепскае, яно абавязкова здарыцца. Вывад: ніколі не думаць пра кепскае.

Трэба думаць пра добрае, станоўчае, шчаслівае.

Міліцыя забрала і Паўла. Нават не сказалі класічнае – дыхні. Убачылі раскаркаваную бутэльку ў руках (так і не прыдумаў, куды запіхнуць, ды і не было калі), загадалі – пайшлі, у пастарунку разбяромся. І як ні аднекваўся, што не піў, міліцыянты былі няўмольныя.

Ва ўчастку міліцыянеры моўчкі сталі афармляць пратакол. Спачатку на Івана, потым на Яшу. Той прасіўся – адпусціце нас, прыгарадны цягнік ад’язджае раніцай. Наступнага аж да абеду чакаць, згубіцца дзень.

Павел быў упэўнены, што яго адпусцяць, але вочы ў яго палезлі на лоб, калі ўбачыў, што і на яго складаюць пратакол.

– Што вы робіце, – занерваваўся ён, – мяне з універсітэта выганяць!

Міліцыянты толькі ўхмыльнуліся. Павел стаў пратэставаць, заявіў, што будзе скардзіцца.

– Ціха ты, – параіў яму Яша. – А то транспартная міліцыя здасць у гарадскую. А тыя пасадзяць у выцвярэзнік. Нават цвярозага. Хто будзе цяпер, уночы, разбірацца. А гэтыя складуць пратакол, а заўтра раніцай за дзве бутэлькі ты яго забярэш. Толькі да дзевяці гадзін трэба забраць, пакуль яны зводку не здалі. Сядзі, маўчы. Складуць пратакол, ну, улепяць штрапу, і ўсё. А будзеш гізаваць – пераначуеш у выцвярэзніку. Я табе кажу як вопытны чалавек...

– Я ведаю, я – адчуваю! Гэта ён на нас міліцыю наслаў! Ён – майстар. Ён можа. Ён і не такое вытвараў! – гаварыў Іван Заранок.

На Паўлава шчасце прыйшоў начальнік тых сяржанцікаў, якія затрымалі іх.

Пажылы, чараваты дзядзька. Пакруціў у руках дакументы, сказаў:

– Ва універсітэце вучышся? На якім факультэце? Ах, на гістарычным. І мой на гістарычным. Мо ведаеш Аляшкевіча.

– Ведаю, – схлусіў Павел.

– Эх ты, студэнт, – расчаравана ўздыхнуў міліцыянер. – Як жа ты яго ведаеш, калі ён у Гомелі вучыцца, а ты ў Мінску? – Міліцыянер неадабральна зіркнуў на Паўла. – Усе вы, студэнты, трусіцеся, каб вас не выгналі. За гэтую справу, – міліцыянер пстрыкнуў пазногцем па рыльцу адкаркаванай бутэлькі, якая стаяла на стале ў якасці рэчыўнага доказу. – А майго выключылі за так званы нацыяналізм.

Міліцыянер уздыхнуў і сказаў ісці. Нават загадаў забраць з сабой бутэльку.

Павел зразумеў, што ніякага пратаколу не будзе.

Ленінага бацьку і Яшу адпусцілі перад самым адыходам дызель-цягніка.

Павел адвярнуўся, калі ўбачыў іх, і пайшоў у канец дызеля. Але неўзабаве яны знайшлі яго.

– Дзе наша бутэлька? – запытаў дзядзька Іван, сеўшы побач. Яша зайшоў з другога боку, сеў, абняў Івана.

– Эх, нягоднік, ты ўвесь пакрыўся гусінай скурай у той міліцыі. І цябе адпусцілі... – іранізаваў Яша. – А мы... Мы цэлую ночку пракантаваліся на мулкіх лаўках... Наша міліцыя нас беражэ, спачатку скуру злупіць, патом сцеражэ! Кажуць, да цябе свякруха Ліды Варапай баслаўляцца прыязджала? Прызнайся, прыязджала! А хто адрэзаў каню грыву? А як па вадзе ты хадзіў? У чым сакрэт?

Павел быў бледны.

– А мо той манах і напраўду быў, хто ведае? – мармытаў Іван Заранок. – Мне расказвалі, як адзін машыніст цеплавоза ехаў сабе, рука на рэгулятары хуткасці.

Спакойны, фуражка без пылінкі вісіць на нікеляваным гачыку. А тут чмо нейкае па шпалах тралюе. Ды яшчэ рукой крыжы кладзе на цеплавоз. Чокнуты! Точна чокнуты! Саскочыў з рэек перад самым носам. Дык гэта не ты быў?

Павел з кіслай мінай паківаў – маўляў, не, не ён. Аднавяскоўцы крыху памыркалі, потым пераселі, прыхіліліся адзін да аднаго галовамі і паснулі.

Некалькі хвілін Павел глядзеў у акно, за якім плылі вольхі, мільгалі купы лазняку, прасціралася прырэчнае, каля Прыпяці, балота. На небакраі часам узнікала далёкая, замглёная ў ранішняй асмузе лінія лесу. Лес! Павел заплюшчыў вочы і паспрабаваў вярнуцца да харомы на лясной паляне...

Яна быццам паслухалася яго, з’явілася адразу. Сцены яе былі відаць у лесе толькі дасведчанаму, адыдзіся за пару крокаў, і нічога няма, толькі дрэвы.

«Вось што можа абудзіць простая лінія лесу на небакраі, калі едзеш у цягніку», – падумаў Павел і расплюшчыў вочы. Дзядзькі спалі.

«Як пакажуцца знаёмыя мясціны, трэба разбудзіць... – Ён зірнуў у акно, зноў убачыў лінію небакраю. – Што можа параўнацца з гэтай лініяй, намаляванай вершалінамі дрэў, па сіле ўздзеяння на чалавека-летуценніка? Колькі ўсяго яна абуджае ў душы?!»

На развітанне Яша падаў руку і глыбакадумна, хоць не без іроніі, сказаў:

– Не перажывай, перамелецца – мука будзе. Я вось што табе скажу – чым грашыў, тым і будзеш пакараны...

Сказаў і накіраваўся на свой хутар. Падаў руку і Іван Заранок, відаць, ісці разам дахаты яму не хацелася. Нават сказаў:

– Ідзі, у цябе маладыя ногі.

Толькі тут Павел усвядоміў, што ў старога Заранка вушы, якія тырчаць з-пад кепкі, рыхтык як у Лены – верхняя частка крыху адтыркваецца. Гэтая асаблівасць вушэй і яшчэ рыскі-маршчыны на падбароддзі надавалі твару выраз заклапочанасці і трывогі. Калі Іван Заранок, ды і ягоная дачка Лена пасміхаліся, то можна было падумаць, што яны крыўдзяцца.

Цяпер дзяўчына «ходзіць» з Міхасём Сінчуком. Што паміж імі? Каханне, звычайнае ўхажорства? Чым я горшы за Міхася? Ён з твару чорненькі, дробненькі, ды і невысокі. Уга, ты яшчэ стань перад люстэркам, разглядвай сябе і плач.

Вечарам таго ж дня Павел быў у клубе на танцах, дзе спадзяваўся сустрэць Лену. Сустрэў дзяўчыну нечакана – яна разам з сяброўкай выходзіла з клуба.

«Няўжо гэта Лена?» – не паверыў вачам Павел. Але яна і змянілася! Расцвіла, як тая Мележава Ганна. Ну не мог ён летась палюбіць дзеўчынку з мазолістымі, як у вярблюда, каленкамі ад вечнага сядзення ў градках. Усяго год прайшоў, і на табе.

Што робіцца з дзеўчынкамі-падлеткамі? Яны становяцца фанабэрнымі, нязноснымі ганарліўкамі. Яны круцяць хлопцамі, як хочуць. Вось і цяпер яна нешта піскнула заміж прывітання, успыхнула, але потым, нібы нешта ўспомніўшы, адвярнулася і выйшла з клуба. Потым прыйшла, але ўжо не адна.

Павел крадком, а то і ў адкрытую назіраў за Заранчыхай. Куды падзеліся рыскі-крывулякі з падбароддзя? Цяпер, калі Ленка смяялася, яны ўсё ж з’яўляліся, але цяпер яны прыдавалі твару зусім іншы выраз і выклікалі зусім іншае адчуванне – яны прыдавалі твару своеасаблівую пікантнасць. Нават вушы дзіўным чынам выпрасталіся. Ды і валасы ў Лены цяпер былі зачасаны па-іншаму.

Павел пазіркваў на Лену, яна пазірквала на яго. Але вось з’явіўся Міхась Сінчук. Буркнуў на Паўлава прывітанне здалёк, падышоў да Лены. І ў дзяўчыны адразу змяніўся выраз твару, іншым зрабіўся пагляд! На Паўла глянула ўпэўненая ў сабе жанчына, у якой ёсць свой мужчына. Яна глянула, а Павел Камар нібы ўвесь абмярцвеў – прачытаў у яе вачах, што яна ведае ў свае семнаццаць пра жыццё больш, чым ён у свае дваццаць тры.

– Я ж у цябе верыла... А ты?! – казаў гэты пагляд. – Цяпер у мяне ёсць той, каму можна верыць.

Павел зразумеў, што размовы з Ленкай не выйдзе. Яна проста не захоча высняць з ім адносіны. А то яшчэ возьме і скажа яму пра ўсё, што пра яго яна думае.

Пры Сінчуку яна смелая.

І Пятро не паможа, бо стаіць не з імі. За год яго выгнала ў вышыню, як той дубец, ён займаўся ў

валейбольнай секцыі, і ад празмернага росту пачаў нават крыху горбіцца. На размову і шчырасць з Паўлам таксама не ішоў, пашчыпваў маладыя, ні разу не голеныя вусікі і адказваў аднаскладова: «Так», або «не». Відаць, усе ўтраіх яны вырашылі, што Павел лічыў іх за дурняў.

Нечакана ў клубе знікла святло. Некаторы час чакалі – можа з'явіцца ток? Але не з'явіўся, сказалі – «выбіла трансфарматар». Ні кіна, ні танцаў не будзе. Сталі разыходзіцца. Павел выйшаў на вуліцу, стаў слухаць галасы, каб дазнацца, дзе Лена.

Канечне ж, яна была з Міхасём – ён праводзіў дзяўчыну дахаты. Павел дагнаў іх.

– Слухайце, маладыя людзі, трэба пагаварыць.

– Няма пра што, – сказаў Міхась. У ягоным голасе чулася няўпэўненасць. Але Лена хіхікнула, і гэта вырашыла ўсё. Не, яны не абзываліся, не кпілі, не абвінавачвалі. Вось Лена гэтак во хіхікнула – і гэтым сказана ўсё.

«Што ж я нарабіў! – падумаў Павел. – Як адбяліцца?»

Не, проста так ён не здасца. У яго ўзрост, розум, вопыт.

Павел пакіраваўся следам за парачкай. Тыя не бачылі яго – моладзь ішла з клуба бязладным гуртом. Павел чуў то голас Міхася, то галасок Лены, бо яны пра нешта гаварылі, часам сцішаючы голас. Падышоў так блізка, каб разбіраць словы.

Канечне ж, яны гаварылі пра яго.

– Паставіў вочы праўцом і давайце пагаворым, як нічога не адбылося.

Падбухторыў Пятра... – казала Лена.

– Пад'юдзіў... – удакладніў па-свойму Міхась.

– Не, не пад'юдзіў. Пад'юдзіць – гэта спакусіць на здраду. Там святы быў чалавек, сапраўдны манах, а гэты хто?

«Во, во, – падумаў Павел. – Астыла, перастала адчуваць да мяне хоць нешта. І вось, як вынік: «а гэты хто?» Як любіла, то быў «хто». Не, кананне дохлага вераб'я – вось што ёсць тваё каханне. Забудзь. І думаць перастань. Яна – не твая».

**12**

На другі дзень пасля прыезду Павел зазірнуў на могілкі паглядзець на помнікі, падумаць пра тых людзей, якія ляжаць пад імі. Чытаў знаёмыя і незнаёмыя прозвішчы, лічыў, колькі жылі людзі свайго веку. Якімі яны былі? Ілжывымі, хцівымі, распуснымі? Ці праўдалюбамі, на чужое не глядзелі, дбалі пра сваё? Паклёпнічалі, часалі языкамі, ці пераважалі гаварыць праўду, або жылі моўчкі, ужо задаволеныя тым, што жывыя?

Вунь ты некалі ў дзяцінстве ўбачыў анёла, уласнага анёла, выглядаў ён, што чарцяня. Цяпер зразумела, чаму чарцяня. Нешта трэба мяняць, жыць па-іншаму.

Выйсце – прасіць прабачэння. У Пятра, у Сінчука, у Лены. Можа, і даруюць.

Канечне ж, даруюць.

За такімі развагамі Павел раптам убачыў каля царквы, на асветленым сонцам прагале, нешта незразумелае. Не ўбачыў, а хутчэй адчуў. Яно, незразумелае, ляжала на дубовых галінках і жалудовых шапачках, што звычайна нападаюць пад густымі дубамі, і было празрыставатым, амаль нябачным. Яно ляжала сабе і песцілася ў цёплых яшчэ промнях вераснёўскага сонца.

«Гэта душа, – пранеслася ў думках. – Твая душа... Не галюцынацыя ж гэта!»

Тое нешта, што ён бачыў, нібы заўважыла, адчула ягоную прысутнасць, і нібы не захацела паказваць яму, Паўлу, сваю наяўнасць, пачало рабіцца меншым, празрысцейшым, зусім невідочным, і ўрэшце знікла, як і не было.

Павел працёр вочы, патрос галавой. Потым падышоў да таго месца, дзе толькі што яму прымроілася тое, чаму ён даў азначэнне душы.

Тройчы яму бачыліся, адчуваліся рэчы, якія, наколькі ён ведаў, не адчувалі і не бачылі іншыя. Пыхлівец! А можа, людзі і не такое бачаць, але маўчаць сабе паціхеньку? Ты ж хочаш аб'явіць на ўвесь свет пра тое, што табе здаецца!

Ён зноў стаў глядзець на помнікі, і быццам бачыў розных людзей. Яны жылі, любілі, нараджалі дзяцей, пакутавалі, паміралі. Што галоўнае ў іх жыцці было, цэнтральнае? Яны любілі сваю зямлю? І зямлю любілі. Любі і ты, яна цябе апошняя абдыме. Любіць зямлю, родны край, у якім павінна стаяць – на яве ці ў вымысле – тая харома, да якой так блізка быў падступіўся, калі выабражаў на вакзале, а потым у цягніку. Тады скончыў на тым, што ў кожнага чалавека, асабліва вясковага, ёсць вобраз роднага дому, роднай хаты, у кожнага – канкрэтны. І часцей гэты вобраз заснаваны на традыцыйнай забудове – чатыры сцяны, двух-скатны дах, шэсць-восем вокнаў, прыбудоўка. І як дадатак да гэтых не надта багатых архітэктурных вымуд-раў – яшчэ адзін дах з галін бярозы, клёна, ясеня. Паветра пад гэтым жывым навесам заўжды сіняватае.

– Не, – прамармытаў Павел і прыхіліўся спінай да сцяны царквы, – важна не блытаць паняцце дома,

хаты з паняццем Домы. Паняцце Домы ёсць больш важным за паняцце хаты. Тады гэта і будзе Харома...

– Вось так, з вялікай літары належыць гэтае слова ўжываць, – уголас адзначыў Павел.

...Зрэшты, дом і ёсць Харома. Бо гэта родная хата кожнага, кожнаму ў гэтай Хароме прызначаюць і ўстаўляюць у цела душу. Стаіць Харома пад шатром з кляновага галля, сонечныя плямы бегаюць па яе свежым, вечнасвежым зрубе з цукровымі, такімі пахкімі падцёкамі смалы. Гэта ладан і міра нашых ваколіц, нашай зямлі. Ужо само месца сярод лесу, дзе яна пабудавана, дае адчуванне цэласнасці і гарманічнасці жыцця. І такія штрышкі ў агульны партрэт Харомы, як цяпло ад печы, ледзь улоўныя пахі ежы, што ствараюць каларыт яе жыллёвай утульнасці, не пярэчаць таму факту, што плоцевае ёсць антытэза духоўнаму. Яно непарыўна сплецenae, пераходзіць адно ў адно, духоўнае няўлоўна перацякае ў плоцевае. Як на чыста утылітарнай рэчы – ручніку, тчэцца кодавы знак роду, гурту павязаных паміж сабой людзей, усяго народа – абярэг людзей, крыжападобная зорка, сімвал асвечанай дарогі ў іншасвет.

– Эйш, куды занесла, – мармытнуў Павел. – Філёзаф! Вяртайся да хаты, да Домы, да Харомы.

...Харома мелася. Як увайсці ў яе? Як апынуцца ўсярэдзіне? Ёсць дзверы, і ёсць замок. А калі ёсць замок, мусіць быць і ключ... А ці не Святавітава зорка ключ ад

Харомы? Была, была ў памяці разгадка гэтага ключа...

І тут ён пачуў жаночыя галасы. За царквой сярод хмызоў бэзу нейкія жанчыны прыбіралі магілку. Павел прыслухаўся.

– Гэта той Камароў сын. Усё выабражае, – расчуў ён. – З братам Заранкову дзеўку абхлопваюць, абхлопваюць, а замуж не бяруць.

«Вось як людзі мяркуюць, – падумалася з прыкрасцю. – І ты добры – знайшоў месца для свайго занятку»...

На другі дзень Павел пад абед папярэдзіў маці, што хоча паглядзець грыбоў– надыходзіла апенькавая пара. Накіраваўся ў мясціны, дзе не раслі грыбы – каб ні з кім не сустрэцца. Выйшаў на край лесу, далей чарнела перааранае поле, якое пераходзіла ў асушаны тарфянік, парослы калючым непралазным ажынішчам. Самае месца...

– О, узгоркі, равы і лагі Белай Русі, ліцвінскай дзяржавы, мілага краю, дзе нарадзіўся, рос і атупеў канчаткова – як вы мне мілы! – з самазнішчальнай іроніяй усклікнуў Павел, упэўнены, што яго ніхто не чуе і не бачыць. – Пачынаю розумавае рабенне, каб пераканацца, што не такі ўжо я і дурань.

Павел сеў на ўзлеску, ахапіў калені, заплюшчыў вочы... З чаго пачаць?

...Ключ быў, і гэта давала найпрасцейшую мажлівасць зайсці ў родны дом, мілую Харому на лясной паляне, бо ў такую пабудову не лезуць праз вокны, не разбіраюць дах і не прабірацца праз слухавое акенца ў франтоне... Але дзе быў той ключ? У кішэні? Не, ключы ад іншасвету ў кішэнях не носяць. Такія рэчы вісяць на грудзях на шаўковым шнурочку. Рука намацвае на грудзіне той самы ключ, які ўбачыўся ва ўяўленні. Вось яна, адмычка ад ўсіх скарбаў свету. Гэткі самы, як і ўяўляў. Вялікі! Выкаваны з чорнага жалеза. Ледзь змяшчаецца ў далоні, калі палажыць адным канцом на запясце, другі кладзецца на падушачкі пальцаў. Цэўка, таўшчынёй са школьны аловак, бародка з фігуркамі ў выглядзе – несумненна, і толькі так! – васьміканцовай зоркі. Ага, цяпер куды гэты ключ устаўляць?

Далей справа не пайшла. Шумеў, перашкаджаў вецер, прасвісталі крыллем над галавой сытыя вераснёўскія галубы, недалёка перад сабой убачыў прыгожы падасінавік – усё адцягвала ўвагу, усё перашкаджала.

– Нешта не тое... – мыркнуў Павел, і вырашыў памяняць месца. Не забыўшы зрэзаць чырвонагаловік, перайшоў з узлеску, уздоўж якога ішла палявая дарога, глыбей у лес, знайшоў маленькую палянку, сеў пад сасну на тоўсты пласт нечапанай ігліцы.

За дрэвамі на ўзлеску замільгала жаночая вопратка. Па той дарозе, якая ішла паўз узлесак, нехта ехаў на ровары. З дарогі, прыгледзеўшыся, можна было ўбачыць яго, Паўла, але веласіпедыст, немаладая жанчына, глядзела перад сабой. Каб не патрапіць ў недарэчную сітуацыю, Павел не зводзіў нейкі час з жанчыны вачэй.

Вось яна схавалася за дрэвамі, думкі і пачуцці запаланілі ўсю ягоную істоту. Не перашкаджалі ні вецер, ні ігліца, якая часам сыпалася на галаву і нават калола шыю.

Павел глыбока засяродзіўся ў самога сябе.

**13**

...Павел выразна і адчуваў, і бачыў Харому, як вось бачыў і тую жанчыну-веласіпедыстку. Але няўцям яму было, што кабета нечакана спынілася, азірнулася і ўгледзела чалавека пад сасной. Сядзіць і не варушыцца, як нежывы. Хто гэта?

Грыбнік, ці проста так, гуляцель. Жанчына злезла з ровара і ад цікаўнасці вырашыла падысці бліжэй.

Павел не заўважаў жанчыны – занадта паглыбіўся ў нетры ўласнай свядомасці...

...Вось ён – замок. Адсунуць ад замочнай свідравіны металёвы язычок. За ім і хаваецца ўваход у іншасвет, вузкі часавы канал, дакладней, бясчасавы, бо там, за дзвярыма, невымоўна прыгожа афутраванымі, іншыя вымярэнні і часу, і прасторы, іншыя паняцці і разуменні. Там свае каштоўнасці.

«Во дзіва, – заўважыў сабе Павел, – цела не адчуваю. Галава варыць, а ні рукой, ні нагой не варухнуць. Як у таго манаха... Стоп! Што гэтая баба тут робіць?

Вытрашчылася і глядзіць... Не, ты хутчэй адмыкай дзверы ў Харому, у цвердзь, у замак, у палац, пакуль дадзена! Бо гэтая Харома належыць табе ад нараджэння, скроена паводле ўзору тваёй душы... Гэта і ёсць той храм, які шукае пераўвасоблены табой манах...»

Першую фразу жанчыны Павел не пачуў – быў замкнёны ў свае відзежы. А яна падышла з веласіпедам у руках зусім блізка і ўважліва прыглядалася да яго.

Жанчына гаварыла, але толькі асобныя словы ўваходзілі ў Паўлаву свядомасць. Толькі праз пэўны момант словы зліліся ў фразы: «п’яны, чы шо?», «чы ты глухі?», «а чого ты сыдыш тута?»

Павел урэшце ашаломкаўся і пачуў жанчыну.

– Мо тобі погано? – спагадліва пыталася яна.

– Не, – матлянуў ён галавой. – Гэто я так задумаўся.

– А я думаю, шо з чоловіком робыцца. Ты з якого сыла, нішо я тыбэ ны познаю?

– Я наезжы, – схлусіў Павел і аж успацеў ад прыкрасці – па гаворцы жанчына магла зразумець, што ніякі ён не наезжы.

– Ну, дывысь, коб оно всё добрэ було... А я до магазіна хочу вашого подскочыты, там, кажуць порошок дішывішы, – патлумачыла жанчына, абвяла ровар вакол сябе, каб накіравацца ў бок Паўлавай вёскі. Калі жанчына закідвала нагу на раму ровара, ад яе павеяла пахам здаровага жаночага цела і мытага недарагім пральным парашком адзення. Яна паехала, а Павел заплюшчыў вочы і імгненна праваліўся ў бліскучы вір.

...Так, Харома твая, але не ты яе стваральнік, дойлід, не ты будаўнік – ёсць і Дойлід, ёсць і Будаўнік. Глядзі, цяпер ужо і не дзень, а надвячорак, іншы час. Вось ужо праз тоненькія галінкі бяроз свецяцца Касцы фіялетава-халодным калючым святлом, міргае Мілавіца. Іншых зорак не відаць. Адныя за хатай, іншыя за дрэвамі.

Ключ і ўстаўлены даўно, і павернуты, і за ручку на сябе дзверы пацягнуты. А сілы, змогі пераступіць парог няма. Адчуванне глыбокага, затоенага страху не пускае ўсярэдзіну. Мнілася, што там, у пакоях, на сценах вісіць зброя, старажытная халодная зброя – гэтак упрыгожана твая хаціна, твая Харома, Харома на лясной паляне.

І каля гэтай зброі – людзі.

«Што гэта ўжо... Зброя, людзі. Не, веласіпедыстка выбіла з рытму... – падумаў Павел. – Чаго ў лес не схавацца? Але там змрочна, настрой не той. Узлесак лепш.

З узлеску неба больш відаць... Неба надае энергетыкі...»

...Нарэшце, за многія стагоддзі я апынуўся ў хаце, ва ўласнай хаце, Хароме на лясной паляне, у якой мяне не было тысячу год. У грудзі ўліваецца паветра, насычанае пахам аржаной мукі, пахам мёду, пахам пазатыканага за бэлькі святаянніку-хварабою і крываўніку. Цяпер нельга ацэньваць, варта толькі запамінаць усё, што бачыш. Паўсюль вышыванкі, абрусы на сталах з чырвонымі кветкамі і крыжыкамі-абярэгамі. Пад нагамі ходнікі з чырвонай ніткай па краі. І так усюды чыста, нібыта тут ніхто і не жыве. Але ж ёсць людзі! Яны былі ў зал, выглядалі ласкавымі, дружалюбнымі. Яны немаладыя, хіба толькі некалькі юнакоў і дзяўчат з сумнымі, нібы замглёнымі журбой тварамі хаваліся за старэйшымі. Усе гэтыя асобы не звярталі на Паўла асаблівай увагі. Прыйшоў, дык і прыйшоў. І толькі адзін белабароды старэча ўрэшце глянуў на маю асобу (О! Я зліўся, сплёўся, зніатаваўся з уласным Эга!), хацеў нешта сказаць, але раптам пачуліся нязвыклыя гукі з гушчыні лесу: аддалены гул, глухаваты шум, які праясніўся, і вось цяпер выразна пачуўся тупат капытоў наўскач – і вось ужо выплылі з лесу вершнікі, цэлая кавалькада. І ўсё відаць, нібыта сцены Харомы шкляныя. Вось вершнікі разляцеліся па двары і загарцавалі на конях. Мужчыны пры зброі, жанчыны ў шыкоўных строях. І пачуўся гучны і ясны голас:

– У гэтай хаце жывы хто ёсць?

Той стары, які хацеў загаварыць са мной, адгукнуўся:

– У гэтай хаце ўсе вечна жывыя, Гаспадар.

Конь пад старшым вершнікам стаў матляць галавой, звінець цуглямі і біць капытам, аж дзёран ляцеў.

– Я пытаюся, плоцевы хто ёсць?

Хатнія, усе як адзін, глянулі на мяне. У іхных вачах свяцілася шкадаванне, невымоўны жаль.

– У Хароме на лясной паляне нельга заставацца доўга, – шапнуў белабароды.

– Няхай выйдзе, – прагучаў знадвору ўсё той жа чысты і гучны голас. – Лель! Вазьмі каня, а ты, Вялес, ссаджвай кабет.

– Ідзі сюды, – ціха сказаў старэча з белай барадой. Ён узяў мяне за руку вышэй локця і падвёў да сцяны. Паміж невялікімі карцінамі ў рамах ледзь абазначваліся дзверы.

– Ідзі. Калі-небудзь яшчэ вернешся, брат...
– Брат? Які я вам брат!
– У тым то і бяда, што ты лічыш сябе во іхным братам! – паказаў старэча на надворак.
– А яны хто? – задаў пытанне Павел (Усё, сувязь з Эго згублена!).
– Ты не пазнаеш Перуна? Табе не знаёмы Вялес, Цёця, Лада? – з жальбай у голасе сказаў стары. – Як ты не пазнаеш Мілавіцу, якую любіш больш за душу, якой пакланяўся, маліўся?
– Я-я? – збянтэжыўся Павел.
– А то не. Мо, скажаш, Перуну маліўся? Ці Вялесу пакланяўся? Не, галубчык, ёй адной, любачцы. Ідзі... Цябе чакае свет... Стой, – стары жэстам рукі спыніў Паўла. – Ты хочаш спытацца і не асмельваешся?! За што ты сюды дапушчаны, калі нічога не зрабіў? Так? Хутка даведаешся. Праз месяц прачытаеш, што «лжемудрствование приводит к бешению плоти». І перакладзеш, каб зразумець: ілжамудраванне прыводзіць да ўчарцянення плоці.
– Праз месяц... – прашаптаў здзіўлены Павел.
– Мы будзем цябе чакаць, брат. Ідзі...
А як ісці? У сцяну, ці што? У намаляваныя дзверы? Павел працягнуў руку ўперад. Дзверы паддаліся. Тады мусова апынуцца па-за Хатай, па-за Харомай на паляне, Харомай на лясной паляне...
– Халера, кусаюцца, – прашаптаў Павел і расцёр пакусаную рыжым лясным мурашом лытку. – Трэба завесці тут мурашкавых львоў... Ілжэмудраванне... Дзе гэта вычытаць, дзе?
... Як дзверы паддаліся, Павел апынуўся па-за Харомай, але ўсё яшчэ на паляне, перад сцяной са смалістых бярвенняў, з пазоў якіх вытыркаўся сухі мох. Калі абышоў будыніну і вызірнуў на двор, каб ўбачыць вершнікаў, са здзіўленнем выявіў, што ніякіх ні коней, ні людзей там няма, а ўвесь двор парос лебядой у чалавечы рост. Ды і не двор гэта, але ўзмежак лесу, і за гэтым узмежкам ідзе чорная ад блізкага тарфяніка ралля, а далей сам тарфянік, густа парослы ажынамі.
Сонца пачатку верасня стаяла на чатырох гадзінах. З захаду збіралася на дождж, і ўжо сонца раз-пораз хавалася за асмужыстыя аблокі. З усходу, ад ягонай вёскі, па палявой дарозе, выварочваючы бліскучы руль, вярталася з магазіна жанчына. Павел нават памахаў ёй рукой, калі яна праязджала паўз яго, але яна, відаць, спяшалася да дажджу патрапіць дахаты, таму нават не павярнула ў ягоны бок галавы.
Належала і яму ісці дахаты – хмары ўсё больш чарнелі. Здаецца, нават недзе прагрукатаў гром.

**14**

Калі табе крыху за дваццаць, і цябе распірае ад лішку ўласнай жвавасці, ты можаш вырабляць усё, што табе стукне ў галаву. Але ўсяго праз пару гадоў ты ўжо іншы, і табе сорамна, што ты быў здольны на розныя вычварэнствы. Калі ж увойдзеш з юнацтва ў маладыя гады, пераажывеш маладосць, першую і другую, дасягнеш залатой сярэдзіны жыцця, і нават зусім нечакана падбярэшся да сталасці, то тыя ўсе ўчынкі, што некалі лічыў за геройствы, пададуцца табе такімі бязглуздымі, што будзеш хапацца за галаву пры адным толькі ўспаміне пра іх і чырванець ад сораму нават у снах.
Нешта падобнае здарылася і з нашым героем, Паўлам Камаром. Скончыў ён універсітэт, паехаў па размеркаванні, стаў працаваць. І чым болей гадоў працаваў, тым меней карцела яму расказаць дзецям пра дзівоснае здарэнне ў адной вёсцы, калі вяскоўцы выцягнулі з ракі дубовую калоду і што аднаму студэнту стукнула аднойчы ў галаву.
Настаўнік мог расказаць і пра анёла-чарцяня, і пра віравога чорта, і пра тое, што бачыў уласную душу на дубовых галінках і шапачках. Але нічога гэтага ён не расказваў. Бо тады, пасля ягонай медытацыі на ўзлеску каля тарфяніку, праз месяцы два ці тры ён натрапіў у адной кнізе на фразу: «лжемудрствование приводит к бешению плоти». Стаў перакладаць на родную мову, і ў яго выйшла, як ужо некалі чуў, што «ілжамудраванне прыводзіць да ўчарцянення плоці».
І тады дайшоў да яго сэнс выразу і ўспомнілася, што пасля таго сядзення на ўзлеску, калі стаў збірацца дождж, і ўжо накрапваў, раптам разанула маланка ў сярэдзіну лесу і там нешта спорна, з гучным трэскам загарэлася. Ад цікаўнасці Павел накіраваўся туды, дзе гарэла. Мароз па скуры пайшоў, калі апынуўся на паляне, якую нядаўна бачыў у медытатыўнай візіі. Але скура сшэрхла, калі ўбачыў, што гарыць той самы дом, у якім толькі што быў. І гарыць так хутка, і такім гарачым і зіхоткім полымем, што вачам балюча. Але глядзеў і бачыў, як у агні зліваюцца адзін з адным Лада і Мілавіца, Лель і Цёця, Лада і Сварог. Яны былі адным, яны былі самім агнём. Як гэта дзецям раскажаш? Маўчы, цярпі, практыкуй, як той Махатма Гандзі, поўную Мауну, гэта значыць, моўчу.
А далей надышоў час перамен. Ачышчальная віхура татальнага выкрывальніцтва пранеслася па краіне. Зрабіліся даступнымі такія дакументы, што мурашкі па спіне поўзалі, калі чытаў. Лопнуў, як крыга, і стаў разбягацца паводле нацыянальных трэшчын «вялікі і магутны». Аднавілася свая, родная краіна, цяпер можна было расказваць дзецям гісторыю свайго, а не суседняга народа. Гісторыю вялікую, гераічную, трагічную.

Адбыліся змены і ў асабістым жыцці: Павел падаўся ў навуку, – паступіў у аспірантуру, – пераехаў жыць у сталіцу, ажаніўся, пайшлі свае дзеці. Год за годам Павел, цяпер выкладчык гісторыі ў адным са сталічных каледжаў, Павел Андрэевіч Комар, так упісана ў пашпарт, спрабаваў выбраць час, каб з’ездзіць на радзіму, пагаварыць, што называецца па душах са сваім настаўнікам гісторыі. Намер меў просты: абняць Мікалая Лявонавіча, пакаяцца і папрасіць прабачэння.

Нельга сказаць, што Павел не ездзіў у родную школу гэтулькі гадоў і не бачыў настаўніка. Быў і бачыў, і нават гаварыў з ім – збіраліся на дзесяцігадовы юбілей выпускнікоў іхняга года, святкавалі і дваццацігадовы. Не хапала адвагі, смеласці, урэшце – рашучасці зрабіць тое, што належала было зрабіць паводле сумлення.

Але вось ужо як прайшло дваццаць пяць гадоў, і калі неяк яму праз знаёмых паведамілі, што настаўнік жывы і здаровы, нядаўна выйшаў на пенсію, але ўсё яшчэ працуе ў школе, Павел Андрэевіч сабраўся з духам і наведаў родныя мясціны.

Вёска змянілася, людзі парабіліся іншымі. Каб не блізкая чыгунка, ад вёскі засталіся б адныя хаты з пазабіванымі вокнамі. А так людзі працавалі на прадпрыемствах бліжэйшых гарадоў, шукалі работу па замежжы.

Ад бацькоў пайшоў Павел да школы, каб зрабіць тое, што надумаў. І яго там раптам сустрэў незнаёмы чалавек, на выгляд гадоў пад пяцьдзесят у туфлях з задранымі, як у Хатабыча, мыскамі – па апошняй модзе. Пераняў, паздароўкаўся, не выпускаючы рукі з поціску, угледзеўся ў твар, і сказаў:

– Паша! Вось хто мне трэба. Я цябе ўсё жыццё шукаю.

Ёкнула сэрца ў Паўла Андрэевіча – сто гадоў яго Пашам ніхто не называў.

Дастаў той чалавек малазнаёмы з нагруднай кішэні моднага касцюмчыка папяровы скрутачак і перадаў яго ў рукі Паўлу Андрэевічу. Развітаўся і пайшоў прэч. Больш слова не сказаў.

Павел пастаяў, паглядзеў услед таму чалавеку і разгарнуў скрутачак. У скрутачку быў невялічкі пазалочаны гадзіннік. Але які гадзіннік! Гэта была «Зара», ягоны наручны гадзіннічак, які купіў яшчэ школьнікам за першыя заробленыя грошы, і недзе ці згубіў, ці пакінуў адразу, як набыў. І месяца не панасіў. І вось ягоная «Зара» вярнулася. Праз чвэрць веку! Цэленькая. Тая самая, нават моцна не падрапаная.

Толькі раменьчык іншы, не ягоны. А, можа, і ягоны, ён ужо не памятаў.

Павел хацеў дагнаць чалавека і распытаць, хто ж ён, але адразу ж і ўспомніў сына школьнай тэхнічкі Міку. Той быў старэйшы на гады чатыры, адразу, як скончыў школу, з’ехаў некуды вучыцца ці працаваць, недзе там і застаўся і больш яго Павел ніколі не бачыў.

Адкуль у Мікі гадзіннік? Знайшоў тады, у дзяцінстве, і не захацеў аддаць? Ці не ведаў чый? Не, так не бывае. Відаць, знайшоў, а потым палічыў, што яму гадзіннік больш патрэбны. І вось, сумленне замучыла? Дваццаць пяць гадоў мучыла, і дамучыла. Добра, што не пад канец жыцця.

А навошта ён, Павел, купляў сабе тады гадзіннік? Купіў бы фотаапарат, «Змену» якую. Колькі было б школьных бясцэнных здымкаў!

«Цьху ты! – вылаяўся ў думках Павел. – Што за мода перарабляваць учарашні дзень. Хацець перарабіць мінулае – азначае думаць, каб, да прыкладу, сонца ў дзяцінстве ўсходзіла не на ўсходзе, а гэтак крыху з поўначы. Анагр нубійскі! Паўз якія дыяменты ты праходзіш цяпер! Па якіх сапфірах і рубінах ты топчашся?!»

Павел пераадолеў прыступ самаедства і падышоў да сядзібы школы.

Двухпавярховы цагляны будынак школы падаўся яму нізенькім, брудненькім, шэранькім, хоць фундамент быў насвежа павапнаваны. Яго вапнавалі заўжды на суботнік, пад дзень нараджэння пралетарскага правадыра. Цяпер народзіны таго правадыра не святкуюць, але вось традыцыя праводзіць суботнік засталася.

Быў канец мая, было душна. Павел Андрэевіч зайшоў у школу і ўбачыў пустыя і калідоры, і класы. Відаць, настаўнікі прачытаўшы гадавыя адзнакі, паадпускалі дзяцей.

«Няўжо спазніўся?» – падумаў Павел Андрэевіч. Але не, у канцы калідора з аднаго з класаў чуецца знаёмы, хоць і пастарэлы голас. Ага, Мікалай Лявонавіч расказвае напаследак вучобы «смачную» гісторыю.

Павел пасміхнуўся. «Не быў бы то Савіцкі... Цікава, ці называюць яго сучасныя дзеці Троцкім?..»

Павел вырашыў пачакаць да званка. Вунь і тэхнічка, маладзенькая жанчына, пазірае на гадзіннік. Прайшоў у фае, спыніўся каля сцяны, на якой калісь віселі партрэты рускіх палкаводцаў і рускіх жа знакамітых флотаводцаў. Спамінаецца худы Сувораў, заклапочаны Нахімаў, стомлены, вельмі стары Кутузаў, надзьмуты, як мыш на крупу, Багдан Хмяльніцкі з булавой. Цяпер на сцяне віселі партрэты Касцюшкі, Каліноўскага і Напалеона Орды. Гэтыя партрэты былі павешаны на пачатку 90-х. Да гэтага часу паспелі запыліцца, фарба на іх павыцвіла. Неўзабаве здымуць. Каго пачэпяць?

– ...А той карабель нашы продкі хавалі каля астраўка сярод балота. Карабель быў сплецены з адной лазы і ракіты, уяўляеце? – чуўся голас Мікалая Лявонавіча.

Дзеці перабівалі настаўніка воклічамі. Настаўніку мінула шэсцьдзесят, пенсіянер надакучыў дзецям

аднымі і тымі ж гісторыямі. Вучні старэйшых класаў пераказвалі іх малодшым. І так з пакалення ў пакаленне. Самая цікавая гісторыя, калі паўтараецца ў каторы раз, прыядаецца.

Дзеці ў класе сваволілі, бо чуўся шум, але Мікалай Лявонавіч не адпускаў іх, упарта дамагаўся цішыні, і пачынаў расказваць новы сюжэт. Але што жэўжыкаў з новага пакалення можа зацікавіць? Калі яны на ўсіх марсах пабывалі ў відзіках, усіх «Драпежнікаў» убачылі і ведаюць, як выглядаюць «Чужыя». Што ты ім раскажаш сваё, арыгінальнае?

– Калі вам і гэта не цікава, тады слухайце пра афрыканскае крывавае сафары...

О! Здаецца, усталявалася цішыня.

– Хто не хоча слухаць, можа ісці, – прагучала правакацыйная прапанова настаўніка.

Дзеці не ішлі. Няўжо зацікавіў? Адной толькі фразай: «Крывавае афрыканскае сафары»?

– Слухайце! Адзін новы беларус, дастаткова багаты, каб патрапіць у Афрыку на тамтэйшае паляванне, купіў сабе ліцэнзію на адстрэл, каго б вы думалі?

– Льва, буйвала, насарога! – бязладна выкрыквалі дзеці.

– Не, дзікага афрыканскага слана! Цяпер гэта можна. Плаціш грошы, і, калі ласка, страляй сабе хоць тыгра, хоць насарога.

– У Афрыцы тыграў няма! – выгукнуў нейкі вундэркінд.

– Наш новы беларус вырашыў не ўдарыць, як кажуць, тварам у гразь, перад якімі там рускімі, узяў і раскашэліўся на цэлага слана.

– А сланоў забіваць нельга! – пачуўся голас усё таго ж вундэркінда.

– Няможна, згодзен. Але бывае, у запаведніках, трэба застрэліць пару штук.

Ці кармоў не хапае, ці з іншых прычын. Мо грошай на ўтрыманне запаведніка не хапае. Так што няхай багатыя еўрапейцы плацяць за ліцэнзію і страляюць сабе на здароўе. Карацей, плаціць новы беларус грошы, даюць яму ліцэнзію на адстрэл слана, прызначаюць цэлую талаку егераў, едуць яны ў запаведнік, знаходзяць сярод баабабаў таго слана, падыходзяць... А той беларус і кажа ім: «Вы, егеры, ззаду так блізка не стойце, мне такая хеўра памагальшчыкаў не трэба. Я заплаціў грошы і хачу поўнай ілюзіі дзікага палявання. Тыя спрабуюць патлумачыць, мы нясём, маўляў, адказнасць за ваша, паважаны «белы рускі», жыццё. Не, кажа, метраў на сто,а то і дзвесце ідзіце прэч адсюль. Тыя ні ў якую. Усё можа здарыцца. Старгаваліся на пяцідзесяці метрах. Можа, даляраў ім сунуў. Паказалі тыя егеры плакат з выявай слана, каб ведаў, куды страляць. І пайшоў ён на таго дзікага здаравеннага афрыканскага слана адзін на адзін. Старога, аграмаднага, з вось такеннымі біўнямі...

Павел уявіў, як Мікалай Лявонавіч развёў рукамі.

– ...І пайшоў новы беларус на таго дзікага слана з дзесяццю патронамі буйнага калібру ў вінтовачным магазіне. Слон адчуў небяспеку, падняў вушы, загудзеў і кінуўся на чалавека. Каб проста прагнаць, як гэта бывала раней. Паляўнічы вычакаў, калі звер наблізіцца на семдзесят метраў і стаў стрэл за стрэлам пасылаць кулі зверу ў чэрап. Тры разы стрэліў, яшчэ тры, а слон вушы вышэй, хобат задзёр і прэ з усіх сіл на крыўдзіцеля. Наш паляўнічы стрэльнуў яшчэ два разы – слон не падае, імчыць з усіх ног на яго. Блізка ўжо – метраў пад трыццаць. Азірнуўся стралок на егераў, а тыя крычаць, паказваюць, кідай стрэльбу і ўцякай – цяпер мы будзем страляць, бо яны ўжо бачылі, што справа дрэнь і беглі на дапамогу. Але паляўнічы, замест таго, каб уцякаць, разварочваецца і страляе да апошняга патрона. Кулі не бралі звера. Тады толькі паляўнічы кідае стрэльбу і бяжыць. Дзе ж ты ўцячэш!

Налятае звер на няшчаснага паляўнічага, валіць з ног, абвівае хобатам, але не, не топча нагамі і не праколвае біўнямі – ён кладзе чалавека на тыя біўні, разварочваецца і цяжкай хадою ідзе ў лес, у афрыканскія джунглі, у самыя глыбокія, запаветныя нетры. Егеры мітусяцца вакол, ды баяцца страляць, бо бачаць, што чалавек пакуль жывы. Станеш страляць, звер звар’яцее і знішчыць самага дурнога белага з ўсіх еўрапейцаў. А тут і ноч наскочыла, львы рыкаюць, гіены рагочуць, габонскія гадзюкі вакол сігаюць... Словам, слон знік у беспрасветнай афрыканскай ночы...

Настаўнік замоўк. Цішыня была мёртвай. Мікалай Лявонавіч трымаў паўзу.

Нарэшце нейкая дзяўчынка спытала дрогкім голасам:

– А што далей?

– Дарагія мае, працяг гісторыі вы даведаецеся праз тры месяцы канікул, у новым навучальным годзе. Ведайце – фінал афрыканскіх прыгодаў шчаслівы. А цяпер мы з вамі развітваемся да верасня. Усяго вам добрага.

Загрымелі крэслы, праз хвіліну з класа выйшлі чатыры вучні – адзін вушасты хлопчык і тры дзяўчынкі. Гэта быў увесь клас, бо следам зашоргалі ціхія крокі настаўніка.

«Чатыры вучні? – здзівіўся Павел. – Усяго? Увесь клас? Не! Я не змагу сустрэцца з настаўнікам... – падумаў ён. – У мяне не хопіць ніякіх душэўных сіл».

Ён развярнуўся, хуценька выйшаў з фае ў калідор, наляцеў і ледзь не збіў з ног тэхнічку-маладуху, выскачыў з будынка школы і пайшоў прэч.